№ 19 (473) 26 траўня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Беларус вылучаны на Нобэлеўскую прэмію



У сьпісе намінантаў на Нобэлеўскую прэмію міру — праваабаронца Алесь Бяляцкі. **Старонка 10.**

## У НУМАРЫ

**Тэлевізары і іншыя халадзільнікі**

Зварот Лукашэнкі да парлямэнту быў нязвыкла кароткі й сухі. А.Лукашэнка паабяцаў эканамічную лібэралізацыю пры захаваньні аўтарытарнага кіраваньня. Аналіз — **старонка 3.**

**Правал «Коду да Вінчы»**

Паказ блюзьнерскага фільму спынены. Айцец Завальнюк: я не дарма трымаў чысты пост. Пётра Рудкоўскі: Салідарны з паставай айца Завальнюка. **Старонка 4.** Віталь Тарас: але ня маем права на цэнзуру. **Старонка 6.**

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 11.**



## у нумары


### рэакцыі

Ксёндз Завальнюк не дарма трымаў пост ....... 4

Пікет супраць «Коду да Вінчы» ................. 4

Пётра Рудкоўскі. Хрыстос і Марыя Магдаліна ............. 4

Віталь Тарас. Зламаны код ......................... 6

### люстра дзён

Тэлевізары і іншыя халадзільнікі ......................... 8

Лукашэнка: ніякіх практыкаваньняў у дэмакратыі ......................... 9

Пракуратура вынесла Мілінкевічу першае папярэджаньне ..................... 9

Забарона замежнікаў на раскопках ......................... 9

Наведнікі tut.by пра Беларусь і Расею ................ 9

Беларус вылучаны на Нобэлеўскую прэмію...... 10

Першая ахвяра птушынага грыпу ............... 10

Берасьце бароніць «Нашу Ніву» ...................... 13

### камэнтары і меркаваньні

Васіль Аўраменка. Герантакратычнае грамадзтва ........................... 14

Руслан Равяка. Перш крычаў, а потым змаўчаў 15

Аляксандар Класкоўскі. Заснулыя ў Армагедоне . 24

### хроніка

Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Быцьцё 26:21..... 16

Хроніка ................................ 16

### культура

Бяззубыя бабры................ 19

Смолава заняла на «Эўрабачаньні» перадапошняе месца ....... 19

Апостраф паставілі Дранькy–Майсюку ........... 20

Раскопкі на сьметніку не далі плёну ...................... 20

Каляндар .............................. 21

### левым вокам

Лёлік Ушкін. Crack'нуць код да Вінчы ...................... 25

### літаратурны сшытак «НН»

Націск на зычныя. Вальжына Морт і Зьміцер Вішнёў у Бэрліне .............. 27

Што цікавага ў тоўстых часопісах?........................... 29

Франц Сіўко. І наша сьвядомасьць цынічна маўчала ................................ 30

Павал Касьцюкевіч. ССК–1 ................................. 33

Даніла Жукоўскі. Як дарасьці нам да паўстаньня ........................... 34

Аляксандар Фядута. Два пракорі ў сваёй Айчыне ................................ 36

Вершы Готгальда Эфраіма Лесінга ............... 38

Успамін пра адну сустрэчу з Рыгорам Барадуліным .. 40

### газэтка дзеткам

Плястыляндыя .................. 44

### in memoriam

Уладзімер Плешчанка..... 22


## Кіроўцу, што развозіў вызваленых з Акрэсьціна й Жодзіна, траба дапамога

Віктар Савіцкі, кіроўца, што на ўласным транспарце развозіў людзей, якіх выпускалі з Акрэсьціна й Жодзіна ў сакавіку–красавіку, 28 красавіка трапіў у цяжкую аварыю. Ён дагэтуль знаходзіцца ў рэанімацыі. Дактары прагназуюць доўгі пэрыяд лекаваньня і рэабілітацыі. Курс рэабілітацыі дарагі, да таго ж, у чалавека сям'я, малыя дзеці. Зьвяртаемся з просьбай да ўсіх, каму ён дапамагаў, да ўсіх людзей добрай волі з просьбай пра ахвяраваньні.

Р/р 3819382101009, 275 аддзяленьне, філіял 500 АСБ «Беларусбанк», код 601 УНН 100603596. Раковіч Вользе Ўладзімераўне. З пазнакай «ахвяраваньне».

**Просім усіх, хто мае магчымасьць, передрукаваць гэтае паведамленьне.**

### АД РЭДАКЦЫІ

# Код грамадзтва

Скандал вакол пасрэднай карціны «Код да Вінчы», што была на пяты дзень паказу зьнятая з пракату, паставіў рубам два фундамэнтальныя пытаньні: «На што здольныя сродкі масавай камунікацыі?» і «Які статус хрысьціянства ў грамадзтве?»

### Забава ці маніпуляцыя?

У спрэчцы сутыкнуліся два несумяшчальныя погляды на кіно (дый увогуле на мастацтва). Першы лічыць кіно забавай, фікцыяй, умоўнай гульнёй са знакамі. Адпаведна, глядач такога кіно — вольны чалавек, які цешыцца з жанравых прыёмчыкаў і цытатаў.

Згодна з другім падыходам, фільм ёсьць самой рэчаіснасьцю, што выхоўвае гледача й маніпулюе ім. Глядач падуладны экранным вобразам, якія пераносіць у сваё жыцьцё.

Абаронцы «Коду» падкрэсьлівалі забаўляльнасьць кіно — і сваю свабодную волю. Вернікі-пікетоўцы казалі пра скрыўленьне праўды і маніпуляцыю недасьведчаным чалавекам.

Кіно — гэта забава вольных ці замбаваньне залежных? Праблема вырашэньня ня мае.

Супярэчнасьць закладзеная ў кожным чалавеку. Левая паўсфэра нашага мозгу бачыць кіно як забаву, правая — як саму рэчаіснасьць.

Адзін і той жа чалавек можа сказаць: «О, крута, які прыёмчык!» А можа і заявіць: «Ганна Карэніна — гэта я!» — і кінуцца пад цягнік, сьцьвярджаючы гэтым праўду кінакарціны.

Асобныя групы больш схільныя цягнуць у жыцьцё ўбачанае на экране: дзеці, старыя (пакінутыя жыць у таварыстве герояў мыльных опэраў).

Ніхто не жадае прызнацца ў сваёй залежнасьці — кожны лічыць сябе разумным. Мы ўсе кпім з «тупой рэклямы», але, высьвятляецца, яна дзейсная. Рэкляма разглядае чалавека як аб'ект «гандлёвай» маніпуляцыі — у поўнай адпаведнасьці з другім падыходам.

Пасьля выхаду ў сьвет кнігі Дэна Браўна 25 адсоткаў французаў згадзіліся з «гіпотэзай» аўтара, што Хрыстос і Марыя Магдаліна былі мужам і жонкай. Так што ня кожная фікцыя ўсьведамляецца фікцыяй.

Сучаснасьць глядзіць на мастацтва як на аўтаномную сфэру, а гледача, чытача

лічыць асобай свабоднай. Абмежаваньні мусяць адсекчы ад прагляду групы, якімі кіно здольнае маніпуляваць (так дзеці адсякаюцца ад гвалту й эротыкі).

«Коду» быў нададзены найстражэйшы статус «з 18 гадоў», былі ўведзеныя абмежаваньні на пракат.

Зьняцьце карціны з экранаў зьвязанае не з мастацтвам, але з грамадзтвам — і палітыкай.

### Хрысьціянства на выпаленай зямлі

Чаму ў каталіцкай Польшчы не адбылося анічога падобнага? Чаму не было забаронаў у Гішпаніі ці Італіі? (Але яны былі ў Сырыі і Эгіпце.)

Ніводная канфэсія ў Беларусі не адчувае сваёй трываласьці. XX стагодзьдзе ўвогуле было антырэлігійным, а 70 гадоў атэізму стварылі тут сапраўдную духоўную пустыню.

Трэба сказаць праўду. Нягледзячы на статыстыку, хрысьціяне ў нашай краіне зьяўляюцца меншасьцю. Колькі чалавек ходзіць у царкву ці касьцёл? Колькі спрабуе жыць па запаветах Бога? Колькі хаця б ведае пра іх?

У галовах людзей пануе каша з гараскопаў, тэлевізійных стодаў і бабак-знахарак.

І вось у такіх умовах зьяўляецца фільм, дзе жэняць Хрыста й зьневажаюць царкву. Што мусіць адчуваць шчыры вернік? Апраўдвацца, што блюзьнерствы — толькі мастацкая фікцыя? Што фільм папсовы й кепскі? Але становішча хрысьціянскай супольнасьці хісткае, скура садраная, нэрвы агаленыя…

Дарэчы, пратэсты супраць карыкатураў на прарока Мухамэда адбыліся не таму, што іслам нейкі адмыслова гвалтоўны.

Ёсьць сацыяльны чыньнік. Дыялёг заблякаваны. Ніхто нікога ня чуе. Дэмакратычныя мэханізмы ўзгадненьня пазыцый адсутнічаюць (тут вам і Беларусь, і Эгіпет).

Я не кажу ўжо пра паноўныя сродкі масавай інфармацыі, дзе шал нянавісьці пераплюне любыя блюзьнерствы «Коду».

У такіх умовах застаецца толькі жэст, а шэпт у замкнёнай прасторы становіцца крыкам.

Хрысьціянства спрабуе дакрычацца да грамадзянаў. «Мы перамаглі», — кажа ксёндз-пробашч Уладыслаў Завальнюк, калі карціну зьнялі з экранаў.

Але да перамогі супакою, павагі і любові яшчэ вельмі далёка.

**Андрэй Расінскі**



**Яшчэ адзін славянскі этнас вырастае ў нацыю. У нядзелю 55,5% чарнагорцаў прагаласавалі на рэфэрэндуме за незалежнасьць. Сымбалі Чарнагорыі — чырвоны сьцяг і дзьвюхгаловы арол. Праблема Чарнагорыі — непрымальне незалежнасьці вялікай часткай насельніцтва.**

# Тэлевізары і іншыя халадзільнікі

Зварот Лукашэнкі да парлямэнту быў нязвыкла кароткі й сухі. А.Лукашэнка паабяцаў эканамічную лібэралізацыю пры захаваньні аўтарытарнага кіраваньня.

Традыцыйны зварот Аляксандра Лукашэнкі да парлямэнту быў, проці мінулых гадоў, кароткі. Ён доўжыўся ўсяго 45 хвілінаў — удвая карацей, чым летась. Прамова была таксама нязвыкла вытрыманаю і сухою. Не прагучала ніводнай новай ідэі, а пра старыя гаварылася… як пра старыя.

Кіраўнік Беларусі прамаўляў хрыплавата і раз-пораз адкашліваўся.

### Вывесьці ў лік высокаразьвітых

Найперш А.Лукашэнка ўдакладніў свой перадвыбарны лёзунг: ня толькі дзяржава для народу, а і чалавек — для сваёй айчыны. Чалавек абавязаны працаваць аддана. Пасьля чаго А.Лукашэнка літаральна паўтарыў словы А.Мілінкевіча з тэлевыступу, паставіўшы задачу «вывесьці нашу краіну ў лік высокаразьвітых эўрапейскіх дзяржаваў». Ён падкрэсьліў, што ў сакавіку беларусы «галасавалі за незалежнасьць» і пачаў свой зварот не з эканамічнае часткі, як летась, а з пытаньняў разьвіцьця палітычнае сыстэмы і грамадзянскае супольнасьці.

«Разгойдваньне лодкі можа абярнуцца бядой для ўсіх», — папярэдзіў А.Лукашэнка ці то сваіх хаўрусьнікаў, ці то апазыцыю. Прынамсі, апошняе ў кантэксьце нядаўніх расейскіх пагрозаў было б лягічна. Дарэчы, ніякай адкрытай крытыкі апазыцыі на гэты раз не прагучала.

### Партыя ні так, ні не

«Мне настойліва прапануюць стварэньне партыі ці руху», — прызнаўся А.Лукашэнка ў тым, што ягонае атачэньне просіць утварыць больш прадказальную сыстэму кіраваньня і пераемнасьці.

Кампартыя, «на жаль, ужо не існуе» і безь яе цяжка, канстатаваў ён, маючы на ўвазе КПБ-КПСС. Але перадумоваў для стварэньня новай партыі ўлады ён ня бачыць. «Партыя павінна запачаткоўвацца зьнізу, а ня зьверху, — і камэра паказала, як размашыста ківае дэпутат Касьцян. — Адбываецца гэта ў пераломныя моманты. Лічу яе стварэньне немэтазгодным. Але калі нехта палічыць патрэбным ствараць,

**Працяг на старонцы 8.**

# Ксёндз Завальнюк не дарма трымаў чысты пост

З 23 траўня фільм «Код да Вінчы» зьняты з пракату. «Цяпер гэтую абразу Хрыста ня будуць паказваць у Беларусі», — сказаў ксёндз-пробашч Чырвонага касьцёлу Ўладзіслаў Завальнюк. Ён падзякаваў парафіянам, якія трывалі разам зь ім пост супраць карціны «Код да Вінчы».

Аб галадоўцы ксёндз Уладыслаў абвясьціў прыхаджанам 17 траўня пасьля вячаровай імшы. «Калі вашых бацькоў абражаюць і прыдумляюць пра іх невядома што, то вы можаце зьвярнуцца ў суд. А тут абраза самага сьвятога — Хрыста», — тлумачыў ён прычыны свайго пратэсту.

Ксёндз Уладзіслаў быў удзельнікам паседжаньня Дзяржрэгістру, які вырашаў лёс карціны. Адразу пасьля прагляду прадстаўнікі касьцёлу і праваслаўнай царквы выказаліся супраць пракату кінастужкі ў Беларусі.

Пракатчыкі ж спасылаліся на абавязкі перад гледачамі і казалі, што забаронены плод салодкі: «Прынамсі тыдзень фільм будзе ісьці».

— Прынамсі тыдзень я буду трымаць чысты пост, — адказаў на гэта ксёндз-пробашч. Ён параўнаў прэм'еру карціны, пастаўленай па скандальнай кнізе Дэна Браўна, з блюзьнерствамі атэістычных часоў. «Калі нас, хрысьціянаў, ня слухаюць, то, можа, з Чырвонага касьцёлу зноў зрабіць Дом кіно?»

Шчэ 13 й 14 траўня ў касьцёле прайшлі лекцыі прафэсара Міхала Цяўлоўскага пра кнігу «Код да Вінчы». А Ўладыслаў Завальнюк адправіў ліст аўтару кнігі, дзе заклікаў да пакаяньня. У дэтэктыўным трымценьніку Дэн Браўн вінаваціць царкву ў змове схаваць нашчадкаў Хрыста й Марыі Магдаліны і называе сэкс сапраўдным кодам Эўхарыстыі.

Менская кінапрэм'ера «Коду да Вінчы» адбылася разам з сусьветнай — 18-га траўня. Але пасьля таго, як вернікі засьведчылі сур'ёзнасьць намераў, фільм быў зьняты з пракату.

**Андрэй Расінскі**

# Пікет супраць «Коду да Вінчы»

**20 траўня каля кінатэатру «Кастрычнік» адбыўся пікет вернікаў—каталікоў супраць паказу фільму Рона Хаўэрда «Код да Вінчы», зьнятага паводле аднайменнага раману Дэна Браўна.**

**Удзел у пікеце (на фота побач) узялі каля 10 чалавек. Удзельнікі тлумачылі, што мэта іхнага пікету не забарона фільму, а пратэст супраць абразы Богу, нанесенай гэтым творам. Міліцыянт, які падышоў да пікету, паставіўся да патрабаваньняў вернікаў з разуменьнем і разганяць ня стаў. Адміністратарка кінатэатру Алена Ліхачова, у сваю чаргу, заявіла, што такія дзеяньні толькі прыцягнуць дадатковую ўвагу да фільму. Вернікі меліся ладзіць пікеты перад пачаткам кожнага сэансу «Коду да Вінчы».**



# Хрыстос і Марыя Магдаліна

Салідарны з паставай айца Завальнюка, які распачаў галадоўку супраць паказу «Коду да Вінчы», і заклікаю байкатаваць паказы такога тыпу. Піша **Пётра Рудкоўскі ОП.**

— Што ты думаеш пра «Код да Вінчы»?

Ён маўчаў. Няёмка было дапытвацца, таму я таксама маўчаў...

Чаму Хрыстос не адказаў на гэтае пытаньне? Чаму не запярэчыў, не сказаў, што гэта — лухта, брахня, пагоня за славай і грашыма.

Мяне аднойчы хтось папікнуў у тым, што я не разумею маўчаньня іншага чалавека. Гэтым разам я вырашыў выправіцца і паспрабаваць зразумець маўчаньне. Яго маўчаньне.

Так, Ён быў *праўдзівым* Богам, але быў таксама *праўдзівым* Чалавекам. Гэта догма хрысьціянскае веры, прынятая на сьвятым Саборы ў Халькедоне ў 451 годзе. Ісьціна, прызнаваная праваслаўнымі, каталікамі і пратэстантамі. Але што яна значыць? Пытаю ў самога сябе: ці можна ўявіць *праўдзівага* чалавека, які быў бы пазбаўлены пачуцьцёва-эратычнай сфэры? Здаецца, не. Хрыстос стаўся *сапраўдным* Чалавекам, а як кажа Ян Багаслоў, стаўшыся *целам*, *мог* адчуваць эратычную жарсьць, *мог* насіць у сабе каханьне да жанчыны, але... Але ўся справа ў тым, што гэты аспэкт Гасподняга жыцьця ахінуты таямніцай. Больш таго, сам Хрыстос маўчыць. І так, відавочна, павінна быць.

Тым ня менш, нораў сучаснага чалавека такі, што ён ня ўмее зносіць таямніцу. Не разумее маўчаньня. Хоча, каб усё было на паверхні, яўным, бачным, наглядным, расшыфраваным. Калі хтосьці маўчыць, трэба «раскусіць яго», калі не раскусваецца, дык трэба нешта прыдумаць, каб стварыць уражаньне, што таямніца расшыфравана. Вось і паўстаюць у выніку бязглуздыя *historical fictions*, тыпу «Коду да Вінчы», аўтары каторых спаганяюць у свае кішэні велізарныя грошы, эксплюатуючы прагу людзей «нарэшце адкрыць таямніцу».

А таямніцу Хрыста не адкрыў ні Браўн са сваім «кодам», ні Мэл Гібсан са сваімі «Жарсьцямі Хрыстовымі». Першы выявіў сябе як прыхільніка «тэорыі змовы», а другі ўразіў сваім наіўна-літаральным трактаваньнем Пісаньня. Можа, варта, каб і адзін, і другі пачулі словы агностыка Вітгенштайна: «Чаго немагчыма сказаць, тое трэба маўчаць».

Усім сваім нутром салідарны з паставай айца Завальнюка, які распачаў галадоўку супраць паказу фільму «Код да Вінчы», падтрымліваю захады Каталіцкай і Праваслаўнай цэркваў супраць прапаганды «Коду да Вінчы» і заклікаю байкатаваць паказы такога тыпу.

Зусім не таму, што гэты фільм абражае мае *рэлігійныя пачуцьці*. А таму, што ён абражае *чалавечыя пачуцьці* Хрыста.

Іншы погляд — у артыкуле Віталя Тараса «Зламаны код». **Старонка 8—9.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зламаны код

Калі мы хочам жыць у свабодзе, цэнзуры дапускаць ня можна. І «Код да Вінчы» тут не выключэньне. Піша **Віталь Тарас.**

Прэм’ера фільму «Код да Вінчы», заплянаваная беларускімі кінапракатчыкамі на 18 траўня, сарвалася. Дзяржава зьбіралася абысьціся паўмерамі — увяла забарону на паказ стужкі «дзецям да 18-ці». Але рэзкія пратэсты з боку цэркваў паўзьдзейнічалі на дыстрыб’ютэраў скандальнага галівудзкага фільму, і прэм’еру адклалі. Прычым праваслаўная і каталіцкая цэрквы ў гэтым выпадку прадэманстравалі рэдкую адзінадушнасьць. Крайнюю форму пратэсту выказаў вядомы і вельмі паважаны паствай айцец Уладзіслаў Завальнюк — ён абвясьціў галадоўку.

## Чаго шум?

Зразумела, на тле скандалаў, выкліканых выхадам кнігі амэрыканскага пісьменьніка Дэна Браўна «Код да Вінчы», а потым экранізацыяй гэтага твору, рэакцыя на яго ў Беларусі не выглядае сэнсацыяй.

Адмоўная рэакцыя на раман з боку Ватыкану, а таксама некалькіх брытанскіх гісторыкаў, якія ўгледзелі ў рамане вядомага бэлетрыста плягіят і падалі на аўтара ў суд, толькі дадала папулярнасьці Браўну. Ён ня толькі выйграў суд. Прыкладна за год выданьні й перавыданьні «Коду да Вінчы», дзякуючы скандалам, прынесьлі раманісту прыкладна 75 мільёнаў даляраў даходу. Здавалася б, царква, навучаная тысячагодзьдзямі змаганьня з дысыдэнцтвам і гарэзіямі, павінна была б улічыць сумны досьвед папярэднікаў. Ён палягае на тым, што забарона твору (некалі ж складаўся афіцыйны сьпіс забароненых тэкстаў) ці нават толькі яго крытыка памнажае колькасьць чытачоў.

Сытуацыя склалася тым больш недарэчная, што фільм (у адрозьненьне ад кнігі, якая сама па сабе можа выклікаць спрэчкі), паводле першых водгукаў, выглядае поўным правалам. Прынамсі, яго прэм’ера па-за конкурсам на кінафэстывалі ў Канах, нягледзячы на ўдзел у блокбастэры сапраўдных зорак, пакінула гледачоў, мякка кажучы, у зьдзіўленьні: а чаго, уласна кажучы, шум?

У Канах, напэўна, публіка занадта элітарная і патрабавальная. Але, думаецца, прыхільнікі Дэна Браўна ва ўсім сьвеце, у тым ліку і Беларусі, таксама застануцца расчараваныя. Па-першае, экранізацыі, як правіла, саступаюць паводле ўзроўню мастацкага майстэрства арыгіналу. У раманаў Браўна, якія, безумоўна, не належаць да разраду вялікай літаратуры, ёсьць, тым ня менш, свой шарм. Ён умее заінтрыгаваць чытача, калі хочаце — містыфікаваць яго, трымаць у напружаньні ад пачатку да фіналу, дзякуючы пакручастаму сюжэту, які разгортваецца паралельна адразу ў некалькіх плоскасьцях. Акрамя таго, аўтар пасьпявае мімаходзь паведаміць бездань рознага роду цікавай інфармацыі з гісторыі рэлігіяў і цэркваў (якая, праўда, таксама часам абарочваецца містыфікацыяй). Іншымі словамі, раманы Браўна цікава чытаць, так бы мовіць, даўгімі зімнімі вечарамі. Калі ж раманную тканіну перанесьці на вялікі экран і ўтрамбаваць шматлікія сюжэтныя лініі ў дзьве-тры гадзіны экраннага дзеяньня, вынік наўрад ці можа выйсьці станоўчым.

## Права не глядзець

Але справа, вядома, ня ў гэтым. Цяжка паверыць, што царква раптам устурбавалася мастацкім зьместам бэстсэлеру ці ягонай экранізацыі. Сьвятары галоўных хрысьціянскіх канфэсіяў, абсалютна відавочна, заклапочаныя фактам папулярнасьці раману, у якім вядзецца гаворка аб рэчах, аб якіх гаворыцца ў Бібліі, аб нейкіх вялікіх таямніцах, тлумачыць якія заўсёды пакідала за сабой права толькі царква.

Ня варта ўмешвацца ў справы царкоўныя, а тым больш — закранаць хоць нейкім чынам пачуцьці вернікаў. Ніхто ў Беларусі ці іншых сьвецкіх краінах, дзякаваць Богу, не забараняе ім выказваць сваіх пачуцьцяў, у тым ліку абурэньня (хоць гэта й выглядае ня надта па-хрысьціянску). Але ж і царква,



«Паўзабарона» на фільм «Код да Вінчы» міжволі нагадала пра нядаўнія падзеі вакол карыкатураў на прарока Мухамэда.

аддзеленая ад дзяржавы, не павінна дыктаваць сьвецкім людзям, што ім пісаць, чытаць, выдаваць і экранізаваць. У сьвятароў і простых вернікаў, як і ва ўсіх астатніх людзей, ёсьць сапраўды сьвятое права — не чытаць і не глядзець таго, што ім не падабаецца. Не адпавядае іхным густам альбо маралі.

Калі нейкі твор пагражае грамадзкай маралі альбо канкрэтна некага абражае — існуе суд, куды кожны павінен мець права зьвярнуцца.

Гісторыкі, якія палічылі, што раманіст іх абакраў, пазычыўшы зь іх кніг некаторыя ня факты нават, але гіпотэзы, прайгралі ў судзе. Прайгралі проста таму, што забыліся пра асноўны закон мастацтва. Мастак, нават калі ён абапіраецца на факты, ня ёсьць навукоўцам альбо сьледчым. Ён мае права на выдумку. Ён стварае нейкую сваю, паралельную рэальнасьць. Нават у тым выпадку, калі гэты дар тварыць дараваны яму звыш. А інакш проста не існавала б літаратуры.

Шмат што ў рамане «Код да Вінчы» здаецца ня проста выдумкай, але выдумкай дурною — як, напрыклад, ідэя аб тым, што Хрыстос быў жанаты з Марыяй Магдалінай і што Леанарда выпісаў яе на сваёй карціне «Тайная вячэра» ў аблічны апостала Яна. Але ж аўтар і не прэтэндуе на ісьціну. Ён сьвядома спэкулюе на цікаўнасьці чытача да ўсяго таямнічага, неадназначнага, містычнага. А што, царква ўжо мае адказы на ўсе пытаньні, у тым ліку зьвязаныя з уласнай гісторыяй ці з гісторыяй чалавецтва?

## Трывіяльныя ісьціны

Чаму даводзіцца нагадваць пра ўсе гэтыя быццам бы трывіяльныя ісьціны? А таму што апошняя «паўзабарона» на фільм «Код да Вінчы» міжволі нагадала пра нядаўнія падзеі вакол карыкатураў на прарока Мухамэда.

У акцыях пратэсту супраць дацкіх карыкатур па ўсім сьвеце ўдзельнічалі мільёны мусульманаў. Былі зьнішчаныя некалькі пасольстваў эўрапейскіх краінаў. Некалькі дзясяткаў чалавек загінулі. У Беларусі ўсяго толькі зачынілі газэту «Згода». Рашэньне ўладаў пры гэтым было прадыктаванае зусім не рэлігійнымі, а чыста палітычнымі матывамі. Газэту, нагадаем, выдавала сацыял-дэмакратычная партыя, ад якой на прэзыдэнцкіх выбарах выстаўляўся кандыдат Аляксандар Казулін. Але ў гэтага рашэньня знайшліся абаронцы і ў дэмакратычным лягеры. Напрыклад, журналіст Аляксандар Фядута на сайце «Наша думка» пісаў, што абраза пачуцьцяў вернікаў ня можа мець апраўданьня і ўчынак апазыцыйнай газэты заслугоўвае адназначнага асуджэньня.

Трэба аддаць належнае Фядуту: ён і ўсе тыя, хто разважае падобным чынам, у адрозьненьне ад ісламскіх фундамэнталістаў, не патрабуюць пакараць сьмерцю аўтараў малюнкаў ці рэдактараў газэтаў, якія іх надрукавалі. І нават не патрабуюць для іх турэмнага зьняволеньня. Царкоўныя крытыкі фільму «Код да Вінчы» таксама не патрабуюць караў для яго стваральнікаў. Яны патрабуюць цэнзуры. Толькі і ўсяго. А значыць — абмежаваньня правоў усіх тых, чые погляды не супадаюць з поглядамі цэнзараў.

Царква ёсьць часткай — прычым, падмуркавай часткай — хрысьціянскай цывілізацыі. Таксама падмуркавай і неад'емнай часткай гэтай цывілізацыі ёсьць эўрапейскае права, выпрацаванае стагодзьдзямі, заснаванае на самакаштоўнасьці і сувэрэннасьці чалавечай асобы. Правы чалавека, у тым ліку свабода слова, даўно зрабіліся свайго роду генэтычным кодам цывілізацыі.

## Цэнзура як сымбаль

Герархі Расейскай праваслаўнай царквы нядаўна абвясьцілі правы чалавека іншародным целам для расейскай праваслаўнай культуры, спараджэньнем гардыні Захаду. Што ж, гэта таксама іхнае права — так думаць.

Аднак, калі гаворка ідзе аб неабходнасьці дэмакратызацыі Беларусі і калі гаворка гэтая вядзецца сапраўды сур'ёзна, а не таму, што камусьці чымсьці не падабаецца асоба дыктатара, трэба даводзіць думкі да лягічнага завяршэньня. Альбо мы падзяляем падмурковыя каштоўнасьці заходняй цывілізацыі, улучна са свабодай сумленьня, свабодай слова, свабодай асобы, альбо мы шукаем, усьлед за Расеяй, нейкага «свайго», асаблівага шляху цывілізацыі, заснаванага на зусім іншых каштоўнасьцях, да якіх свабода ў прынцыпе ня мае дачыненьня.

Фільм «Код да Вінчы» — усяго толькі шараговая падзелка заходняй кінаіндустрыі. Ягоныя стваральнікі могуць толькі падзякаваць Ватыкану за раскрутку.

З раманам Дэна Браўна лепей пазнаёміцца ў арыгінале – тым больш што прачытаць раман у Інтэрнэце не складае цяпер ніякай праблемы. Але хто ведае, ці можна гэта будзе зрабіць пасьля тых зьменаў, якія зьбіраецца ўвесьці беларускі ўрад у Закон аб друку? Пасьля таго, як амаль усе незалежныя выданьні ў Беларусі былі пазбаўленыя магчымасьці друкавацца і распаўсюджвацца, цэнзура пагражае цяпер беларускаму Інтэрнэту. Цэнзура заўсёды была і ёсьць элемэнтам несвабоды. Нават калі цэнзары апраўдваюць свае дзеяньні клопатам пра мараль.

Беларуская палічка
што чытаць?
www.knihi.com
дзе знайсьці?
БЕЛАРУСКАЯ ЭЛЕКТРОННАЯ БІБЛІЯТЭКА

# Тэлевізары і іншыя халадзільнікі



Працяг са старонкі 3.

мы падтрымаем», — двухсэнсоўна скончыў А.Лукашэнка. Сам ягоны тон паказваў, што ініцыятывы зьнізу ён ухваляе.

Тут камэра спынілася на Віктару Аляксандравічу Лукашэнку ў крэмавым гарнітуры. У дзень прамовы ў сталіцы было нязвыкла душна, сыноптыкі абяцалі аж 27 градусаў.

## Кітайская пагроза

Прыйшла чарга гаспадаркі. А.Лукашэнка абгаварыў «пытаньні якасьці» прадукцыі, безь якога ня можа быць прагрэсу. Ён пахваліў сваё кіраваньне, пры якім краіна разьвівалася хутчэй, чым СНД і ЭС. А будучыня, сказаў ён, — за інавацыямі.

Папулісцкая рыторыка захавалася. «Мы павінны сплаціць народу доўг» — казаў ён трохі стомлена, і выразныя мяшкі пад вачыма зьвярталі на сябе ўвагу аўдыторыі. У парадку сплачваньня доўгу А.Лукашэнка многа і нават шмат расказаў пра эканамічную лібэралізацыю, нібы на двары зноў 2002 год. Падатковую сыстэму спрасьціць! — казаў ён. Для прадпрымальніцкіх структураў стварыць больш спрыльныя ўмовы! Свабоду прадпрыемствам! — проста так і казаў ён. «Гэтую балбатню трэба скончыць з тэлевізарамі і іншымі халадзільнікамі, — строга загадаў ён. — «Віцязі» й «Гарызонты», з новага году да мяне па субсыдыі болей не прыходзьце!»

Беларуская прадукцыя больш якасная, чым кітайская, запэўніваў ён, таму ня трэба валіць на кітайскую канкурэнцыю.

Як вынікала, сродкі для вяртаньня доўгу будуць акумуляваныя шляхам зьмяншэньня датацый прадпрыемствам-гігантам і пераходу на больш адрасныя субвэнцыі.

Карацей, палітычны аўтарытарызм зьбіраецца насаджаць эканамічны лібэралізм, якога так баяцца тыя, каму трэба «сплачваць доўг». Каб жа з гэтага чаго ня выйшла.

## Складаная сытуацыя ў сьвеце

Палітычны і эканамічны блёкі былі руцінныя, але замежнапалітычны па нуднасьці быў проста нечуваны. За апошнія 12 гадоў беларусы ад такога адвыклі і таму адчулі лёгкую занепакоенасьць.

«Сытуацыя ў сьвеце складаная, — пачулі мы знаёмае зь дзяцінства. — Зьявіліся новыя цэнтры сілы, на ногі ўстае Расея. Сьвет абвастрае свае супярэчнасьці». Па меры разьвіцьця імпэрыялізму, дадаў бы Суслаў. «Калі будзе працягвацца рост цэнаў на сыравіну, можа абваліцца сусьветная эканоміка і фінансавая сыстэма», — засьцярог дэпутатаў ад трыманьня грошай на замежных рахунках беларускі лідэр.

«Ціск Захаду і пагаршэньне эканамічнай каньюнктуры» — так схарактарызаваў А.Лукашэнка ўмовы, у якіх працуе беларуская дыпляматыя.

«Інтэграцыя ў сусьветную эканоміку ёсьць сёньня прыярытэтам Беларусі», — сказаў ён. А як жа інтэграцыя зь вялікім братнім народам?

Курс на яднаньне з Расеяй застаецца нязьменным, запэўніў ён. Без аніякіх дэталяў. І ўсё ўсім стала ясна.

Як толькі А.Лукашэнка скончыў сваю прамову, тэлевізары і іншыя халадзільнікі ўмомант спынілі трансьляцыю, не дачакаўшы нават канца апладысмэнтаў. Чаму такая сьпешка? — падумалася.

**Барыс Тумар**



**Калі гаворка зайшла пра партыю ўлады, тэлекамэра спынілася на Віктару Лукашэнку (зьлева).**

# Лукашэнка: ніякіх практыкаваньняў у дэмакратыі!

Кіраўнік Беларусі крытыкуе выбарнасьць кіраўнікоў сельскіх і пасялковых выканкамаў і іншыя «гульні ў дэмакратыю». Гэта таксама ўстаноўка на мясцовыя выбары: ніякіх незалежных дэпутатаў.

Пазыцыя Лукашэнкі застаецца ранейшай — стрыжань вэртыкалі мусіць быць непарушным. Зь ягоных словаў, дзяржаўныя органы ўлады — гэта больш, чым ваенная структура, таму ў ёй усё павінна быць «дакладна і зразумела». У якасьці антыпрыкладу Лукашэнка пры-вёў Расею, дзе «губэрнатар жаліцца, што яму не падначалены мэр абласнога гораду, а мэру не падначальваюцца абраныя главы адміністрацый раёнаў».

Лукашэнка даў устаноўку не дапусьціць у Беларусі такіх «гульняў дэмакратыі» ды палепшыць працу мясцовага самакіраваньня, бо «часьцяком складваецца такая сытуацыя, што наверсе прымаюцца рашэньні, а як яны даходзяць да месцаў, пачынаецца прабуксоўка».

Кіраўнік Беларусі выступіў з крытыкай арганізацыі працы кіраўнікоў сельскіх і пасялковых выканкамаў. У прыватнасьці, патлумачыў ён, райвыканкам ня мае юрыдычнага права ўплываць на рашэньне кадравых пытаньняў на гэтым узроўні. «Мяне зьдзівіла, што ў старшыні выканкаму адсутнічаюць рычагі ўплыву на кіраўнікоў суб'ектаў гаспадараньня, — прызнаўся Лукашэнка, — дык як у такіх умовах можна эфэктыўна рэалізоўваць дзяржаўны курс на месцах?»

**SB**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Пракуратура вынесла Мілінкевічу першае папярэджаньне

Пасьля другога палітыка могуць пасадзіць «за дыскрэдытацыю Беларусі».

Па словах Аляксандра Мілінкевіча, папярэджаньне было дадзенае за сьведчаньні замежнай дзяржаве сьведчаньняў, якія дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь. Падставай для папярэджаньня былі два інтэрвію: вядомай польскай газэце «Rzeczpospolita» і Расейскай службе радыё Бі-Бі-Сі.

У інтэрвію «Rzeczpospolita» палітык выказаўся наконт абставінаў сьмерці віцэ-консула Польшчы ў Горадні Рышарда Бадонь-Лехра. «Я не выключаю, што ўлады маглі спрычыніцца да яго сьмерці. Але не сьцьвярджаю, бо ў мяне няма сьведчаньняў».

У этэры Бі-Бі-Сі Мілінкевіч казаў пра тое, што прэзыдэнцкія выбары прай-шлі незаконна, што Лукашэнка ня меў права ў іх удзельнічаць. На сайце радыёстанцыі матэрыял даступны пад загалоўкам «Мілінкевіч: Лукашэнка зьдзейсьніў пераварот».

Гэта першае папярэджаньне Мілінкевічу. У разе другога палітыку пагражае крымінальная справа.

**Тацяна Сьнітко**

# Кабы чаго ня выйшла

У Інстытуце гісторыі Акадэміі навук уведзеная негалосная забарона на ўдзел замежнікаў у раскопках.

Як мяркуюць археолягі, у раскопачных лягерах хтосьці з чыноўнікаў угледзеў тыя самыя «72 лягеры для падрыхтоўкі баевікоў», пра якія гаварыў Лукашэнка. Каб перастрахавацца, кіраўніцтва Інстытуту забараніла запрашаць замежнікаў на раскопкі. Забарона не фармальная, ніякім афіцыйным чынам не аформленая. Інфармацыю пра гэта мы атрымалі ад аднаго з археолягаў. Кіраўніцтва інстытуту такі факт не пацьвярджае.

**АШ**

# Наведнікі tut.by: Беларусь і Расея аб'яднаюцца на сьвятога ніколі

Найбуйнейшы беларускі інтэрнэт-партал tut.by апытаў сваіх наведнікаў: як яны лічаць, калі Беларусь і Расея аб'яднаюцца? Па стане на вечар 19 траўня 89% удзельнікаў апытаньня (каля пяці з палавай тысячы чалавек) адказалі «На сьвятога ніколі». Варыянты «Сёлета», «Налета», «Праз два-тры гады», «Гадоў праз 5» набралі ад аднаго да пяці адсоткаў.

**АК**

# Беларус вылучаны на Нобэлеўскую прэмію

У сьпісе намінантаў на Нобэлеўскую прэмію міру — праваабаронца Алесь Бяляцкі.

Беларусы доўгі час марылі пра Нобэлеўскую прэмію ў галіне літаратуры, але можа так стацца, што мершым беларускім Нобэлем будзе прэмія міру. Прынамсі, сёлета беларус апынуўся ў шортлісьце кандыдатаў. Гэта праваабаронца Алесь Бяляцкі.

Сьпіс патэнцыйных кандыдатаў штогод публікуецца Міжнародным інстытутам дасьледаваньняў міру (МІДМ), што месьціцца ў сталіцы Нарвэгіі Осла.

МІДМ падкрэсьлівае непацьверджанасьць сваіх зьвестак, але, як удалося даведацца «Нашай Ніве» з крыніцаў у парлямэнце Нарвэгіі, кандыдатуру Алеся Бяляцкага сапраўды прапанавала група дэпутатаў ад розных партыяў.

МІДМ працуе ў тым самым горадзе, што й Нобэлеўскі камітэт, але фармальна яны ніяк не зьвязаныя. Дырэктар МІДМ штогод на просьбу журналістаў публікуе свае нобэлеўскія прыкідкі.

У вылучэньні А.Бяляцкага няма нічога дзіўнага. Нарвэгія зь цікавасьцю й сымпатыяй прыглядаецца да Беларусі. У красавіку прэм'ер-міністар гэтай краіны прыняў лідэра беларускага дэмакратычнага руху Аляксандра Мілінкевіча.

Сам Алесь Бяляцкі сёлета атрымаў у Нарвэгіі праваабарончую прэмію імя Сахарава, а ў Чэхіі з рук Вацлава Гаўла — прэстыжную прэмію «Homo homini» («Чалавек чалавеку»). «Гэта было нечакана для мяне, прычым, вось супадзеньне, пра абедзьве прэміі мне паведамілі ў той самы дзень, хоць рашэньні прымаліся абсалютна незалежна», — кажа А.Бяляцкі.

У Беларусі А. Бяляцкі атрымаў толькі адну прэмію, і тую аж у 1990 годзе. То была прэмія часопісу «Маладосць» за цыкл літаратуразнаўчых публікацый.

Алесь Бяляцкі стварыў адну з самых значных праваабарончых арганізацый Беларусі — праваабарончы цэнтар «Вясна». Ён узначальваў «Вясну», пакуль яе не забаранілі з пазову Міністэрства юстыцыі. Праца ў «Вясьне» зрабіла яго цэнтральнай фігурай супольнасьці няўрадавых арганізацый і апазыцыйнага руху. Два дзясяткі разоў яго судзілі. Пры наданьні А.Бяляцкаму прэміі Сахарава Нарвэскі Хельсынскі Камітэт спэцыяльна падкрэсьліў адсутнасьць у яго палітычных амбіцыяў. Сапраўды, нават па месцы свайго нараджэньня (Карэлія, куды саветы вывезьлі ягоных бацькоў на працы) А.Бяляцкі паводле беларускага заканадаўства ня можа прэтэндаваць на прэзыдэнцкую пасаду.

Але меркаваньне МІДМ і намінацыя — усяго толькі меркаваньне і намінацыя. Шанцы А.Бяляцкага нарвэскія экспэрты лічаць невялікімі.

Той самы МІДМ называе самым імаверным прэтэндэнтам на сёлетнюю ўзнагароду Марці Ахтысаары. Былы прэм'ер-міністар Фінляндыі, цяпер ён узначальвае «Антыкрызысную ініцыятыву» — недзяржаўную арганізацыю, якая ажыцьцяўляе пасярэдніцтва ў міждзяржаўных канфліктах. Ён можа разьдзяліць прэмію з прэзыдэнтам Інданэзіі Сусіла Бамбангам Юдхаёна. Разам яны прыйшлі да мірнага вырашэньня задаўненага крывавага канфлікту ў інданэзійскай правінцыі Ачэх.

Вялікія шанцы мае і Карла дэль Понтэ, кіраўніца Міжнароднага трыбуналу па былой Югаславіі. Прэстыжныя нарвэскія прэміі ў апошнія гады атрымлівалі Рэбія Кадыр — актывістка уйгурскага нацыянальнага руху, што сядзіць у кітайскай турме, Ліда Юсупава чачэнская адвакатка, што абараняе ахвяраў вайны. Ужо некалькі гадоў трымаюцца ў сьпісе прэтэндэнтаў ірацкі духоўны лідэр аятала Сыстані, міжнародная арганізацыя «Уратаваць дзяцей». Ёсьць на алоўку і такія яркія фігуры, як вэнэсуэльскі прэзыдэнт Уга Чавэс.

Выбар ляўрэата ажыцьцяўляе камітэт у складзе пяці чалавек, якія дэлегуюцца рознымі партыйнымі фракцыямі парлямэнту. Да гэтага пытаньня нарвэжцы ставяцца як да справы нацыянальнага гонару.

Карупцыі ў Нарвэгіі практычна няма, а дабрачыннасьць у гэтай пратэстанцкай краіне (самай багатай па ВУП на душу насельніцтва ў сьвеце) узьведзеная ў ранг нацыянальнай традыцыі. Таму Нобэлеўскі камітэт вінавацяць у горшым выпадку ў палітызаванасьці выбару. Часам яна наўмысная.

Прэмію ў свой час атрымалі Нэльсан Мандэла — лідэр руху барацьбы з апартэідам, Андрэй Сахараў (1975) — самы вядомы з савецкіх дысыдэнтаў, Лех Валэнса (1983) — лідэр польскай «Салідарнасьці», кіраўніца бірманскай апазыцыі Су Джы ці яшчэ кіраўнікі вызваленчага руху Ўсходняга Тымару. Камусьці зь іх гэтае найвышэйшае сусьветнае прызнаньне дапамагло захаваць свабоду, камусьці — нават жыцьцё. Яшчэ дзесьці гэта дапамагло ўнікнуць крыві — галоўная задача прэміі.

Часам Нобэлеўскі камітэт кіруецца больш тонкімі меркаваньнямі. Гэтак, летась прэмія нечакана знайшла Міжнароднае агенцтва па атамнай

### Нобэлеўскія прэміі

**прысуджаюцца Швэдзкай акадэміяй. Усе, акрамя адной — Прэміі міру. Права ганараваць ёю маюць нарвэгі. Рэч у тым, што на час заснаваньня прэміяў мільянэрам Альфрэдам Нобэлем Нарвэгія ўваходзіла ў саюз з Швэцыяй, а калі дабілася незалежнасьці — «саюзную маёмасьць», у тым ліку духоўную, падзялілі па справядлівасьці.**

### Як вылучаюць на Нобэля?

**Права вылучаць на Нобэлеўскую прэмію міру маюць парлямэнтарыі і прафэсары ўнівэрсытэтаў. Заяўкі надыходзяць штогод да 1 лютага. Сябры Нобэлеўскага камітэту маюць права далучаць дадатковыя заяўкі пасьля гэтай даты, але да свайго першага паседжаньня пасьля сканчэньня падачы намінацый. Сьпіс намінантаў не абвяшчаецца. Нобэлеўскі камітэт просіць і тых, хто вылучае, захоўваць таямніцу. Аднак не заўжды так выходзіць. Вядома толькі, што ўсяго на Нобэлеўскую прэмію 2006 году вылучаны 191 прэтэндэнт.**

# Алесь Бяляцкі: Гэта буду ня я




Калі да Алеся Бяляцкага датэлефанаваўся карэспандэнт «НН», Алесь ужо ведаў пра факт намінацыі.

**— Верыце, што беларус атрымае Нобэлеўскую прэмію?**

**АБ:** Веру. Раней ці пазьней. Але гэта буду ня я.

**— А хто?**

**АБ:** Прадстаўнік дакладных навук.

**— Дазвольце выказаць меркаваньне, што ў нас не было апошнія дзесяцігодзьдзі вялікіх дасягненьняў у сфэры дакладных навук. Да чаго ж мы вядзем гаворку пра Прэмію міру.**

**АБ**: У барацьбе за мір і чалавечую годнасьць мы зрабілі ня больш, чым іншыя. На сёньня Беларусь яшчэ малацікавая ў пляне сацыяльна-духоўнага жыцьця. Мы трохі пачалі існаваць у праваабароне, журналістыцы, але ня столькі дзякуючы нашым заслугам, колькі праз «заслугі» рэжыму.

**— Калі ж мы станем цікавыя?**

**АБ:** Калі Беларусь увойдзе ў сфэру духоўных інтарэсаў Эўропы. Калі залежыць ад многіх чыньнікаў. Ахвярнасьці, самаадданасьці нам не бракуе, але Беларусь ня ў фокусе інтарэсаў. Інстытут дасьледаваньняў міру — усяго толькі аналітычная структура. Пачэсна, вядома, што яны назвалі і маё імя… Але ж Нобэлеўская прэмія міру звычайна дастаецца людзям, якія не адзін год правялі ў турме…

**Алесь Бяляцкі**

**Нар. 1962, Карэлія. Бацькі паходзяць з-пад Нароўлі (маці), Рагачова (бацька). У нацыянальным дысыдэнцкім руху ад 1980. Паводле прафэсіі літаратуразнаўца. З 1996 — праваабаронца. Стварыў і ўзначаліў Праваабарончы цэнтар «Вясна», які пазьней быў зачынены Міністэрствам юстыцыі.**

энэргіі і яго дырэктара Махамэда аль-Барадэя. Такі выбар антыядзерныя актывісты моцна крытыкавалі. Аднак яго можна зразумець. Разьвіцьцё, а мо й выжываньне чалавецтва залежыць ад пасьпяховасьці кантролю за распаўсюджваньнем атамнай зброі — далікатнай задачы МАГАТЭ. Каб аль-Барадэй меў больш вагі на міжнароднай арэне, адчуваў сябе больш незалежна і кіраваўся толькі найвышэйшымі інтарэсамі чалавецтва, яго адзначылі Нобэлем. Да таго ж, гэта было сымбалічна для арабскага сьвету (аль-Барадэй — эгіпцянін).

Дагэтуль ніводзін беларус не атрымліваў прэстыжнай узнагароды. Ураджэнцы Беларусі — Ахарон Клуг (хімія), Сайман Сьміт Кузьнец (эканоміка), Жарэс Алфёраў (фізыка), Мэнахем Бэгін і Шымон Пэрэс (мір) — але не грамадзяне краіны.

У свой час Сяргей Дубавец пісаў, што атрыманьне Нобэлеўскай прэміі было б важным для ўмацаваньня нацыянальнага гонару беларусаў. Прэмія праваабаронцу, несумненна, была б таксама штуршком для палітычнай сьвядомасьці беларусаў.

# Першая ахвяра птушынага грыпу

У вёсцы Межава (Аршаншчына) заатэхнік, страляючы з пнэўматычнага пісталета «ІЖ-53М» па дзікіх галубах, параніў рабочага мясцовай гаспадаркі. Сьвінцовая куля адрыкашэціла ад сьцяны і трапіла таму ў вока. На змагара з «птушыным грыпам» заведзеная крымінальная справа.

**Яўген Жарнасек**

# Паляваньне на «вядзьмарак» пачалося?

Вэртыкальная «Аршанская газэта» надрукавала ліст вэтэранаў гораду Барань. Яны даюць ацэнку асобным дэпутатам Баранскага ды Аршанскага гарсаветаў, якія бралі актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі. Зварот (відаць, да начальства) напісаны ў стылістыцы часоў «халоднай вайны». Тут і «сілы сусьветнай рэакцыі», і «імпэрыялістычныя агрэсары» і да т.п. А ўвесь свой праведны гнеў вэтэраны накіравалі на сябра ініцыятыўнай групы А.Мілінкевіча, дэпутатку Аршанскага гарсавету Галіну Мацюшэнку ды сябра ініцыятыўнай групы А.Казуліна дэпутата Бараньскага гарсавету Віктара Міхасёва. Абое зьяўляюцца грамадзкімі актывістамі, якія ўвесь час не даюць спакою мясцовым чыноўнікам. Вэтэранскі ліст пакуль абмяжоўваецца заклікам да асуджэньня названых асобаў за «амаральныя паводзіны». Звольніць з працы іх ня ўдасца, бо Г.Мацюшэнка — індывідуальная прадпрымальніца, у прыватнай фірме працуе і В.Міхасёў.

**ЯЖ**

# 1+3 Беларусь – Швэцыя

**1 (чц) чэрвеня**

а 19–й у менскім касьцёле Сьв.Сымона і Алены — беларуска–швэдзкія паэтычныя чытаньні.

**Удзел бяруць Рыгор Барадулін, Оса Марыя Крафт, Хокан Бравінгер, Аляксандра Крунквіст.**

Арганізатары: Касьцёл Сьв.Сымона і Алены, Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску; Швэдзкі Інстытут (Стакгольм). Прадусары: Марыя Сёдэрберг 632–67–55 info@mariafoto.se
Даніэль Густаўсан, Швэдзкі Інстытут 453–78–00 www.si.se
Па інфармацыю зьвяртацца:
Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску 226–55–40; www.kalegium.org, www.vitryssland.nu

### Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

### На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Ad плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## Шукаем валанцёраў для распаўсюду газэты ў розных раёнах Менску.

# Шчыры дзякуй за ахвяраваньні

Асаблівая падзяка калегам з газэты **«Беларус»** і **Вадзіму П.** зь Менску, Малінаўкі.
**Альфонсу Р., Адзе Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Фёдару К.** з Талачына.
**Антону Т.** з Жодзіна.
**Эдмунду А.** з Шаркаўшчыны.
**А.Н.** зь Менскай вобласьці.
**Тацяне З.** з Магілёўскага раёну.
**Леакадзіі Н., Ігару С.** з Валожынскага раёну.
**Валерыі Х.** зь Дзяржынскага раёну.
**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.
**Сяргею Г.** зь Вялейкі.
**Віталю Ц., Валер’ю С., Андрэю Л.** з Жлобіна.
**Сяргею К.** з Слуцку.
**Марыі Б., Любові П., В.З., Канстанціну К.** з Гомелю.
**Веры Б.** з Стоўпцаў.
**Г.К., Георгію М., Аляксандру С., Мікалаю Т., І.С., Юр’ю Г.** з Горадні.
**Ю.Ю., Аляксандру К., Ігару П.** з Маладэчна.
**В.Г., Віктару М., М.Ж., Аляксею Ч.** з Баранавічаў.
**Сьцяпану А.** з Асіповіцкага раёну.
**Г.Ш.** зь Берасьцейскай вобласьці.
**С.Р.** зь Бярозы.
**П.Г., Зьмітру К.** з Мастоў.
**Н.Т.** з Салігорску.
**Уладзімеру З.** зь Пінску.
**Міхаілу Г., Зьмітру Ш.** зь Берасьця.
**М.К., Алегу Р.** з Наваполацку.
**Любові Ш., Тамары М., Віктару С., Ганьне К.** зь Віцебску.
**Галіне Г., Уладзімеру І.** з Барысава.
**Сержуку Н., Ягору Ш., Максіму С., Аўгену Л., Аляксандру Ф., Альбэрту С., І.І., Міхаілу Ж., Юр’ю М., Але Г., Мікалаю Б., Ю.Г., Паўлу Б., Алене В., В.Г., Д.К., В.П., В.І., В.Х., М.Б., Паўлу Д., Сьвятлане В., Інэсе Б., А.С., М.А., Алене М., В.В., Ігару С., Раісе Б., Станіславу Г., У.Л., Фёдару П., Сяргею К., Р.Н., Андрэю Ш., Раману М., Міколу І., Віктару К., М.К., Ларысе К., Казімеру Г., Л.Ж., Аляксандру Ш., Натальлі Л., Д.Д., Г.Ю., Вадзіму М., Натальлі Г., Надзеі С., Мікіту З., Т.К., П., Уладзімеру В., С.З., А.Ю., В.В.** зь Менску.

# Берасьце бароніць «Нашу Ніву»

«Барані «Нашу Ніву» — з такім заклікам зьвярнуліся 21 траўня ў Берасьці ўдзельнікі флэш-мобу ў падтрымку апошняга цалкам беларускамоўнага незалежнага выданьня. Каля 60 актывістаў руху «За Свабоду», расьцягнуўшыся ў доўгі ланцуг на цэнтральным праспэкце гораду — імя Машэрава, чыталі газэту «Наша Ніва». Частка людзей — тыя, на сьпінах якіх былі прышпіленыя літары з пасланьня «Барані «Нашу Ніву» — разьвярнуліся сьпінамі да праезнай часткі.

Флэш-моб працягнуўся 20 хвілінаў і выклікаў жывое абмеркаваньне людзей на праспэкце. Яны пыталіся пра сытуацыю з газэтай, а таксама пра тое, якім чынам яе можна атрымліваць. Некаторыя прастаялі разам з удзельнікамі да канца флэш-мобу. Многія кіроўцы віталі флэш-мобэраў сыгналамі. Флэш-моб прайшоў надзіва спакойна: падчас яго каля ўдзельнікаў не зьявіўся ніводзін міліцыянт.

**Faith_less**









ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Герантакратычнае грамадзтва

Беднасьць і старасьць — два стаўпы беларускага кансэрватызму. Піша **Васіль Аўраменка.**

Здаецца, даўно мінулі часы, калі старых і нямоглых пакідалі ў глухім лесе на сьмерць, бо грамада ня мела магчымасьці карміць лішнія раты. Тады закон прыроды дзейнічаў «жалезна»: у выбары паміж старасьцю і маладосьцю перавага аддавалася толькі маладым. Так працягвалася жыцьцё, так дзеля будучыні ахвяравалі аджылым. Але калі людзі сталі багацейшыя і зьявілася магчымасьць утрымліваць недзеяздольных, знайшлося абгрунтаваньне і гэтай традыцыі — выкарыстаньне вопыту старэйшых, павага да былых заслуг і, нарэшце, проста гуманізм. У барацьбе старога і новага наступіла пэўная раўнавага, але сам канфлікт пакаленьняў ня зьнік, а прыняў больш цывілізаваныя, «ачалавечаныя» формы.

По меры назапашваньня людзьмі багацьцяў і ўдасканальваньня мэтадаў іх захоўваньня, расла і сіла старых, павялічваўся іх уплыў у сям'і, грамадзтве. У апошнія дзесяцігодзьдзі да гэтага працэсу дадаліся і разнастайныя мэдычныя тэхналёгіі прадаўжэньня жыцьця хворых, і колькасьць людзей сталага веку пачала хутка расьці. Гэты факт мае наступствы як для заходніх грамадзтваў, так і для квазідэмакратычных краінаў накшталт Беларусі.

Праз 10—15 год у нашай краіне можа скласьціся сытуацыя, калі на аднаго маладога працоўнага будзе 2—3 пэнсіянэры.

Калі старыя (непрацоўныя) складуць большасьць насельніцтва, яны змогуць цалкам легітымна і дэмакратычна дыктаваць сваю волю ўсяму грамадзтву, навязваць свае каштоўнасьці і правілы гульні. Узгадваючы Маркса, можна будзе нават гаварыць пра новую форму

**Васіль Аўраменка** — доктар, лідэр суполкі лекараў Магілёўшчыны, сталы аўтар «НН». Жыве ў горадзе над Дняпром.

# Перш крычаў, а потым змаўчаў

Шмат хто з знаёмых паціху адышоў ад палітыкі: маўляў, трэба было ня выбарамі займацца, а ў гуртку сьпеўныя яднацца і мову захоўваць. Піша **Руслан Равяка**.



Гартаў падараваную мне польскую кнігу пра трагедыю тамтэйшых жыдоўскіх гета. Не пакідае думка, што і мы жывём у гэткім адмысловым гета. Невялікім купкамі па ўсёй Беларусі, у гэткіх рэзэрвацыях. Моўных, палітычных, інфармацыйных ці культурных. Недзе тое гета добраахвотнае, недзе пад ціскам-прымусам. Абмяжоўваючы сябе недзе ў сярэдзіне, мы трапляем і жывём увесь час нават у асабістым гета.

Шмат хто з знаёмых паціху адышоў ад палітыкі: кажуць, што будуць займацца культураю і пашырэньнем мовы. Маўляў, беларускасьць пацярпела ад палітызаванасьці. Трэба было ня выбарамі займацца, а ў якія гуртки са сьпеўкамі аб'ядноўвацца ды ліпець паціху, каб не вылучацца. Але пасіўнасьць заўсёды звужае граніцы гэтага гета, і назаўтра ты прачынаесься ў яшчэ меншай вольнай прасторы. Патроху тое гета звужаецца нават па-за межы сям'і й родных. Тады нават дома ўжо пачынаеш гутарыць не па-свойску — каб родным нічога не было. Табе застануцца сны ды падсьвядомасьць, якая паціхуператравіць тваю сутнасьць, нічога не пакінуўшы для душы. Хіба потым, калі раптам трапіцца які тэкст па-наску ці колішні знаёмы, зашчэміць сэрца і душу, а можа… але…

Грамадзкасьці і ўраднікам такі расклад таксама зручны — абы іх не чапалі. А калі зьяўляюцца нейкія праблемы, дык маюцца карныя сродкі. Выдаленьне незалежнай прэсы, уціск яе апошнім часам прыгадвае гісторыю II сусьветнай вайны. Заявы пра непажаданасьць знаходжаньня «НН» у Менску — верх усяго гэтага маразму. За апошнія колькі год ужо на ўездах у многія беларускія гарады можна вывешваць шыльдачкі: «Очищено от независимой прессы», «Носителей белорусского языка нет».

Жывучы ва ўмовах гэткай рэзэрвацыі, трэба пямятаць пра лёс жыдоўскіх ці індзейскіх папярэднікаў —да чаго прыводзіць бязьдзейнасьць. Трэба наступаць, рухацца, каб не загінуць у гісторыі цывілізацыі.

*Баранавічы*

---

эксплюатацыі — калі непрацоўная большасьць будзе эксплюатаваць працоўную меншасьць. Нягледзячы на ўсю фантастычнасьць такога становішча, яго элемэнты можна заўважыць у Беларусі ўжо сёньня.

Па-першае, колькасьць маладых імкліва падае з-за нізкай нараджальнасьці ды эміграцыі. Па-другое, пэнсіянэры выяўляюць вялікую палітычную актыўнасьць. Гэта дае ім магчымасьць быць уплывовай сацыяльнай групай, нягледзячы на тое, што амаль усе яны жабракі, бо ня маюць ні вялікіх ашчаджэньняў, ні маёмасьці (як на Захадзе), а існуюць за кошт адлічэньняў з тых грошай, што ствараюцца ў эканоміцы рукамі і мазгамі маладзейшых.

Разам з тым, нізкі сацыяльны й культурны статус, усе гэтыя кпіны з боку маладых (і што ж вы зарабілі за свой век? дзе ваш Саюз і вашы заваёвы?), уся іхная сацыяльная неабароненасьць прымушае іх быць актыўнымі і салідарнымі ў адстойваньні сваіх інтарэсаў. А інтарэсы тыя простыя: ня руш старыны, захоўвай тое малое, што маеш сёньня, а новага беражыся як агню. Такая вось рэінкарнацыя спрадвечнага беларускага кансэрватызму, празь які ня раз ужо даводзілася цярпець.

Што зробіш, калі гісторыя падарыла нам «чароўнага правадыра», які вывеў зь «цёмнага лесу», дзе паміраюць старыя і нямоглыя, і вярнуў многае з тае недалёкае «старыны». І хоць тое, што вярнулася, — усяго толькі бляклыя дэкарацыі былога, а не сама мінуўшчына, але ж для многіх гэта лепш, чым няпэўнасьць і невядомасьць дэмакратыі.

Для сёньняшніх пэнсіянэраў гэта рэальнае ўвасабленьне мары пра спакойную і сытую старасьць («вось як у маленстве мы галадалі — вам не зразумець...») і магчымасьць пражыць лішнія 5—10 год сярод сваіх савецкіх ілюзій. Абвінавачваць іх у гэтым не падымецца рука нават у радыкала. Аднак прыклад старэчага эгаізму заразны, і прынцып «ня руш старыны», мне здаецца, будзе аднадушна падтрыманы і наступным пакаленьнем пэнсіянэраў, якія таксама не нажылі вялікіх багацьцяў, не стварылі новай (назапашвальнай) пэнсійнай сыстэмы і не зрабілі шмат чаго іншага. Лягчэй, вядома, зноў праехацца на гарбе маладзейшых, адклаўшы малапрыемныя сыстэмныя пераўтварэньні на плечы будучых пакаленьняў.

Гэта той выпадак, калі парушаецца раўнавага паміж старым і новым, калі дзеля «стабільнасьці» ахвяруюць будучыняй і рухам наперад. Але «часовая» параза маладосьці можа ў выніку стаць гандыкапам усёй беларускай супольнасьці. «Герантакратычнае грамадзтва» і, як яго вынік, замаруджваньне прагрэсу — адна з рэальных небясьпек, што навісла над нашай краінай.

Беларуска-савецкі кансэрватызм, па сутнасьці, — ідэйны стрыжань усёй сыстэмы, апора і надзея сёньняшняга рэжыму.

*Магілёў*



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Быцьцё

«У Сітне манашкі пасяліліся!» — «Якія яшчэ, к чорту, манашкі?!» — «Адна пажылая, другая маладзейшая; каля рэчкі кватаруюць — прапаведуюць, кніжкі раздаюць, па хатах ходзяць». — «Сэкта! Гнаць іх адсюль — дзяцей ачмураюць... Егавісты ці як іх там». — «Пераксьціся — у іх усё пра Хрыста!»

Чуткі ў вёсцы распаўсюджваюцца з маланкавай хуткасьцю й абавязковым эфэктам сапсаванага тэлефона: эвангелісткі, што прыехалі сюды зь Менску зь місіяй, на ўезьдзе, каля Палаты, усё яшчэ *манашкі*, у цэнтры, ля гаражу, — ужо *сэктанткі*, а падалей, на хутарах, увогуле *сатаністкі*.

«Абяцалі за мяне маліцца», — сьмяецца на ўсе зубы работнік Алег. Ані ў тое, што будуць маліцца, ані ў саму малітву ён проста ня верыць. «А мяне пажылая па галаве пагладзіла, я аж узбудзіўся», — у лысага Сашы-«хіміка» думкі толькі «пра гэта». «Думаеце, з самога Менску яны пра Бога расказваць сюды прыехалі?..» — яхідна шчэрыцца Алена, кабета з тае ж вуліцы.

Самі верніцы адной зь менскіх эвангельскіх грамадаў тлумачаць: «Пачулі, што ў Беларусі ёсьць такая вёска — Сітна. А Біблія піша пра калодзеж жывое вады, выкапаны ў Палестыне патрыярхам Ісакам і названы *Сітна*. У Сьвятым Пісьме выпадковасьцяў не бывае — прыехалі паглядзець».

Глядзім.

«І капалі рабы Ісакавы ў даліне і знайшлі там калодзеж вады жывой» (Быцьцё 26:19).

У Бібліі, дзе ўвогуле *вада* сымбалізуе Слова Божае, такі калодзеж сьведчыў Божаму народу пра Зямлю Абяцаную. Невыпадкова няверуючыя філістымляне (цяперашнія палестынцы), як паведамляе Кніга Быцьця, зацята спрачаліся за гэтую студню, што Ісак назваў Эсэкам, з габрэямі. Сёньня ўвесь сьвет назірае за нескончонай барацьбой, пачатай яшчэ тады, 4 тысячы гадоў таму.

«Выкапалі другі калодзеж; спрачаліся таксама і за яго; і ён даў яму імя: Сітна» (Быцьцё 26:21).

Місіянэрак, якія за тыдзень абышлі ўсю вёску ад дзьвераў да дзьвераў, *быцьцё* сучаснага Сітна ўразіла да глыбіні душы: «Людзі жывуць страшэнна і вельмі незадаволеныя. Але — ня вераць у Бога, ня вераць увогуле, што дабро пераможа зло, ня ведаюць нават, навошта яны жывуць, — і ад

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 16 — 22 ТРАЎНЯ

### 16 траўня: затрыманьні каля расейскага пасольства

Менгарсуд 15 траўня пакінуў бязь зьменаў рашэньне судзьдзі Тацяны Масальскай зь Першамайскага суду, якая адхіліла пазоў кіраўніка АГП **Анатоля Лябедзькі** да Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі з нагоды абразы ягонага гонару й годнасьці ў фільме «Тэорыя змовы».

Кіраўнік сьледчага аддзелу па асабліва важных справах пракуратуры Менску Сяргей Іваноў паведаміў, што сьледзтва ў справе пра забойства журналісткі Веранікі Чаркасавай прыпыненае яшчэ 14 сакавіка. Сваякам пра спыненьне справы не паведамлялі.

Цягнік «Горадня—Кузьніца», якім ехаў у Польшчу на працэс «Нівы» **Аляксандар Мілінкевіч** і ягоны прэс-сакратар **Павал Мажэйка**, на 15 хвілінаў быў запынены на мяжы: памежнікі доўга правяралі іх асабістыя рэчы й з кімсьці раіліся.

У Менску на акцыі Дзень салідарнасьці каля расейскага пасольства затрыманыя **Андрэй Зорка, Міхась Наскоў, Люда Атакулава, Аляксандар Курбацкі, Мікіта Шыцянкоў, Кацярына Дзяткоўская, Наста Шашкова, Зьміцер Кніга, Зьміцер Кумішча, Андрэй Прэсьнік, Павал Журпал, Аляксандар Сьцепаненка, Мікалай Сяргеенка, Максім Грычуха, Іра Янкелевіч, Аляксандар Корбан, Барысевіч, А. Дарэўскі.**

### 17 траўня: тры месяцы турмы Радзівілу

Крупскі райсуд скончыў разгляд справы **Алеся Пушкіна**: матэрыялы вярнулі ў міліцыю — праз недахопы ў расьсьледаваньні. Пушкіна вінавацілі ў тым, што нібыта ён абліў фарбай помнік опэрупаўнаважанаму аддзелу контравыведкі СМЕРШ Васілю Чабатарову, Герою Савецкага Саюзу.

Пракуратура Менску афіцыйна папярэдзіла журналістку **Ірыну Халіп** за шэраг публікацыяў у расейскай «Новой газете», прысьвечаных палітычнай сытуацыі ў Беларусі: прыкметы парушэньня заканадаўства (дыскрэдытацыя Беларусі й паклёп на прэзыдэнта Беларусі) пракуратура знайшла практычна ўва ўсіх артыкулах.

У Жодзіне работнікі пракуратуры пачалі тэлефанаваньнямі выклікаць моладзевых актывістаў на допыты. Сьледчыя цікавіліся датычнасьцю актывістаў ад незарэгістраванага «Маладога фронту», фактам знаёмства з кіраўнікамі арганізацыі Паўлам Севярынцам, Зьмітром Дашкевічам. Сьпіс асобаў, якіх трэба апытаць у гэтай справе ў Жодзіне, прыйшоў зь Менску: у сьпісе 9 імёнаў моладзевых актывістаў.

Дацэнт катэдры славянскай гісторыі й мэтадалёгіі гістарычнай навукі **Юры Бачышча**, звольнены з БДПУ, пачаў працэс супраць навучальнай установы, абскарджваючы звальненьне. Бачышчу выгналі з БДПУ пасьля таго, як той быў назіральнікам на адным з выбарчых участкаў на прэзыдэнцкіх выбарах.

17—18 траўня адбываўся суд над **Юр'ем Радзівілам**, актывістам выбарчай кампаніі Аляксандра Казуліна. 2 сакавіка супрацоўнік спэцслужбаў страляў па аўтамабілі, у якім Радзівіл ад'яжджаў ад пастарунку, дзе ўтрымлівалі Казуліна. Пасьля пададзенай Радзівілам у пракуратуру заявы пра ўжываньне зброі затрымалі яго самога ды зьвінавацілі, што ён стварыў пагрозу жыцьцю работніку міліцыі. Радзівіла асудзілі на 3 месяцы турэмнага арышту, больш за два зь іх ён ужо адседзеў у СІЗА. Перад пачаткам працэсу каля будынку суду дзяжурылі людзі ў цывільным, якія не падпускалі да будынку журналістаў, а таксама тых, хто прыйшоў падтрымаць Радзівіла. Затрымалі **Юлію Гарачку, Анатоля Гарачку** (адпусьцілі як непаўналетніх), **Крысьціну Шацікаву** (2 базавыя велічыні штрафу), **Аляксея Стральцова** (арышт на 10 сутак), **Паўла Драздова, Зьмітра Дашкевіча** і **Артура Фінькевіча** (па 15 сутак арышту). Затрыманых у аў-

# 26:21

безнадзейнасьці сьпіваюцца. Які там калодзеж...»

Слухаю місіянэрак і згаджаюся: калі б наша перамога залежала толькі ад пратэстных настрояў, прагі дабрабыту й банкруцтва ўлады, Малое Сітна ўжо даўно б абвесьціла на тэрыторыі сельсавету БНР. Але ані ленінская фармулёўка «рэвалюцыйнай сытуацыі», ані марксісцкае «быцьцё вызначае сьвядомасьць» тут не дадуць рады. Бо якраз асавечаная, сьпітая, пазбаўленая і беларускасьці, і Боскасьці сьвядомасьць скразіць у кожным дзіравым плоце, кожным пустым позірку, у кожным каліўцы сіценскага быцьця.

Праўда — студні ў Сітне ня гожыя. Неглыбокія, часьцяком нячышчаныя, на вёдрах застаецца брудны налёт... Запушчаныя, словам. Каб дабрацца да чыстае вады, трэба капаць глыбей.

Дзе ж здабыць крышталёвую, крынічную сьвядомасьць, якая можа вызначыць годнае, беларускае, хрысьціянскае быцьцё? Калодзеж якой глыбіні трэба выкапаць тут, у Сітне, каб дастаць да жывое вады, што тысячу гадоў таму вымкнула ў Палату й успаіла першую сталіцу беларускай дзяржаўнасьці?

Пэўна, трэба капаць сама менш да часоў шляхціца Завальні, калі адмова ад Бога й Радзімы пачала нараджаць у сьвядомасьці вяскоўцаў Полаччыны фантастычную нечысьць. Яшчэ глыбей, да мяжы Эўропы й Імпэрыі, якую тут два стагодзьдзі вартавала сіценская фартэца. Да папялішча самое фартэцы, заснаванай Іванам Жахлівым і спаленай Сьцяпанам Батурам... Трэба ўнурыцца ўглыб да самых сьцежак першага хрысьціянскага прапаведніка Беларусі, Торвальда Вандроўніка, які абвяшчаў Хрыста ў ваколіцах Полацку і якога тутэйшыя паганцы зь берагоў Палаты тысячагодзьдзе таму сустракалі гэтак жа, як сёньня сіценцы эвангелістаў.

І на самым дне, калі ўжо ня стане змогі, калі сонечнае сьвятло ўгары падасца поўняй сярод цёмнае начы, а пад рыдлёўкай нарэшце забруіць крынічка, мы зразумеем: свая студня жывое вады — глыбокая гісторыя, лёсы невядомых сьвятых і скарбы Слова Божага — стоеныя ў кожнай вёсачцы беларускай *глыбінкі*.

І калі зямля адкапаных нанова студняў, зь якіх чэрпаюць штодня, напоўніцца адлюстраваньнямі неба, — мы здолеем наталіць нашу самую пякучую смагу: смагу нацыянальнага абуджэньня.

*в.Малое Сітна*

«Выкапалі другі калодзеж; спрачаліся таксама і за яго; і ён даў яму імя: Сітна».

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 16 — 22 ТРАЎНЯ

тазаку завезьлі ў турму на Акрэсьціна. Драздову пры затрыманьні зламалі палец. Шацікаву пазьней некалькі разоў вазілі ў больніцу. Фотажурналістаў, якія спрабавалі здымаць затрыманьне, праваахоўнікі білі па камэрах.

Вярхоўны суд прыпыніў на 2 месяцы дзейнасьць апазыцыйнага **Ленінскага камуністычнага саюзу моладзі Беларусі** за адсутнасьць юрадрасу.

У Салігорску ў справе «Маладога фронту» на допыт у гарадзкую пракуратуру выклікалі моладзевых актывістаў **Івана Шылу, Яўгена Мядзьведзева, Рыгора Астапеню, Глеба Сандраса**.

**Працяг на старонцы 18.**



**Пікет аднаго чалавека. Маладзён з плякатам «Я быў палітзьняволеным. Нас ужо болей за 1000. Можа, хопіць?» 15 хвілінаў сядзеў на ходніку ля гіпэрмаркету «Гіпа».**

WWW.SVABODA.ORG


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Артур Фінькевіч атрымаў 15 сутак за ўдзел у пікеце падтрымкі Юр’я Радзівіла.

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 16 — 22 ТРАЎНЯ

Працяг са старонкі 17.

Адміністрацыя ААТ «Гарадня–Азот» пазбавіла офіса суполку **Беларускага незалежнага прафсаюзу** на прадпрыемстве. Ліст на адмову арэнды падпісаў намесьнік дырэктара па ідэалягічнай рабоце Аляксандар Лапковіч.

### 18 траўня: аштрафаны пастар у Повіці

Каля Маскоўскага суду затрымалі **Ірыну Завадзкую**, якая ішла на працэсы моладзевых актывістаў З.Дашкевіча, А.Фінькевіча, К.Шацікавай і інш.

**Ільлю Радковіча**, пастара незарэгістраванай Аб’яднанай царквы хрысьціянаў веры эвангельскай у мястэчку Повіць Кобрыньскага раёну, аштрафавалі на 150 тыс.руб. за «ўхіленьне ад рэгістрацыі суполкі». Пастар заявіў, што ня лічыць неабходным афіцыйна рэгістраваць статут.

Суд Жыткавіцкага раёну Гомельшчыны адмяніў пастанову адміністрацыйнай камісіі райвыканкаму, паводле якой быў аштрафаваны галоўны рэдактар выданьня «Вольныя навіны» **Міхаіл Козел**: яго вінавацілі ў распаўсюдзе друкаваных выданьняў без выходных зьвестак.

Гомельскі аблсуд падтрымаў рашэньне Калінкавіцкага райсуду, які аштрафаваў **Канстанціна Каваленю**, актывіста каманды А.Мілінкевіча, на 2550 тыс.руб., хаця і зьменшыў штраф да 1450 тыс.руб. Інвалід нібыта зьдзейсьніў крадзеж.

Магілёўскі суд адмовіўся задаволіць скаргу **Сержука Нягаціна**, які апратэстоўваў штраф у 10 б.в., вынесены яму падчас выбараў. Аналягічныя адмовы атрымалі ў Касьцюковіцкім судзе **Мікалай Малахаў** і **Уладзімер Патапаў**.

У Віцебску за «дробнае хуліганства» (абраза падчас затрыманьня) быў аштрафаваны на 2 б.в моладзевы актывіст **Сьцяпан Цішуцін**. Хаця выпадковы сьведка адзначыў, што хлопец нікога не абражаў, судзьдзя Валянціна Міхасёва заявіла, што ня мае падставаў для недаверу работнікам міліцыі, якія пісалі пратакол затрыманьня.

### 19 траўня: допыты юнакоў у Лідзе

У аэрапорце «Менск–2» цягам 1 гадзіны мытнікі надглядалі рэчы сябра Палітрады дэмакратычных сілаў **Віктара Карняенкі**, які ляцеў у Капэнгаген на канфэрэнцыю па Беларусі.

У Лідзе пракуратура дапытала ў справе «Маладога фронту» **Сержука Чайку, Віталя Калбыку, Яўгена Лапка**.

### 21 траўня: хлопец ня даўся

Пасьля «Ночы музэяў» міліцыянты затрымалі ў пустым двары **Аляксандра Апарына**, які меў значак «За Свабоду». Яго абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы, але падпісваць пратакол ён адмовіўся.

### 22 траўня: Аўтуховіч перайшоў да сухой галадоўкі

Моладзевы актывіст **Кастусь Вусянок**, зьбіты спэцназаўцамі падчас штурму намётавага гарадка, атрымаў ад кіраўніка ПМСН Падабеда пісьмовы адказ на сваю скаргу: міліцэйскі начальнік піша, што факт зьбіцьця праверкай не пацьвердзіўся.

Мін’юст адклікаў свой пазоў на ліквідацыю **ГА «Саюз беларускіх пісьменьнікаў»**.

У КДБ выклікалі кіраўніка Берасьцейскай абласной філіі ПБНФ **Юрася Губарэвіча** і папрасілі давесьці да партыйцаў, што няможна парушаць арт.342 і 369 КК (дзеяньні, якія груба парушаюць правы грамадзянаў, а таксама дзеяньні, якія дыскрэдытуюць Беларусь).

**Уладзімер Кацора** атрымаў адказ ад пракурора Чыгуначнага раёну Гомелю, старшага дарадцы юстыцыі Г.Раманюка: ён скардзіўся на хлусьлівыя сьведчаньні міліцыянта С.Нязнаева і грамадзянаў Сьмірнова й Каржа, паводле якіх яго пасадзілі на 15 сутак за «супраціў работнікам міліцыі». Пракурор адказаў, што яны ня могуць быць прыцягнутыя да адказнасьці, бо «заканадаўствам не прадугледжана папярэджаньне грамадзянаў пра адказнасьць за дачу хлусьлівых паказаньняў пры разглядзе адміністрацыйных справаў».

**Мікалай Аўтуховіч** перайшоў да сухой галадоўкі, патрабуючы зьмяніць яму меру стрыманьня з арышту турэмнага на хатні. Дагэтуль вязень трымаў звычайнае галадаваньне.

**АШ**

# Бяззубыя бабры

Субота была багатая на музычныя падзеі. У Атэнах — фінал «Эўрабачаньня», у Лагойску — фэстываль «Бітлз назаўжды», а ў Бабруйску — «Рок — за баброў». Тэксты ўсіх песень папярэдне ўзгадняліся ў гарвыканкаме. Піша **Сяргей Будкін.**

Бабруйск. Спальны раён. Сцэна, збудаваная на прыступках мясцовага палацу культуры. Колькітысячны натоўп чакае. Арганізатары нэрвова пазіраюць на захмаранае неба: за пару гадзінаў да пачатку віхор зьнёс са сцэны дах. Калі пойдзе дождж, музыкам давядзецца адразу згортвацца.



Гэтым разам фэст быў прысьвечаны ня столькі гаротным бабрам, колькі змаганьню з дыяксінам. Са сцэны тлумачылася, як важна не паліць плястыкавыя бутэлькі, а выкідаць іх у адмысловую сьметніцу. Экалягічны рок-фэст — супэр-ідэя. Каб яшчэ слова «рок» не выклікала ў разнастайных дазвальяльных інстанцыях такога страху. Бабруйская акцыя шчэ раз паказала, што найгалаўнейшым з усіх фэстаў для беларускага року па-ранейшаму зьяўляецца «Басовішча».

«Паважаю ўсіх, хто сёньня тут выступае, але які можа быць беларускі рок-фэстываль бяз топавых айчынных рокераў?!» — кажа перад выхадам на сцэну вядучы фэсту Сяргей Кузін — колішні супрацоўнік менскага FM, які зьехаў у пошуках лепшай долі ва Ўкраіну. Фэст запомніцца беларускім удзельнікам шэрагам позьнесавецкіх бюракратычных працэдураў, празь якія давялося прайсьці. Усе пэрсаналіі ўзгадняліся зь Міністэрствам культуры, а тэксты іх песень — зь мясцовай адміністрацыяй. У выніку зь беларускамоўных камандаў літаваньне тэкстаў прайшла толькі «Indiga». А пра тое, што вядоўцам мінулага фэсту быў Лявон Вольскі, палічылі за лепшае наагул ня згадваць.

На сцэну выходзіць першы гурт — «КлЁндайк», зь вядоўцай Першага музычнага каналу і апошняй Рок- каранацыі Кацяй Пытлевай у якасьці вакалісткі. У шчыльным натоўпе актывізуецца міліцыя. Людзі ў пагонах прачэсвалі гурму рок-фанатаў цягам усяго фэсту на прадмет «апазыцыйных» сьцягоў ды расьцяжак. Безвынікова. Зялянелі хіба сьцяжкі фундатара фэсту — бровару «Сябар». А падчас выступу «Indiga» мясцовыя патрыёты разгарнулі... расьцяжку БРСМ.

Але тыя некалькі дзясяткаў дзяўчат, якія сталі ў першы шэраг зь вялізнай расьцяжкай «Бі-2», не цікавіліся ані блюзавымі імправізацыямі Юр'я Міхайлава з «Мадэры хард блюз», ані жывёльнымі рыкамі вакалістаў «ТТ-34». Бабруйск чакаў гэдлайнэраў фэсту — гурту «Бі-2» і папросту трываў усіх, хто выступаў перад імі. Выступ «Бі-2» для Бабруйску тое самае, што выступ Пола Макартні для Ліվэрпулю. Каб Лёва і Шура мелі больш часу падстроіць гітары, ня выступіў удзельнік туру «За Беларусь» гурт «Нэа». Перад выхадам «Бі-2» ахова адцясьніла нават гасьцей фэсту ад сцэны.

«Бі-2» прыехалі на радзіму «прыфанэраныя» — замест жывога клявішніка граў кампутар. Але землякі не крыўдавалі. Расейскі гурт, які згадвае пра бабруйскія карані хіба што на гастролях у Беларусі, купаўся ў славе. На пытаньне вакаліста Шуры, ці ёсьць тут выхаванцы 13-й сярэдняй школы, і маладыя, і старыя заравулі: «Ёсьць!» Апроч таго, словы песень ведалі ўсе бабруйчане. Акрамя, напэўна, работнікаў ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму.

# Смолава заняла на «Эўрабачаньні» перадапошняе месца

Беларуская сьпявачка Паліна Смолава заняла ў паўфінале музычнага эўрапейскага конкурсу перадапошняе, 22-е месца. Уначы 21 траўня, пасьля фіналу «Эўрабачаньня», былі абнародаваныя вынікі паўфіналу.

Згодна зь імі, удзельніца канцэртаў «За Беларусь» набрала 10 балаў. 6 балаў за Паліну Смолаву аддала Расея, 3 — Малдова, 1 бал — Украіна. У Партугаліі ў паўфінале было 19-е месца (26 балаў), Нідэрляндаў — 20-е (22 балы), Манака — 21-е (14 балаў). Горш за беларуску выступіла толькі прадстаўнічка Андоры, якая набрала 8 балаў.

Польскі гурт «Іх трое» заняў у паўфінале 11-е месца, і палякам не хапіла 6 балаў, каб трапіць у фінал.

У фінале 20 траўня перамог гурт зь Фінляндыі «Лордзі», які набраў 292 балы. Краіны, якія занялі першыя 10 месцаў у паўфінале, у фінальным конкурсе занялі месцы з 1-га па 12-е.

Фінляндыя — 1-е месца ў фінале (1-е ў паўфінале), Расея — 2-е месца ў фінале (3-е ў паўфінале), Босьнія-Герцагавіна — 3-е (2-е), Румынія — 4-е (у паўфінале ня ўдзельнічала), Швэцыя — 5-е (4-е), Літва — 6-е (5-е), Украіна — 7-е (7-е), Армэнія — 8-е (6-е), Грэцыя — 9-е (у паўфінале ня ўдзельнічала), Ірляндыя — 10-е (9-е), Турцыя — 11-е (8-е), былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія — 12-е (10-е).

**АГ**

### Зьміцер Падбярэскі: У Смолавай не было ні каліва арыгінальнасьці

Музычны крытык Зьміцер Падбярэскі так камэнтуе конкурс «Эўрабачаньне» і выступ Смолавай на ім: «Гэта быў стандартны нумар, ні каліва арыгінальнасьці. Сама песьня нецікавая і выкананая ў пошлай манеры. Вось летувісы — зусім іншая справа. Яны тонка пакпілі з конкурсу, які ён ёсьць: камэрцыйнае шоў, ня вартае вялікае ўвагі таленавітых выканаўцаў».

**www.svaboda.org**

# «Апостраф» паставілі Дранько-Майсюку

На вечарыне ў Доме літаратара 18 траўня былі названыя сёлетнія ляўрэаты прэміі «Залаты апостраф», заснаванай часопісам «Дзеяслоў».



У прывітальным слове галоўны рэдактар часопісу Барыс Пятровіч адзначыў, што «Дзеяслоў» жыве ўжо чатыры гады й на цяперашні час мае падпісчыкаў больш, чым холдынгаўскія «Полымя» й «Маладосьць» разам узятыя. З пачатку 2006 году павялічыўся аб'ём выданьня, а нядаўна выйшла першая кніга ў «Бібліятэцы «Дзеяслова» (Анатоль Івашчанка «Вершnick»). Увосень мае зьявіцца яшчэ адна кніга, а надалей, плянуе рэдактар, у год пэрыядычнасьць выхаду кніжак у «Бібіліятэцы» дасягне часопіснай — 6 разоў на год.

У намінацыі «Паэзія» пераможцам стаў Віктар Сьлінко за паэму «Жбан і вада».

Найлепшым празаікам мінулага году, у вэрсіі «Дзеяслова», стаў Леанід Дранько-Майсюк за творы «Нэрвовы раман» і «Хлопчык і бацькі». Падчас уручэньня ўзнагароды вядомы паэт згадаў, што толькі адзін раз надрукаваў у «Дзеяслове» свае вершы, а зьмяшчае там усё прозу.

У намінацыі «Дэбют году» пераможцай стала маладая паэтка з Горадні Ганна Аўчыньнікава: для дзяўчыны ейны першы прыезд у Менск шчасьліва супаў з урачыстым узнагароджаньнем.

**Аркадзь Шанскі**

# Раскопкі на сьметніку не далі плёну

Менская археалягічная калекцыя, якая зьбіралася 60 гадоў і ў лютым была вывезеная на сьметнік (300 тыс. экспанатаў) страчаная незваротна. Раскопкі, зладжаныя на сьметніку, куды вывезьлі экспанаты, не далі плёну.

Супрацоўнік Інстытуту гісторыі НАН Беларусі, археоляг Сяргей Тарасаў, які апошні апекаваўся калекцыяй, лічыць, што з надзеяй адшукаць сьведчаньні менскай мінуўшчыны цяпер ужо можна разьвітацца: «Мы зрабілі некалькі спробаў. Капалі экскаватарам на гусенічнай хадзе. Літаральна два тыдні таму была апошняя спроба, у суботу і нядзелю. Але ці то мы не дакапаліся да таго слою, дзе высыпаныя экспанаты, ці то яны рассыпаныя шырока. Там жа бульдозэрам усё ўтрамбоўваецца...»

Камунальныя службы, паводле словаў С.Тарасава, не захацелі даўжэй чакаць і цяпер пачалі зноў звальваць сьмецьце на месца, дзе, як мяркуецца, былі высыпаныя археалягічныя экспанаты.

Навуковец зазначыў, што сьледзтва па факце зьнікненьня калекцыі вядзе пракуратура Ленінскага раёну Менску. Сваіх высноваў работнікі пракуратуры яшчэ не зрабілі.

**АШ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Кульмінацыя менскай «Ночы музэяў» 20 траўня — адкрыцьцё выставы плякатаў Цэсьлера і Войчанкі. У цэнтры — ... Цэсьлер.**




**Беларускія модніцы запрашаюцца ў музэй: з 18 траўня ў Музэі старажытнабеларускай культуры (Сурганава, 2/1) выстаўляецца калекцыя народнага адзеньня. Яе зьбіраў калектыў музэю, а фундаваў працу «Беларусбанк». У калекцыі 230 касьцюмаў.**

## КАЛЯНДАР

# Чэрвень

**1** — Ушэсьце ў праваслаўных.

**4** — Сёмуха ў каталікоў.

**9** — 125 гадоў з дня нараджэньня Івана Луцкевіча (1881—1919).

**9** — 75 гадоў з дня нараджэньня хіміка Валянціна Капцюга (1931—1997). Расейскі навуковец у галіне арганічнай хіміі, акадэмік Расейскай АН, замежны чалец НАН Беларусі, ляўрэат Ленінскай прэміі (1990) — беларус па паходжаньні, ягонага бацьку рэпрэсавалі й выслалі ў Сібір.

**11** — Сёмуха ў праваслаўных.

**11** — 75 гадоў з дня нараджэньня Ўладзімера Мацюхіна (1931), фізыёляга й біяфізыка, акадэміка НАН Беларусі, АМН СССР і Расейскай акадэміі мэдычных навук. Дасьледаваў сьпярша радыяцыю на савецкіх падлодках, у 1988 г. заснаваў Інстытут радыяцыйнай мэдыцыны ў Беларусі.

**13** — 50 гадоў з дня нараджэньня цяжкаатлета Леаніда Тараненкі (1956), заслужанага майстра спорту СССР, двухразовага чэмпіёна сьвету (1980, 1990), чатырохразовага чэмпіёна Эўропы. Паставіў 19 сусьветных рэкордаў.

**14** — 75 гадоў з дня нараджэньня опэрнага сьпевака (барытон), народнага арыста Беларусі Ігара Сарокіна (1931). Сьпяваў у опэрах «Алеся» Я.Цікоцкага, «Яснае сьвітаньне» А.Туранкова, «Сівая легенда» Дз.Смольскага.

**15** — 75 гадоў з дня нараджэньня навукоўца ў галіне зваркі Леаніда Дзянісава (1931), акадэміка Беларускай інжынэрнай акадэміі.

**20** — 400 гадоў таму пачалося мяшчанскае паўстаньне пад кіраўніцтвам Стахора Міткові ча ў Магілёве (1606), першая буржуазная рэвалюцыя ў Беларусі. Дэмакратычна абраны магістрат Магілёва пракіраваў горадам 2 гады.

**23** — Купальле.

**24** — Сьвяты Ян у каталікоў.

**29** — Сьвятыя Пятро і Павал у каталікоў.

**30** — 125 гадоў з дня нараджэньня мовазнаўцы Паўла Растаргуева (1881—1959), праўдзейнага чальца Інбелкульту. Дасьледаваў мовы беларуска-расейска-ўкраінскага памежжа.

**30** — 75 гадоў з дня нараджэньня кінарэжысэра-дакумэнталіста Рышарда Ясінскага (1931), сцэнарыста, журналіста, ляўрэата прэміі Міжнароднага кінафэстывалю дакумэнтальнага кіно (1973) за фільм «Празь дзесяць гад оў, або Надзеі і трывогі 10-га «А». Аўтар фільмаў «Зорка Максіма» (1981), «Палянэз для касінэраў» (1994), «Дыярыюш наваградзкі» (1997) і інш.

**АВ**

# Зянон Пазьняк: Змаганьне Плешчанкі было найбольш блізкім да мэтаду Гандзі

«Уладзімер Плешчанка быў сапраўдны змагар, які паказаў, як можна невялікімі сіламі зрабіць шмат. Ён даў прыклад, як абараніць гонар Беларусі, як можа адзін чалавек паставіць сябе ў барацьбе. Гэта была Асоба. Ягоны мэтад змаганьня быў найбольш блізкі да мэтаду Гандзі. Ён ня меў маёмасьці, і кожны дзень зь невялікай групай людзей ён ехаў у Віцебск, у цэнтры гораду раздаваў беларускую літаратуру, газэты, фронтаўскія ўлёткі, пад бел-чырвона-белым сьцягам, з адпаведнымі лёзунгамі.

І ён прымусіў сябе паважаць, да яго людзі ішлі раіцца, пагаварыць. На яго кідаліся правакатары, але ён быў заўсёды вытрыманы і спакойны. Гэта ня быў чалавек экзальтаваны, ён не даваў сябе справакаваць. На яго навесілі мільёны штрафаў, яго дзясяткі разоў арыштоўвалі, аднойчы ён праседзеў амаль паўгоду ў камэры па падазрэньні, якое не даказалі. І ён не зламаўся, будучы інвалідам па сардэчнай хваробе.

Судзьдзі ведалі, што Плешчанка ня мае маёмасьці, і кожны раз давалі яму штрафы, думаючы яго прынізіць і запалохаць. Выйшла наадварот — акурат Плешчанка стаў маральным пераможцам у гэтай непрыстойнай судовай цяганіне. І судзьдзі




**Уладзімер Плешчанка.**

пачувалі сябе вінаватымі і ня ведалі, куды падзецца перад ягоным поглядам. Аднойчы Плешчанка і ягоная каманда нават зрабілі мэдаль — «Найгоршаму судзьдзі, беспрынцыпнаму і несправядліваму». І сур'ёзна ўручылі, вызначыўшы гэтага судзьдзю. І судзьдзя разгубіўся, ня ведаў, куды падзець вочы.

Плешчанка застаецца ў гісторыі беларускай барацьбы, у гісторыі беларускага сьцяга (бо ён уваходзіў у групу Мірона). Памяць пра Плешчанку для нас будзе як прыклад, прыклад вялікага беларуса, сур'ёзнага і сумленнага змагара. Прыклад таго, як можна, маючы толькі моцны дух і шчырае сэрца, дапамагчы Беларусі».

**Паводле svaboda.org**

# Спынілася сэрца

Якое гэта было сэрца! У шнарах ад інфарктаў, арытмічнае ад хваробы, такое жывое і такое ранімае…

Я пазнаёміўся з Уладзімерам Плешчанкам у 1990 годзе, падчас працы ў Віцебскім гарадзкім клюбе выбаршчыкаў «За дэмакратычныя выбары», тады ён ужо быў сябрам Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне». Потым была супольная праца ў радзе «Выбар», якой ён кіраваў. Сёньня я пакуль ня маю права паведаміць пра ўсе тыя справы, што ён рабіў — не прыйшоў яшчэ час. Але магу пацьвердзіць, што ў самых сьмелых акцыях ён страхаваў легендарнага Мірона.




**Уладзімера Плешчанку пахавалі на могілках бацькоўскай вёскі Вароны.**

Уладзімера Плешчанку таксама з поўным правам можна назваць чалавекам-легендай: самы першы «беларускі Майдан», заснавальнікам якога ён быў, пачынаўся ў Віцебску — у цэнтры гораду, ля «сіняга дому». І ў сьцюжу, і ў сьпякоту мінакам здалёк была відаць постаць Уладзімера Плешчанкі. Так было шмат гадоў, і за некалькі дзён да сьмерці ён ізноў стаяў на сваім ганаровым месцы. Хто б мог падумаць, што гэта быў апошні раз...

Сёньня, калі яго ўжо няма з намі, я яшчэ больш цьвёрда ўсьведамляю, на што аказаўся здатны гэты беларускі Герой у змаганьні за Волю і Незалежнасьць роднай краіны, — ён ахвяраваў сабой, аддаўшы змаганьню самае галоўнае і каштоўнае, што ў яго было — сваё сэрца.

**Барыс Хамайда, Віцебск**

у кнігарнях з 15 траўня

5 - 2006

ARCHE

п а ч а т а к

5 - 2006



Максім Жбанкоў, Валянцін Акудовіч, Сяргей Панькоўскі

**Пострэвалюцыйны сындром**

Пётра Рудкоўскі

**Каралі і пешкі беларускай палітыкі**

Андрэй Хадановіч

**Кожны чацьверты – прэзыдэнт**

Рышард Капусьцінскі

**Імпэратар**

ISSN 1392-9682

9 771392 968001

ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Заснулыя ў Армагедоне



Лукашэнка выдаў апазыцыі вялікі аванс. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

У аўторак у Авальнай залі прэзыдэнт папярэдзіў падначаленых, што апазыцыя рыхтуецца да жорсткай барацьбы на мясцовых выбарах. Ні многа ні мала — марыць пра рэванш.

Шчодры камплімэнт! Насамрэч «рэваншысты» выкінулі ўжо белы сьцяг. Маўляў, у саветы нашых усё адно не прапусьцяць, таму скарыстацца нагодай варта хіба што дзеля інфармаваньня насельніцтва. Загадзя афармляецца індульгенцыя на паразу?

Дарэчы, на мінулых мясцовых выбарах апазыцыя не магла перамагчы ў прынцыпе: шмат у якіх акругах банальна не знайшлося каго выстаўляць. Сёньня людзкога рэсурсу не нашмат болей.

Даўно рэклямаваны шырокі рух прыхільнікаў пераменаў дасюль нагадвае паўфабрыкат. Ён ужо ня першай сьвежасьці, а кухары ўсё спрачаюцца наконт рэцэпту прыгатаваньня.

Контуры ініцыятывы, яе структура ды мэханізм цалкам не акрэсьліліся нават для саміх натхняльнікаў. У валантэраў жа можа скласьціся ўражаньне, што іх проста водзяць за нос. Згадваецца, што яшчэ падчас Чарнобыльскага шляху перасоўны пункт пад калянадай Акадэміі навук запрашаў ахвотных запісацца ў рух «За свабоду». Сёньня ж высьвятляецца, што фіксаванага сяброўства не прадугледжваецца, дый увогуле гэта ня рух, а кампанія. Прычым з размытымі абрысамі.

Палітоляг Валер Карбалевіч даводзіць, што ў айчынных умовах мелі посьпех хіба тыя кааліцыі, што ствараліся пад канкрэтныя задачы. Усе ж ініцыятывы пад агульнадэмакратычнымі лёзунгамі пераtвараліся ў аморфную манілаўшчыну.

Пакуль жа фактычна толькі мяняюцца шыльды. Штабы Мілінкевіча стануць называцца выканкамамі кампаніі. Увогуле відавочна, што стратэгія аб’яднаных дэмакратаў на два найбліжэйшыя гады грунтуецца на аўтаматычнай пралянгацыі Мілінкевічава лідэрства і прасоўваецца ягонымі прыхільнікамі.

Між тым на гэтай глебе не на жарт счапіліся амбіцыі. Анатоль Лябедзька на мінулай палітрадзе за стратэгію не галасаваў. І падкрэсьліў: «Хто не галасуе, той можа і не выконваць рашэньняў». АГПшнікі, як вядома, закусілі губу яшчэ зь леташняга кангрэсу, на якім іхні лідэр змагаўся за першынство наздра ў наздру.

Новая фаза пэрсанальнага суперніцтва ў апазыцыйных вярхах — сакрэт палішынэля. Хаця сёньня пытаньне не ў пэрсаналіях. Як на далоні — канцэптуальная крыза.

У чым палягае адметнасьць і патэнцыйная прывабнасьць новай кампаніі, як гэтая машына мусіць працаваць, з агульных тэзаў яе канструктараў уцяміць немагчыма. Намер прыняць у пакеце са стратэгіяй плян канкрэтных



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

дзеянняў сарваўся праз той жа раздрай у вярхах ды, бадай, боязі гэтай канкрэтыкі, за якую потым можна спагнаць па пунктах.

Лідэры цьвердзяць, што галоўныя мэты — адхіліць ад улады дзейнага кіраўніка, перамагчы на вольных выбарах ды пабудаваць дэмакратычную Беларусь. Думкі, вядома, сьвежыя, аднак жа выразнага альгарытму дзеяньняў не прапануецца. Калі не лічыць цьмяных тэзаў пра неабходнасьць «перамагчы ў галовах людзей». Адразу згадваецца Рэй Брэдбэры зь яго «Заснулым у Армагэдоне». Памятаеце: два духі ваююць за мозг небаракі, а ён абодвух пасылае к чорту.

**Беларускіх хакеістаў, якія трапілі ў васьмёрку найлепшых на Чэмпіянаце сьвету, сустракалі як герояў. А хлопцы бязь сем'яў зьнебыліся...**



# Crack'нуць код да Вінчы



Гэта быў спосаб шыфроўкі, які ведаў і якім карыстаўся толькі адзін чалавек на зямлі... Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Стомлены пошукамі Граалю, прафэсар Робэрт Лэнгдан сядзеў у нумары «Гілтану» і чытаў коміксы пра «Тома і Джэры». Ён быў упэўнены, што ў паводзінах ката́ ёсьць нейкае закадаванае пасланьне зьніклай цывілізацыі інкаў.

Раптам ў яго пакой уварвалася Сафі Нэвэ — прапрапрапрапраўнучка Хрыста на зямлі.

— Ты чытаў? — яна кінула яму газэту. — У Беларусі забаранілі «Код да Вінчы»!

— Дзякуй Богу, мне абсалютна не даспадобы, як мяне граў гэты Том Гэнкс. Я ж абсалютна іншы — вышэйшы, статнейшы і галоўнае — я чарнаскуры. А што да забароны — нічога дзіўнага. Відавочна, у беларускім кіраўніцтве ёсьць лятэнтны фанат суполкі «Опус Дэі», які зранку ўтаймоўвае сваю плоць клюшкай.

— Справа ня ў тым, — Сафі нарэшце перавяла дух. — Я паглядзела ў энцыкляпэдыях, навяла даведкі і вось што знайшла.

Яна дастала з партманэ нейкі малюнак.

— Гэта рэпрадукцыя вядомай карціны «Вызваленьне Менску ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», і калі апрацаваць яе ядам Борджа, а потым паглядзець праз рэнтген, на вежы танка, які намаляваны ў цэнтры, можна прачытаць словы…

Сафі паднесла да малюнку лупу.

— Божа мой! — зароў прафэсар. На танку было ясна напісана «Т-34».

Гэта быў спосаб шыфроўкі, які ведаў і якім карыстаўся толькі адзін чалавек на зямлі — вялікі да Вінчы. Калі памножыць знакі на колькасьць камандаў у сэрыі «А», а потым падзяліць на колькасьць гітоў Чэлентана, то ясна выходзіла фраза: «Я, уважаемые друзья, не случайно — может, для большинства это в новинку и неожиданно — начал разговор именно с общественных организаций. А что должен говорить Президент после президентских выборов, где практически все население поддержало его. Это не только доверие к Президенту — это доверие ко всей власти, доверие ко всем нам».

— Ці разумееш ты, што гэта значыць? — прамямліў Лэнгдан. — Гэта значыць, што Марыя Магдаліна нарадзіла не адно дзіця.

— Ты хочаш сказаць, што ў мяне ёсьць далёкаюрадны брат і гэта…

Дзьверы раптам адчыніліся. На парозе стаялі альбінос Сальвас, чокнуты прафэсар Лі і іншыя нэгатыўныя пэрсанажы твору Браўна.

Сальвас выйшаў наперад.

— Вы зьнесяцё гэтую таямніцу з сабой у магілу. Нам ніколі ня быў патрэбны нашчадак Хрыста па жаночай лініі. Больш небясьпечны яго прапрапраўнук. Забараніўшы фільм, ён хацеў адвесьці ад сябе падазрэньне, аднак, дзякуючы вам, мы знаем, што гэта быў хітрык. Яму — капец. Аднак спачатку трэба пазбыцца сьведкаў…

## Дзякуй тым, хто ахвяравалі грошы

Хачу праз «Нашу Ніву» падзякаваць людзям, ахвяраваньні якіх фундавалі скарб фонду салідарнасьці з ахвярамі рэжыму. Дадам, што грошы, атрыманыя ад вас, лічу пазыкаю, якую вярну пасьля ўладкаваньня на працу (мяне звольнілі за ўдзел у пратэстах). Яшчэ хачу зьвярнуцца да ўсіх людзей з дэмакратычнымі поглядамі. Сёньня недастаткова мець уласную пазыцыю, каб у краіне што-нешта зьмянілася. Хіліцеся да аднадумцаў, гуртуйцеся і далучайцеся, бо *ніхто сам* не зварухне гэтай чорнай машыны. Сіла наша ня ў колькасьці паасобку, а ў адзінстве! Таму сам я ўрэшце далучаюся да БНФ.

**Юры Рыжкоў, Менск**

***

*На цябе, наша моладзь, надзея*
*Нашай сумнай забранай зямлі;*
*Твой арліны палёт цьму разьвее*
*І запаліць веквечны агні.*
Я. Купала

Модаю Вясны-2006 сталі бела-чырвоныя значкі зь яркім запаленым сэрцам у цэнтры. Свабода захапіла цэнтральныя вуліцы й плошчы сталіцы, найбуйнейшыя навучальныя ўстановы й прадпрыемствы, кірмашы й школы, сродкі масавай інфармацыі й транспарт.

У Беларусі стала модна быць свабодным чалавекам, мець сваю думку й не баяцца адстойваць яе, нават перад страхам турмы.

**Барыс Гар-кі, Менск**

## Перапіс насельніцтва па электаральнай прымеце

**Сустракаюцца двое знаёмцаў, англелец і беларус. Англелец пытае:**

— Алесь, а што гэта ў вас амаль штодня затрымліваюць людзей, нібы злодзеяў, на вуліцах — каго са сьвечкаю, каго з балёнікам, каго са значкам ды нават з газэтаю — і адвозяць у міліцыю, дзе потым перапісваюць зьвесткі, фатаграфуюць ды адпускаюць? Як гэта ўсё зразумець???

— Разумееш, Джон, зь нядаўніх часоў беларускія ўлады вынайшлі новы сучасны добраахвотна-прымусовы спосаб перапісу насельніцтва па электаральнай прымеце. Зараз растлумачу.

Падчас прэзыдэнцкае выбарчае кампаніі за прэзыдэнта сабралі 1 903 069 подпісаў; у адсотках да ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь — прыкладна 20%.

Значыць, астатнія 80% ня вельмі адданыя сёньняшняму кіраўніцтву. Столькі мільёнаў неперапісаных грамадзян?! — Небясьпека для таталітарнае дзяржавы. Таму і хапаюць кожны дзень шараговых беларусаў, каб унесьці іх у гісторыю.

Вось і атрымоўваецца: раней перапіс насельніцтва праводзілі прыкладна раз на 10 год, і рабіла гэта *спэцыяльная служба*. А цяпер перапіс ідзе няспынна, і займаюцца ім *спэцслужбы*. Бачыш розьніцу?

**Юрась Бусел, Дуброва**

# 600 гадоў беларускаму рублю

Да нясконачанае дыскусіі аб назове беларускіх грошай.

Назоў нацыянальнае валюты — такі ж сымбаль краіны, як і назоў самой краіны, яе сьцяг і герб. Гэтае пытаньне не паўстае ў краёх, якія былі калянізаваныя. Там адказ выцякае з гістарычнага развою. У новых жа краінах адказ шукаецца часта ў жарсных дыскусіях.

Дзе ж мусім шукаць вытокі сымбаляў краіны, якія маюць быць жаралом гонару грамадзянаў і пашаны замежнікаў? У эпосе росквіту нашай зямлі. Пэрыядам канчатковага фармаваньня старажытнабеларускае дзяржаўнасьці, народнасьці і мовы сталіся часы актыўнага дзяржаўнага будаваньня Вялікага Княства Літоўскага. Гэтая эпоха пачалася з Гедыміна і дасягнула сваёй кульмінацыі за Вітаўта Вялікага. Гэты адцінак часу характарызуецца і існаваньнем адметнае старабеларускае грашовае сыстэмы, заснаванае на срэбных наміналах. Але пра гэта ніжэй, спачатку разгледзім іншыя пазыцыі, магчымыя пры выбары назову нацыянальнае валюты.

Вышэйзгаданы падыход ёсьць альтэрнатыўным двум іншым — адзін зь іх абапіраецца на «народную памяць» уплывовых людзей (бярэцца назоў зь ліку пашыраных даўней у народзе, з адкіданьнем каляніяльных варыянтаў), а другі прадугледжвае сьляпое запазычаньне апошняга назову, незалежна ад паходжаньня. Прыкладам першага падыходу ёсьць выбар кіраўніцтва Беларускае Народнае Рэспублікі — «таляр» (з націскам на другі склад), альбо яго русіфікаваны варыянт «талер», роўны 100 грошам. Другі тарнуецца цяпер у Рэспубліцы Беларусь. Зьмешаная камбінацыя ўжываецца ва Украіне, дзе да гістарычнага тэрміну «грыўня» дастасавана запазычаньне «капейка». Іншыя нашы суседзі, да прыкладу, Латвія, яшчэ ў пачатку XX стагодзьдзя абралі штучны наватвор («лат»).

У сучаснай Беларусі абок рубля функцыі асноўнае лічэбнае адзінкі рэальна выконвае амэрыканскі даляр. Вядомы анэкдот пра нуварыша, што, прыехаўшы з Амэрыкі, у размове зь сябрам зьдзіўляецца, бо там у разьліках аказваецца таксама выкарыстоўваюцца «нашы баксы», выдатна ілюструе сытуацыю для ўсяе постсавецкае прасторы, апроч Балтыі. Толькі там, дзе нацыянальная валюта мае адносна вялікі (чытай — зручны для разьлікаў) курс, пазыцыі даляра ўжо значна аслабленыя.

Але на што ж лічылі грошы нашыя продкі? Першыя собскія грошы Беларусі — віцебскія ізроі, вядомыя яшчэ з XII стагодзьдзя, — паўкруглыя пруткі срэбра вагой крыху болей за 100 грамаў. Яны ўжываліся галоўным чынам для гуртовага гандлю. Ізроі рэзалі на часткі дзеля атрыманьня разьменных грошай. Дробная манэта за часоў утварэньня ВКЛ паступала зь іншых краінаў: нямецкія пенязі (дынары), пазьней праскія грошы, у меншай ступені і больш лякальна шэлегі абодвух крыжацкіх ордэнаў, драхмы Залатое Арды і польскія квартнікі (паўгрошы). Для найдрабнейшага гандлю ўжываліся скуркі вавёрак ды іншых зьвяроў. У XIV ст. галоўныя пазыцыі займае праскі грош. Грошы лічылі на копы і рублі. З пачатку стагодзьдзя капа амаль раўнялася рублю, які азначаў колькасьць грошаў у вагавой грыўні новага тыпу, і месьціла 60 грошаў шырокіх (праскіх). З пагаршэньнем якасьці апошняга, курс рубля ў 1413 г. замацаваўся на адзнацы 100, у той час як капа не зьмяніла сваёй вартасьці, бо была чыста лічэбным, не матэрыялізаваным паймом. У 80-я гады XIV ст. пачынаецца вытворчасьць дробнае манэты ВКЛ — пенязяў розных наміналаў, верагодна, заснаваных на даўнейшых вагавых адзінках полацка-віцебскае сыстэмы — даўгеі і завушні. Першыя эмісіі мелі ўдзельны (мясцовы) характар. Але ўжо дзесяцігодзьдзем пазьней грашовая вытворчасьць удзелаў згортваецца, што было зьвязана з узмацненьнем цэнтралізацыі дзяржавы вялікага князя Вітаўта. Б'юцца аднатыпныя пенязі для дробных разьлікаў. Значныя сумы па-ранейшаму лічылі на копы грошаў, радзей — на рублі грошаў. Яскравым фактам ёсьць існаваньне ў пачатку XV ст. трывалае дзесяцічнае грашовае сыстэмы — упершыню ў Эўропе на дзяржаўным узроўні! Адзін рубель быў роўны 100 грошам і 1000 пенязям. У канцы XV ст., з поўным выцясненьнем з курсаваньня плацёжных пруткоў — рублёў, лік на копы пачаў пераважаць ва ўсіх праявах гаспадарчага жыцьця ВКЛ і шырока тарнаваўся яшчэ болей за стагодзьдзе, пакуль ня быў замешчаны польскім лікам на залатоўкі (роўныя 30 грошам).

Адметная старажытнабеларуская грашовая сыстэма перастала існаваць у другой палове XVI ст., калі яна была пасьлядоўна зрэфармаваная на ўзор польскае вялікімі князямі Жыгімонтам Аўгустам і Сьцяпанам Батурам. Толькі тады, з заняпадам беларускае дзяржаўнасьці, зьявіліся першыя таляры ВКЛ, уласьцівыя дагэтуль выключна Заходняй Эўропе. Пазьней гэтыя манэты сталіся вельмі пашыранымі ў гандлі нашага краю, але былі прэзэнтаваныя пераважна эмісіямі Нідэрляндаў. Такім чынам, назоў «таляр» можа асацыявацца толькі зь беларускай дзяржаўнасьцю БНР, але не ВКЛ.

Такім чынам, сучасны назоў нацыянальнае валюты «рубель» мае поўнае права на існаваньне. Адзінае, што разьменная манэта мусіць звацца «грошам», а не «капейкай», якая ня мае да Беларусі жаднага дачыненьня. У пэрыяд найбольшага росквіту беларускае дзяржаўнасьці нашыя продкі карысталіся лічэбнымі і матэрыяльнымі рублямі, якія дзяліўся на грошы ў прапорцыі 1:100. Мы маем добрыя шанцы адзначыць неўзабаве 600-годзьдзе першае ў Эўропе дзесяцічнае грашовае сыстэмы.

**Дзьмітры Гулецкі, Менск**

Вальжына Морт і Зьміцер Вішнёў пішуць і чытаюць вершы ў Бэрліне.

# Націск на зычныя

Трымаючыся адной рукой за локцік іншай, Вальжына Морт пазірае ў падлогу. «Логвінаўскі» зборнік вершаў, у якім заціснутыя аркушы паперы з кампутарнымі раздрукоўкамі, глядзіць долу. Зрэдчас яна страляе вачыма ў бок вядоўцы чытаньняў, якая акурат кажа пра тое, што «ў сваіх вершах Вальжына выражае адзіноту людзей, закінутых у гэты сьвет, і іх імкненьне да свабоды».

— Пачынаем, Вальжына? — пытаецца яна.

Моўчкі хітнуўшы галавой, паэтка выходзіць наперад. Пальцы крыху трымцяць. «Не, я не хвалююся перад выступамі», — сказала Вальжына за чвэрць гадзіны да пачатку чытаньняў, што прашлі 14 траўня ў бэрлінскай галерэі *Giedre Bartelt*, разьмешчанай на самым рагу Лініенштрасэ ды Малой Гамбурскай вуліцы, у Бэрлінскім раёне Мітэ, поўным мастацкіх салёнаў, ня дужа танных рэстарацыяў ды прагных да арт-допінгу мінакоў. Але Вальжына любіць выступаць першай — такім чынам можна лавіць кайф, спакойна слухаючы тых, хто выступае пасьля цябе.

«Беларуская мова», — звонка адбіваецца ад белых сьценаў назва першага вершу. Слухачы прыціхлі, нібы школьная кляса. Але памыляецца той, хто чакае пачуць выдатніцу ў гэтай апранутай амаль па форме (сьветлы верх, цёмны ніз) дзяўчынцы. Мякка, нібы саміца леапарда, Вальжына ідзе ў наступ. Брунатны замшавы пантофлік ледзьве заўважна адбівае рытм, дакладней, не адбівае, а расстаўляе акцэнты:

Можа, нарадзіліся Мы бяз ноГ?
Можа, Ня тыМ багаМ Молімся?

**Вальжына ўмее ставіць націскі на зычныя. Канец вершу. Незаўважна аблізнуўшы губы, паэтка кідае непатрэбны аркуш у кут і бярэцца за іншы.**

Наведнікі паслухмяна паварочваюць галовы да вядоўцы, якая збольшага роўным голасам (бо імітаваньне Вальжыны мае рызыку ператварыцца ў пародыю) чытае пераклад. Сербануўшы эмоцыяў ды пакаштаваўшы моўнага кактэйлю, слухачы патрабуюць сваёй порцыі зьместу. Ніхто ня кажа ні слова.

## Сэанс паэтычнага гіпнозу

У адрозьненьне ад Вальжыны, зь яе

**Працяг на старонцы 28.**



**Вальжына Морт: нямецкая стыпэндыя — шанец папрацаваць.**

## ВАЛЬЖЫНА МОРТ

ПАМЯЦІ КНІГІ

кнігі паміраюць

зь цёмных спальняў
дзе адзіная дарога
пракладзеная жоўтай лямпай
вяла да кніжнай старонкі
іх рассоўваюць па ўсіх вуглах дому
ператвараючы яго ў вялікі кніжны могільнік
тых чые імёны ўжо нічога ня кажуць
зносяць на паддашак
дзе яны па дваццаць асобнікаў у адной
каробцы
як у брацкіх магілах

кнігі ўдавеюць

у пустых кватэрах
нічыё сэрца больш ня б'ецца над імі
ніхто ня дзеліць зь імі вячэры
не ўпускае ў ванну

ніхто не заўважае
як яны губляюць старонкі
як валасы
як памяць
кнігі старэюць у адзіноце

і самая ўражлівая кніга
назаўсёды застаецца
ў халодным ложку
накрыўшы галаву падушкай
душыць крык сваіх чорных літар

старыя кнігі —
закінутыя магілы

*Мілбрук, красавік 2006 — Бэрлін, травень 2006*

# Націск на зычныя

**Працяг са старонкі 27.**

асьцярожна зашпіленымі гузікамі ды старанна закасанымі рукавамі, Зьміцер Вішнёў — лёгкі хаос: чорная кашуля навыпуск, жоўтая асадка ў нагруднай кішэні, рукапісы з пакамечанымі рагамі. Для затраўкі клясык беларускага пэрфомансу чытае маленькі верш — «прозу ў паэзіі», — які быў напісаны па сьлядах апошніх, агульнавядомых (немцам у тым ліку) падзеяў у Беларусі. «Яксьці так выйшла — напісаў», — асьцярожна апраўдваецца Зьміцер і, дадаўшы да голасу пару дэцыбэлаў, кідае ў публіку назву: «Гематома галавы нумар два».

— Я гляджу на цябе па тэлевізіі — ты сталееш, мой дыктатар... — з іранічным дакорам пачынае Зьміцер. Ён гукае вершы, прыкрыўшы рот рукой, нібыта заблукаўшы ў лесе. Голас зьвініць у шкле рамак, за якімі хаваюцца фатаграфіі Артура Клінава ды Ігара Саўчанкі (чытаньні прымеркаваныя да закрыцьця іх фотавыставы ў галерэі). З кожным радком, з кожным складам Зьміцер крочыць наперад, зьядаючы вачыма тэкст і не заўважаючы нікога наўкола. Маша, па-дэкадэнцку экстравагантная аматарка беларускай паэзіі зь Пецярбургу, недаверліва ўздымае рэзка падведзенае брыво і насьцярожана падціскае ногі ў белых панчохах — што ні кажы, а яна сядзіць на падлозе перад родапачынальнікам «Бум-бам-літу», які, нібыта чорны лякаматыў, рухаецца ў яе кірунку. Аднак у самы апошні момант, калі сутыкненьне здаецца непазьбежным, Зьміцер спыняецца, рэзка паварочваецца і перагортвае старонку.

— Самі бачыце, славянская традыцыя чытаньня вершаў крыху адрозьніваецца ад нямецкай, — ніякавеевядоўца, спрабуючы даць рады вішнёўскай экспрэсіі ў перакладзе.

Неўзабаве пачынаецца новы верш. Пераход ад палітыкі да каханьня. Жаночая палова залі загіпнатызавана ўсьміхаецца.

Паўгадзіны паэтычнай атакі — і чытаньні пераліваюцца ў гутарку за келіхам шампанскага.

— Беларуская мова вельмі цікавая, — кажа Маша зь Пецярбургу. — Словы іншыя, эмоцыі іншыя.



**Зьміцер Вішнёў дэманстраваў славянскую традыцыю чытаньня вершаў.**

МОВА ТУБЫЛЬЦАЎ

Сёньня ў краме ты мне пасьміхнулася.
Гэта быў сыгнал.
Я мусіў дзейнічаць. Але я прайшоў.
«Вучы мовы, ідыёт! — крычаў я сам-насам.
І гэты крык біўся ў агоніі ненароджаных дзяцей,
няспраўджаных надзей,
асьвятляўся промнямі вечаровага сонца.
Але было выйсьце! Было!
Расплюшчыўшы вочы —
валодаеш мовай каханьня!
Нэрвовы, я кідаўся ў кветкі і
засынаў пад іх пах.
Уначы гучаў мой перадсьмяротны храп.
Са сьценаў будынкаў асыпаўся вершаваны прах...

*4 траўня 2006, Бэрлін*

— Мне спадабаліся выявы ў творах Зьмітра, асабліва ягоныя тараканы, — кажа яе спадарожніца, немка Рына.

Наведнікі разглядаюць фатаздымкі на сьценах. Фота Ігара Саўчанкі — расьцягнуты па старонках стары фотаальбом. Размазаная Крамлёўская вежа ў імгле. Сьцёрты твар хлопчыка на калектыўным фота. Фотапартрэт савецкага афіцэра, на палях — подпіс панямецку. Шэрыя людзі-трафэі на выцьвілай паперы. На фота Артура Клінава — горад СОНца. Санлівыя промні блукаюць па тынку будынкаў, што жывуць на пустых вуліцах. «Мая праграма — мастацтва з усходняй Эўропы, — распавядае Гідрэ Бартэльт, дырэктарка галерэі. — Імя «Саўчанка» заўсёды пачыналася для мяне зь вялікай літары, а з Клінавым я пазнаёмілася сёлета ўвосень. Ён распавёў мне пра свой праект «Горад Сонца», які падаўся мне вельмі цікавым. Лічу, што важна рабіць выставу ў гэты час, калі пра Беларусь так шмат кажуць і калі нямецкая прэса так чуйны адносіцца да гэтай краіны». А што да плянаў на будучыню, то спадарыня Бартэльт хацела б зладзіць у Бэрліне выставу Уладзімера Цесьлера.

## «Шанец папрацаваць»

Вальжына Морт ды Зьміцер Вішнёў трапілі ў Бэрлін на запрашэньне Бэрлінскага літаратурнага калёквіюму. Гэтая арганізацыя дае стыпэндыі літаратарам з усяго сьвету, каб яны маглі спакойна займацца творчасьцю ў нямецкай сталіцы, у віле на возеры Ванзэе, хаця б месяц не пераймаючыся жыцьцёвым клопатам. Маладыя беларусы будуць у Бэрліне да канца траўня. Але ці спрыяюць творчасьці такія «цяплічныя умовы»?

«Гэта шанец папрацаваць, — сьцьвярджае Вальжына. — Бо калі жывёш дома, то заўжды шмат праблемаў, трэба ежу гатаваць, госьці прыходзяць, «Санта-Барбара» ўвечары, яшчэ нешта... А тут такая камэрнасьць, пакой, у якім ты сядзіш і мэтанакіравана працуеш». Натхненьня гэта не пазбаўляе, наадварот: «Працуецца тут вельмі добра. Гул, гоман, мова, рух. Як казаў Вазьнясенскі — я пішу нагамі. Вось я таксама хаджу і пішу», — кажа Вальжына. Тым больш што для творчасьці ёй не патрэбная бесьперапынная зьмена абстаноўкі: «Я жахліва кансэрватыўны чалавек, я знайду якую-небудзь мясьціну і там заўсёды хаджу і нос далей ня высуну. Ну вось тут мне падабаецца, у Мітэ. Далей за бульвар Унтэр дэн Ліндэн не забіраюся».

Як рэагуюць на беларускіх літаратараў немцы? «Звычайна ёсьць два варыянты рэакцыі, — кажа Вальжына. — Вас прымаюць ці то за эстонцаў, ці то за фінаў. Тады даводзіцца распавядаць з самага пачатку. Другая рэакцыя — адразу ўзгадваюць палітычную сы-

туацыю і пачынаюць распытваць, што адбываецца ў Беларусі.

Чытаньні скончаныя, галерэя зачыненая. «Тоненькая, як твае вейкі», Вальжына пераходзіць праз скрыжаваньне каля спаруды мастацкага цэнтру «Тахэлес», бэрлінскага дому-голему, у пакоях-раскелінах якога зь цягам часу завяліся мастакі. Зьміцер пазірае на расьпісаную графіці будыніну згаладалым вокам, нібыта на даўнюю каханку пасьля доўгіх расстаньняў. У ліпені ён прыяжджае сюды, каб займацца жывапісам ды дапісваць свой раман пра «Тахэлес», які, як усё будзе файна, выйдзе налета па-беларуску і па-нямецку. Прынамсі ўжо ў гэты вечар у адной з кнайпаў на вудзільна Зьмітра патрапіць яшчэ адна перакладніца літаратуры, зачараваная фірмовай прынадай паэта-мастака — культавым каляндарыкам «Таракан — лепшы сябар чалавека». «Вось мы яшчэ адну перакладніцу адшукалі», — задаволена шэпча ён Вальжыне.

«Асяродзьдзе ў Літаратурным калёквіюме ня штучнае, — не згаджаецца Зьміцер. — Я ў Бэрліне пяты раз. Пасьля Менску гэта мой другі ўлюбёны горад. Гэта культурная сталіца Эўропы. Ён дыктуе ня моду, а стратэгію творчасьці. Чаму так? Бо тут была сьцяна, і тут склалася разам заходняе і ўсходняе мастацтва».

Сярод беларускіх творцаў Вальжына Морт, бадай, адна зь нямногіх, якая на практыцы ведае, што такое сапраўдны літаратурны агент. У Нямеччыну паэтка прыехала з ЗША, увосень зноў кіруецца за акіян — на выступы. Потым — паэтычныя фэсты ў Славеніі ды Лёндане.

Вечарэе. Вальжына спрачаецца са Зьмітром пра сыстэму, літаратуру ды Саюз пісьменьнікаў, даводзячы тое, што творцам спадзявацца трэба найперш на саміх сябе. Зьміцер, уплывовы каардынатар беларускіх праектаў выдавецтва «Логвінаў», кажа пра традыцыю СПБ і патрэбу падтрымліваць маладых літаратараў. Такія розныя ў многім, Зьміцер Вішнёў і Вальжына Морт падобныя ў адным: яны абкружаныя аўрай посьпеху, для якой нават напаўразбураная Бэрлінская сьцяна — не перашкода.

**Алесь Кудрыцкі, Бэрлін**
**Фота аўтара**

Як рэагуюць на беларускіх літаратараў немцы? Часам прымаюць ці то за эстонцаў, ці то за фінаў.



**Галерэя *Giedre Bartelt*, дзе чыталі вершы беларускія паэты, месьціцца ў бэрлінскім мастакоўскім раёне Мітэ.**

# Што цікавага ў тоўстых часопісах?

У 21-м нумары «Дзеяслова» надрукаваныя новыя апавяданьні Леаніда Дранька-Майсюка. У іх аўтар дае волю мове — і яна разьліваецца шырока, нібы Гарынь, і выносіць пісьменьніка далёка за рамкі дазволенага. Цікава назіраць, як зварот да карэннай, давыд-гарадоцкай дасавецкай мовы разьнявольвае мысьленьне, робіць яго таксама дасавецкім. Дарэчы, менавіта Л.Дранько-Майсюк стаў ляўрэатам прэміі «Дзеяслова» «Залаты апостраф» у галіне прозы за 2005 год.

У тым самым нумары — новы гістарычны раман Кастуся Тарасава «Аўдытарская праверка ў Нясьвіжы, альбо Скарб Нясьвіскага замку» з жыцьця Беларусі 250-гадовай даўніны, часоў заняпаду Рэчы Паспалітай.

Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч распачаў выдрук сваіх мэмуараў — першая частка, праўда, выглядае занадта традыцыйна, ёй бракуе нечаканасьцяў. Побач — пачатак хіба заўчасных мэмуараў Уладзімера Арлова.

У тым жа нумары — шмат вершаў Рыгора Барадуліна.

У травеньскім «ARCHE» друкуецца шэдэўр Рышарда Капусьцінскага — раман «Імпэратар» пра жыцьцё, цараваньне і скон апошняга нэгуса Этыёпіі Хайле Сэлас’е. Дарэчы, польскі пісьменьнік Капусьцінскі — адзін з намінантаў на Нобэлеўскую прэмію, наш зямляк. Ён родам зь Пінску, і ў верасьні сёлета мае адведаць сваю малую радзіму.

Пад крытычным мікраскопам «ARCHE» гэтым разам аказаўся ўганараваны прэзыдэнцкай прэміяй раман Алеся Наварыча «Літоўскі воўк».

Андрэй Хадановіч друкуе сваё эсэ, напісанае пад уражаньнем Плошчы.

А неадменна варта прачытаць у гэтым нумары эсэ «Тры дні, тры з паловай ночы і дзесяць сутак» Андрэя Баранава — найлепшае, што было напісана пра падзеі Сакавіка. Плошча, намётавае мястэчка і турма вачыма юнака, які ўсё гэта прайшоў.

**Мікола Бугай**

ФРАНЦ СІЎКО

# І наша сьвядомасьць цынічна маўчала

* * *

Колісь зь сястрою, навучаныя школаю, любілі бацьку пра перавагі савецкага ладу жыцьця даводзіць. Вось і тое, маўляў, маем, і тое, і гэта, і тэлевізар нават. «А каб не саветы, то, пэўна, нічога ня мелі б і ў лужыну замест тэлевізара ад раньня да вечара глядзеліся!» — пярэчыў-злаваўся. Не любіў слухаць, як начальству за добрае жыцьцё па тым жа тэлеку ці па радыё дзякуюць. Што б сёньня сказаў, калі толькі дзякі адны паўсюль і чуваць? Пэнсіянэры — за пэнсію дзякуюць, што ўчасна ім сплачваюць. Настаўнікі — за магчымасьць вучыць. Вяскоўка па радыё — за асартымэнт тавараў у краме. Нацыя ўдзячных.

* * *

Як дыктар ці дыктарка на нашым тэлебачаньні — абавязкова зласьлівы. Адзін словы праз зубы цэдзіць, быццам разьняць іх як сьлед рады ня дасьць — ад сьліны, другі страхавітасьцю пагляду палохае з экрану, трэці з такою фанабэрыяй вяшчае, нібы самога Бога за бараду ўхапіў. Паводле навукоўцаў, арганізм дарослага чалавека ўтрымлівае атрутных рэчываў, дастатковых дзеля зьнішчэньня адной блыхі. Гэтым перадаў, няйначай. Ды з такім каптуром, што і хірургічнае ўмяшальніцтва ўжо наўрад паможа небаракам зьлішкаў пазбыцца.

* * *

«Правільных» віцебскіх літаратараў васьмюдзесяцьцю трыма штукамі нагрудных знакаў, што мусяць інжынэраў чалавечых душаў з натоўпу выдзяляць, ашчасьлівілі. У суправаджэньні адпаведнага рахунку да аплаты казённай установе — упраўленьню культуры, — вядома. Шык! А то што гэта за творца — бяз блямбы? Дзяржава ведае, што робіць: лашчыць дык лашчыць — шырока, з размахам, з закідам на будучыню. Ну, і не без спадзеву ж на ўзаемнасьць, канечне, якая вось ужо — у выглядзе вытрыманых у духу савецкіх часоў перадвыбарных зваротаў-агітак не прымусіла сябе чакаць.

* * *

Быццам і прызнаюць чыноўнікі новае літутварэньне ды адначасна і дыстанцуюцца ад яго: каму ахвота ў бруд лезьці, пэцкацца? Ня могуць жа не разумець, што да чаго: заказчык — дзядзька вяльможна-саноўны, усенароднаабраны; выканаўца — хаўрусік выразна расейска-габрэйскі (даруйце, габрэі «нячэсныя»), на зоркі вежаў белакаменнай скіраваны; у ролі статыстаў пры ім — дзясяткаў пяць рэнэгатаў з тутэйшых ці прыбышоў і часта — самых зацятых, якіх толькі можна сабе ўявіць, ксэнафобаў. Паперадзе ўсіх — абслуга бэтэшная брахліва-ваяўнічая. Усе — пад адным дахам, у адным кагале. Яшчэ той кактэйльчык.

* * *

Не знаёмы, але, відаць, збольшага начуты пра пэрыпэтыі ў пісьменьніцкай суполцы чалавек падышоў на вуліцы:

— Устоите?

Як на такое адказаць? Даводзіць небабзнанаму ў творчых справах, што асадку з рук толькі Бог можа ў чалавека вырваць?

* * *

У Скобы датычна далейшага лёсу пісьменьніцкай суполкі: «Будзем, як першыя хрысьціяне ў катакомбах». Патаемна зьбірацца ў падземных лябірынтах, патаемна ў іншы сьвет адыходзіць? Парэшткі выпетрацца з часам з пахавальнай нішы, аскепкі духу, у цьмяных пісьмёнах увасобленага, застануцца. Ды сёе-тое з матэрыяльных сьведчаньняў кшталту канфэсійнае, творчае ці іншае якое прыналежнасьці — усё нашчадкам дзеля навукі ды задавальненьня цікаўнасьці. Вось дзе толькі пліты тае вулканічнае антыэпідэмічнае лявы расшукаць у балацінным нашым краі, каб, як у катакомбах рымскіх, ад пошасьці розных прыблуднай засьцерагацца?

* * *

Якая б ні была паганая справа, у ёй заўжды знойдзецца ахвотнік узяць на сябе ролю ка́та. Чыноўнікі — няхай, яны часта хлеб з гэтага ядуць. Іншая рэч, калі творца да ўзроўню чыноўніка апускаецца, робіцца сякераю ў руках ня лёсу нават, як той Раскольнікаў, а чыйгосьці злога змыслу. Апускаецца сьвядома, узважыўшы ўсе *pro et contra*, найгалоўныя зь якіх, адпаведна, — выгода і сумленьне — так прыхаматліва ў галаве ў бедака сплялíся, што і рады ня дасьць адрозьніць адно ад другога. І адначасна як шмат наўкола зьявіцца тых, што гатовыя будуць паставіцца да гэткае ягонае (а значыць і да ўласнае — пры нагодзе) ролі доўбні як да належнага.

* * *

Цётка была, за месца пад сонцам адмысловая змагарка. Так і гэтак спхнуць з пасады намагаліся нядобразычліўцы — каб брывом варухнула. Паклікала начальніца да сябе, прапанавала ў іншую ўстанову перайсьці. «Я б тут хацела застацца», — адказвае. «Нельга, загад атрымалі...» — «Ну, можа, як-небудзь...» — «І не прасіце, не магу, я ж вам ня папа Рымскі». Меркавала-думала цётка, як быць далей, і вырашыла сувязі сякія-такія задзейнічаць. Патэлефанавала колішняй сяброўцы, маці высокага чыноўніка, распавяла сваю крыўду. А ўранку — ад начальніцы тэлефонная вестачка: «Уладзілася вашая справа, заставайцеся». «Вось бачыце, а казалі, што вы ня папа Рымскі. Ці за ноч пасьпелі ім стаць?»

Другая, чыноўніца ад культуры абласнога маштабу, яшчэ далей пайшла: сама сябе на сталіцу папскую ці ня вызначыла. Усё вырашае, усім распараджацца мкнецца. Кніжку няўгоднага аўтара выцягне з шуфляды ды махае ёю




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

з вар'яцкім шалам пад акампанэмэнт уласнага голасу: «Гэтага апазыцыянэра — да людзей пускаць? У яго на вокладцы нават — краты замест чаго прыстойнага!» Сама ж — і зь дзясятак кніжак за жыцьцё прачытаць ці здолела, мовай нацыі тытульнай, да пэнсіі ва ўтульным кабінэце начальніцкім прасідзеўшы, так і не дала рады авалодаць. Зрэшты, якое стаўленьне ў дзяржавы да культуры, такія і козіны дочкі-козы ў ёй падпасваюцца.

* * *

Ах, цёткі!

Як здрабнела ўсё ў дзяржаве! Даўней — справа дык справа была, у кабінэце дзе-небудзь вырашалася, пры стале, пры размове паважнай. Цяпер жа, дай ты веры, — у калідоры!

Дзядзька з саноўных пра працаўладкаваньне сына распавядае: «Упрасіў начальніка прэстыжнага прадпрыемства боўдзілу майго рабочым узяць. І вось спатыкае яго па нейкім часе ў калідоры і зь лёту: зайдзіце, маўляў, пасьля зьмены, справа да вас ёсьць. Заходзіць мой, а той яму — пасаду не абы-якую. Дробязь — а прыемна!»

Назаўтра — другі пра гэткі ж цуд дабрадзейства, ня з сынам толькі — з дачкою, і зноў — з калідорам у якасьці інтэр'еру.

Здрабнела ўсё, адно ўсьцешна — карупцыі ў нас — ні-ні.

* * *

Правіна супраць душы, хай і ненаўмысная, — нясплатны доўг. Сплаціць аднойчы пажадаеш — а запозна: масты словам злым, гняўліва-неабачлівым спаленыя. Дзе спыніўся на тым злым, ад таго і пачынаць трэба адбудову, і найчасьцей яно ўжо — нерэальная рэч, бо ні часу, ні моцы на гэткія высілкі не стае. Умець учасна даравацы і дараваньня прасіць — вялікая навука. А як для занадта датклівых натураў, дык і наагул ці не найгалоўная.

* * *

Голуб наўзбоч ходніка з выдаткаў неахайнасьці месьцічаў — крошкамі-скарынкамі, што за зіму назьбіраліся, — похапліва карыстаецца. Раптам гук — такі, быццам шына ў аўто ляснула, — наваколье агаломшвае. Боўдзіла год дваццаці Божае стварэньне зь мячыкам пераблытаў, хлабыснуў нагою. Пер'е пасыпалася ў птахі з бакоў ды крылаў, але дала рады — ці не ад шоку — узьляцець на дах крамы. Ніхто не ўхваліў паскудніка, але ж і не асудзіў, «отморозком» не назваў. А то ж: у закалотах майданных з равесьнікамі не тусаваўся, у замаху на «сьвятое» ўдзелу ня браў, сярод лепшых, што ёсьць у краіны на сёньняшні дзень, заўважаны ня быў. А значыць, і небясьпекі ні для каго не ўяўляе. Апроч хіба што голуба гэтага ды бабулі з пад'езду, што за «стабільнасьць» ды «росквіт» шторазу галасуе і якую пры нагодзе, а то і без нагоды на колькі заўгодна літарын беспакарана пашле.

* * *

Больш, чым само нават пачуцьце нацыянальнае прыналежнасьці, нармальных людзей можа яднаць факт яго абразы. Той самай, што датычыць нібыта ўсіх, а ўспрымаецца, як у нас адвеку, далёка ня кожным на свой адрас. Няма адэкватнага рэагаваньня на абразу, зьнявагу — значыць, няма годнасьці. Няма годнасьці супольнай — няма на

**Працяг на старонцы 32.**

# І наша сьвядомасьць цынічна маўчала

Працяг са старонкі 31.

роду. І чым тут росквіт эканомікі ці ўзрастаньне дабрабыту памогуць?

* * *

Магільныя пліты на парыскіх кладах Пэр-Ляшэз — ня гэтак напамін пра ўнёсак нябожчыка ў духоўную скарбонку культурнае сталіцы сьвету, як пра яго прыжыцьцёвы статус. Так усюды, вядома, ды тут, пры такой агромністай колькасьці магілак знакамітасьцяў, прэтэнзіі шараговых, нічым не адметных грамадзянаў на пасьмяротную вечную памяць у народзе бадай найболей уражваюць. Шыхты магільных плітаў колісь магутных саноўных асобаў мінаеш з пачуцьцем лёгкай прыкрасьці ды спадзевам, што дзесьці неўзабаве, за зьвілінаю алеі, узьб'есься ўрэшце на вартае ўвагі. Часам так непрыкметнае, што, ня маючы пры сабе ўказальніка з разьмяшчэньнем сэктараў, і ня сьцяміш адразу: вось яно, прад вачыма, у паўкроку. Ад сузіраньня якога і шкадоба, што аддаў паўдня бадзяньню па 47-гектарных тых кладах замест таго, каб любавацца цудамі гораду, зьнікне да зьяўленьня чарговага «царскага сяла» зь велічна-прэтэнцыёзных, пустых, бы шкарлупіна ад выедзенага яйка, гмахаў-надгробкаў.

* * *

У Чапэка ў «Скандальнай афэры Ёзафа Галоўшака» ў фінале — газэтнае паведамленьне пра галоўнага пэрсанажа: «...павесіўся ўчора ва ўласным доме... голы, зь перарэзанымі венамі і напалову жыўцом спалены на вогнішчы, якое сам расклаў пад сабою, выпіўшы папярэдне атруты». Як у нашай, зазвычай да млоснасьці шэрай і тупой дзяржпрэсе, калі на тэму ўлюбёную — змаганьня з іншадумствам — акулы пяра ад афіцыёзу ўсьсядуцца, калі ня тое што ў вогнішча з атрутаю — бацькавы брудныя нагавіцы ў якасьці прынады для патэнцыйнага чытача прыдадуцца.

* * *

Манашка маладзенькая ў залі падчас выступу ў Браславе: сьветлая, як прамень, ажно іскрыцца лагодаю. Беларуска, з Гарадзеншчыны, айчыннае гадоўлі — і такіх нямала ўжо. З аднаго боку — можа, ня так і добры той зыход маладых у манаства, калі браць пад увагу сытуацыю дэмаграфічную. З другога — усьцешна: традыцыя ахвярнасьці, перарваная гадамі атэізму, узнаўляецца. Высокая ахвярнасьць, паводле сьвядомага выбару, — яе ці не найбольш нам сёньня не стае.

* * *

Маладзён скардзіцца на жыцьцё — усьмешку выклікае. Стары наракае на непамысноты — раздражняе. Ніхто ня любіць, калі пра яго ведаюць больш, чым ён сам жадае пра сябе паведаміць. І гэтаксама нікому не даспадобы, як сабою любым дарэшты дзеляцца, патаемнае агаляючы. Эксгібіцыянізм духоўны — у пэўным сэнсе замах на самасьць другога чалавека. Яго, у адрозьненьне ад фізычнага, ня проста не прымаюць — не даруюць.

* * *

Прадпрымальніца, не дурная нібыта дама, даведаўшыся, колькі газэтчыкам у дзяржаўных выданьнях плацяць, дзівіцца, чаму пры гэткіх заробках старонкі тых газэтаў «нейкія пустыя». Быццам ня ведае: адсутнасьць чагось часам ня меншы кошт мае, як і яго наяўнасьць.

* * *

Спаткаеш каторага з былых студэнтаў — і не пазнаеш: расейскамоўны чалавек, счужэлы. Згадаеш, як добра шпрэхаў(-ла) на занятках на роднай мове і падумаеш міжволі: каму яна, праца твая, патрэбная, калі нічога ад яе не застаецца? Сьпішаш на мімікрыю гэткія мэтамарфозы ды і супакоісься: не тваё, не належнае табе, як ні жадай таго, сваім ня зробіш.

* * *

Бывае, падымеш, затузаны мітусьнёй, вочы і ўбачыш: галава — на грудзях у чалавека, рукі бездапаможна ўздоўж цела апусьціліся. Сьлед бы падысьці, слова мовіць дзеля падтрымкі, а стрымлівае штосьці.

Больш году мінула, як такога сьведкам стаў. «Ат, мала што», — падумаў тады, сваім чымсьці заняты. Увечары пайшоў у капліцу, а там, як на тое, казаньне сьвятара — пра крыўду чалавеку, а значыць, і Богу празь няўвагу да людзкое патрэбы. Памаліўся за супакой для знэнджанага — усё, што мог на тую хвіліну.

Такія вось сантымэнты.

* * *

Некаторыя літаратары-мысьляры (напрыклад, француз Бэрнанос) схільныя бачыць выток ўсясьветных і лякальных крызісаў не ў сацыяльных ці палітычных варунках, а найперш у праблеме індывідуальнай сьвядомасьці. Гэта калі ня нейкая там тэорыя судзейнічае зьяўленьню чалавека адпаведнага кшталту мысьленьня, а наадварот, яна, тэорыя, абавязаная гэтаму самаму чалавеку і фактам свайго зьяўленьня, і шырокім распаўсюдам сярод масаў. А што ў нас? Ціск напярэдадні выбараў — ці не гатовыя мы былі да яго, ці не прымалі яго ўнутрана як належнае, пакідаючы на ўсякае ўсё глыбока ў душы каліва надзеі на замірэньне з уласным сумленьнем? «Я на працы, што вы хочаце?» — ці не найчасьцей гучала ў тыя дні з нашых вуснаў у адказ на справядлівыя папрокі ў канфармізьме, калі заходзіла размова пра таптаньне нашае (а разам і тых, хто побач з намі) чалавечае і грамадзянскае годнасьці. Так казаў выкладчык вучэльні і ішоў у аўдыторыю змушаць студэнтаў да датэрміновага галасаваньня, хоць гэта і не адпавядала яго ўнутранаму перакананьню і ўжо аніяк не датычыла прафэсійных абавязкаў. Так казала, панаракаўшы ў кулюарах на адсутнасьць свабоды, якую яна каторы год марна спадзяецца атрымаць ад народу на спадачку, армада газэтчыкаў зь дзяржаўных СМІ і выдавала на спажыву патэнцыйнаму выбаршчыку блёкі бравурных рэпартажаў на тэму татальнага «росквіту». Так разважала частка літаратараўрэнэгатаў, што з боязі страціць уежны кавалак перакінулася з дэмакратычнага творчага саюзу ў праўладную пісьменьніцкую суполку і тут жа выступіла са зваротам да чытача аддаць дзевятнаццатага свой голас за Лукашэнку. Ці дзіва, што ў такой атмасфэры, на тле такога згодніцтва эліты духу найкамфортней пачуваліся ў тых самых вучэбнай, чытацкай ды іншых аўдыторыях валантары ад улады? Улада цынічна прапанавала нам свае правілы гульні — мы цынічна прынялі іх да ведама, паставіўшы тым самым паміж сабою і ўладай знак роўнасьці. І нашая індывідуальная сьвядомасьць пры гэтым ня менш цынічна маўчала. Якою тэорыяй і якімі варункамі ўсё тое апраўдаем?

ПАВАЛ КАСЬЦЮКЕВІЧ

# ССК–І



Першы беларускі сьвін-скарбонка-касманаўт адпусьціў усе ступені сваёй ракеты ды ўжо трэція суткі круціцца на калязямной арбіце. «Выходзьце ў адкрыты космас!» — натужліва равуць дынамікі Цэнтру кіраваньня касьмічнымі станцыямі. Але нешта яму замінае. «Вяртайся на Зямлю — мне безь цябе кепска», — плача па той бок праваду жонка. Але гэта няпраўда. Яна кажа гэта, ды ён уяўна чуе мужчынскія галасы на заднім пляне. Сябры ўмаўляюць яго не ад'ядаць сабе сэрца і разысьціся. Баба з возу. Але нешта яму замінае.

Дзеці першага беларускага сьвіна-скарбонкі-касманаўта, худзенькія сіненькія, паляць за гаражамі плястмасу. Яны прыходзяць дадому, разгортваюць падручнікі і пачынаюць лізаць літары. Ён дасылае поштаю ўсе заробленыя баксы і ў лістах просам просіць сваіх бацькоў ня кідаць у выбарчыя скрыні ўстаўных сківіц. У яго ванным пакоі жыве кракадзіл. У яго ўсё ў парадку. Проста цудоўна. Усім прывітаньні.

Па гулкіх калідорах касьмічнае станцыі гайнямі бегаюць байструкі Белкі і Стрэлкі.

Салянка ў цюбіках даўно скісла.

Больш за ўсё на сьвеце ён бы хацеў быць першым сьвінам-скарбонкай-касманаўтам, але ж не беларускім, а ўкраінскім. Ужо другія суткі яму мроіцца гэтае ціхае блізкае шчасьце — межаваць з Малдовай, закідвацца тлустым, хоць лыжкай, чарназёмам і, прахапіўшыся пасярод ночы, зьмецідь побач з сабою на ложку, як падасца ў цемнаце на тле бялюткай начнухі, смуглую патыліцу незнаёмай жанчыны.

М-м, у выпадку гэткай украінізацыі ён бы працягваў любіць бульбу, але ўжо не калаціўся б над ёю, а так ставіўся б да яе, як ставяцца да сяброў і проста харошых людзей — з лагоднай абыякавасьцю. Гэтаксама працягваў бы любіць, як і любіў, сала, але тады, мусіць, пры дужа сонечным надвор'і фанатычна абмазваў яго крэмам супроць загару.

Лэдзі энд Джэнтэльмэн! Яго Вялікасьць Рэп:

Я размаўляў з шахцёрамі,
Я размаўляў з ліфцёрамі,
Зь ліфцёрамі ў шахтах,
З шахцёрамі ў Данецку —
Усе яны ўпэўнены, што ў нас
усё будзе зэбска.

Сасьпелі памідорчыкі,
Гангрэна–макарончыкі,
Аматара–кандуктары,
Трывушчыя кампостэры,
У чарговыя канікулы панюхай,
братка, клей.
Чыхайце мундыялямі,
Плювайце сэрыялямі,
Рабіце натуральненька,
Штампуйце сьцяг брыгаданькі,
Па ўмаўчаньні Матрыцы
залазьце ў трусы.
А я? Што я...
Што можна
Чакаць ад паліцая?
Люблю цябе, смародзіну,
Кілдык, ялдык і родзіну.
Этапы кубку сьвету я прабаўлю
ў цішыні.

Сьмешна перабіраючы ў паветры нагамі, першы беларускі сьвін-скарбонка-касманаўт залятае ў варывеньку, выграбае з нагруднай кішэні ключык і адмыкае ім тумбачку, што стаіць побач зь мініятурнай лядоўняй. З тумбачкі ён дастае мяшэчак з цукрам і папяровую пушачку з гарбатнымі пакетыкамі «Індыйская прынцэса». Вылівае кіпень з электрычнага чайніка проста ў паветра. Вада імгненна набывае форму шара і застывае на вышыні паўтара мэтра над падлогай. Чамусьці хапатліва, але беспамылкова разьвязвае па-сялянску тугі вузел на мяшэчку. Напятымі і зьведзенымі да аднаго пункту пальцамі бярэ цукар у шчопаць. Круціцца ў паветры і, выхапіўшы вольнай рукой з дасканалага шыхту гарбатны пакецік, фарбуе ім паверхню шара. Крышталёвы шар паступова ператвараецца ў паўпразрысты бурштынавы, у якім выразна адбіваецца лямпачка пажарнага выхаду. Потым паразасяроджваецца на руцэ з цукрам і нясьпешна (каб не апаліць кончыкаў пальцаў), амаль бязважка (не раўнуючы як цень птушкі, якая разам з самой птушкай вымушаная схіляцца над зернем) ён дакранаецца шчопцем да паверхні шара ў тузіне месцаў. Выкідвае скарыстаны пакецік у плястыкавую сьметніцу. Лунаючы ў позе палена з рукамі па швах, першы беларускі сьвін-скарбонка-касманаўт чакае якіх тры хвіліны і потым з прыжмурам і падсёрбам пачынае аблізваць з усіх бакоў сваю інтэрактыўную гарбату.

Звыклым курэцкім плёскачом ляпае сябе два разы па кішэні, дастае адтуль касьмічныя запалкі, зьдзіўлена круціць іх у руках, успамінае, што кінуў, апускае назад, выходзіць у перадлазьнік, адчыняе наросхрыст люк і на поўныя грудзі ўдыхае даўкі пах неабдымнага стэпу.

Даніла Жукоўскі
пра раман Алеся Наварыча «Літоўскі воўк»: гэта апокрыф зьняверанах.

# Як дарасьці нам

Праз глухія мясьціны Палесься нясьпешна праточваецца рэвалюцыйная хваля 1863 году: патаемныя перавозкі зброі, наіўна-ўзьнёслыя маладзёны, натхнёныя павевамі сталічнага студэнцкага вальнадумства, сакрэтныя паўстанцкія цыркуляры, гвалтоўныя дзеяньні супраць улады, наплыў войскаў, паразы, перасьлед... Даўно, вельмі даўно, у рамантычным XIX стагодзьдзі, нашы высакародныя і вальналюбныя продкі чарговым разам кінулі выклік прыгнятальніку. Іх не спыняла, што магутная імпэрыя набірае сілу, не бянтэжыла, што трыццаць гадоў таму спроба вызваліцца скончылася паразаю і рэпрэсіямі. Яны натхняліся ідэямі свабоды, роўнасьці, братэрства...

Ня так гэта было, дарагі чытач. А нават калі і так, ці ў гэтым клопат?

Што натхняе чалавека варушыць пісьменьніцкім пяром попел мінулых стагодзьдзяў? Мэта раманіста — заглыбіцца ў гісторыю, уваскрасіць на кніжных старонках пару паўстаньня, паказаць чытачу людзей далёкай, але важнай для нацыянальнай сьвядомасьці эпохі зь іхнімі звычаямі, клопатамі, каштоўнасьцямі, забабонамі. Але пісьменьніка хвалюе ня толькі далёкая гісторыя, але й часы нядаўнія, аўтар ня толькі імкнецца наблізіць да нас падзеі амаль стапяцідзесяцігадовай даўніны, колькі выказацца на тэмы, што не даюць спакою грамадзтву Беларусі апошнія дзесяцігодзьдзі. Выказацца ня прасталінейна-публіцыстычна, а ўзважана. Але недвухсэнсоўна.

## Спрэчка з Караткевічам

І Наварыч выказваецца. Наварыч ня толькі палемізуе з рамантычным асьвятленьнем паўстаньня, з Караткевічам і Якімовічам. Наварыч ня толькі кіруе зь нябёсаў патрыятычнай гіпэрпатэтыкі на грэшную зямлю будзённасьці, але ставіць пад сумнеў саму мэтазгоднасьць усхваленьня «інсурэкцыі». Пад ягоным скептычным агнём ня ўзьнёслясьць паўстанцкага міту, а само паўстаньне, і мо нат не асобна 1863—1864 гадоў, а Паўстаньне ўвогуле.

Выбарам месца дзеяньня ён зьвяртаецца да людзей, захопленых паўстанцкай рамантыкай: калі мы ў гэтым воўчым куце ўбачым, шаноўныя, што паўстаньне на карысьць людзям, тады ўсім сумневам будзе пакладзены канчатковы і незваротны крэс; тады і я вам паверу, і іншых — пераканаю. Мэтазгоднасьць гвалтоўнага эксцэсу супроць магутнай улады выпрабоўваецца ў самы радыкальны спосаб, але ж не без захаваньня выгляду аб’ектыўнасьці: дадатныя з усіх бакоў героі, нядурні, незлачынцы ідуць і змагаюцца. Глядзіце, думайце...

## Анты-«Рабунька»

Сёньня раманам можна назваць што заўгодна — і тэарэтычна падмацаваць выбар. На тым самым грунце кожны выбар можна аспрэчыць. Пазначэньне «Літоўскага ваўка» раманам падаецца недакладным з прычыны ці не абсалютнай статычнасьці характараў. Нават выключныя ўзрушэньні нічога не мяняюць, і на апошніх старонках мы бачым герояў практычна гэткімі самымі, што і на пачатку. Але ў гэткай непадатнасьці на зьмены хаваецца не недахоп майстэрства пісьменьніка, а пэўная мараль і ідэйная пазыцыя, што і кіруе нас да іншага жанру.

«Літоўскі воўк» выглядае на аповесьць-прыпавесьць: мо крыху старамодна, але зь іншага боку — цалкам у рэчышчы з клясыкамі апошніх дзесяцігодзьдзяў. Раман жа гэта хіба толькі таму, што спалучэньне «гістарычны раман» гучыць прывабліва. Аднак пэўная раманная манумэнтальнасьць адчуваецца ў агульным кантэксьце творчасьці пісьменьніка. Ідэалы і кампрамісы: вось вакол чаго кружляе аўтарская думка. «Літоўскі воўк» чытаецца як падсумаваньне жыццёвага досьведу, як адказ паразумнелага з гадамі аўтара «Рабунькі» на пытаньне пра тое, што для нас сапраўды важна. Забягаючы крыху наперад, сп.Наварыч пасунуўся аж так далёка, што прызнае за ідэалам першаснасьць: пакуль ня зьявіцца, не загарыцца ў душы чалавека дасканалы паводле вызначэньня вобраз — не паўстане на ягоных касьцях брыдчэйшы, але жывучы кампраміс. Але ў астатнім ягоныя прыхільнасьці цалкам на баку апошняга.

## Кітайская пагроза

Пяройдзем да дробязяў, што бянтэжаць і інтрыгуюць. У разьдзеле XVI (п.7) я «зачапіўся» за згадку пра «кітайскую пагрозу». «...Выбачайце, баюся, каб



Алесь Наварыч.

на тым жа Далёкім Усходзе так званыя нашы нашчадкі па-кітайску не загаварылі», — кажа спраўніку капітан жандараў Фогель. Хай сабе капітан рэпрэзэнтуе ў рамане асьвечаную частку імпэрскага апарату, выяўляе сябе гуманістам, інтэлектуалам і загараецца каханьнем да дзяўчыны-шляхцянкі, але ягонае мысьленьне павінна было вызначацца выключнай неартадаксальнасьцю, каб у 1864 годзе казаць гэткія рэчы. На той момант да імпэрыі яшчэ належала Аляска, Уладзівастоку ня споўнілася пяці год, а назва Далёкі Ўсход успрымалася хутчэй як калька з замежнай мовы (Far East, Extreme Orient). Кітай жа шкуматалі ўсе каляніяльныя дзяржавы, бо на той час гэта была слабая, адсталая і дрэнна кіраваная дзяржава.

Як там ні хацелася б сп.Наварычу, але ён і капітан Фогель — не адно і тое ж. Але пасыл зразумелы: стратэгічныя пытаньні выжываньня славянаў маюць прыярытэт па-над дробнымі клопатамі невялікіх народаў пра сваю незалежнасьць. Капітан Фогель мог пераймацца лёсам славянаў, але наўрад ці атаясамліваў гэткую пагрозу з кітайцамі. Клопат Наварыча ў тым, што боязі жандарскага капітана з 1863 году нам наўрад ці зразумелыя на ўзроўні падсьвядомых жахаў.

Аналіз вайны 1812 году ў разьдзеле XIV (п.2). З аднаго боку, усё нармальна: падзеі адбываліся на гэтай зямлі, Банапарт рабіў палітычныя захады, каб мабілізаваць на свой бок насельніцтва былой Рэчы Паспалітай… Стоп! А ці згадваецца ў «Літоўскім ваўку» тая Рэч Паспалітая? Але ж, аднойчы згадваецца. Гэтксама аднойчы — Вялікае Княства. Ані-

# да паўстаньня

воднага разу — Крымская вайна, на той час зусім нядаўняя, найярчэйшы прыклад таго, што Захад, «Эўропа», можа пры пэўных абставінах аб'яднацца, каб процістаяць Расеі. Вайна, якая, паводле саміх расейцаў, паспрыяла ўсьведамленьню неабходнасьці глыбокіх зьменаў ва ўнутранай палітыцы.

## Нерасхістваньне чоўна

Цяжка назваць рэканструкцыю Наварыча адэкватнай гістарычным крыніцам, хутчэй гэта рэалізацыя аўтарскай задумы коштам тэндэнцыйнай маніпуляцыі гістарычнымі фактамі. Ад валюнтарызму церпіць дакладнасьць апісаньня матываў чалавечых учынкаў (бо як жа растлумачыць гатовасьць шляхты ісьці на збройны супраціў без апоры на гістарычную памяць пра шляхецкую Рэч Паспалітую, пра залатую вольнасьць і г.д. бязь сьвежых прыкладаў, што імпэрыя ня ўсёмагутная). Але аўтар выйграў ад сваёй гістарычнай «несумленнасьці». Бо ўважлівае чытаньне пераконвае, што ўсе гэтыя «недакладнасьці» ёсьць сьвядомай ахвярай фігуры дзеля дасягненьня галоўнае мэты. Фігура важкая — твор жа нібыта гістарычны. Якая мэта апраўдвае гэткі крок?

Калі казаць пра асьвятленьне нетраў гісторыі, пра ўзнаўленьне ў сьвядомасьці чытача гістарычных падзей, настрояў людзей мінулага, іхняе псыхалёгіі, дык «Літоўскі воўк» атрымае невысокую адзнаку. Калі шукаць рэакцыю на сучаснасьць, раман выйдзе нашмат цікавейшы. Асьвятленьне гістарычных падзей выглядае цалкам падпарадкаваным расейскім гісторыяграфічным канцэпцыям, і гэта ня можа выклікаць станоўчых эмоцыяў. Але выбар на карысьць мовы каляніяльнага дыскурсу ёсьць выдатнай дэманстрацыяй грамадзянскай пазыцыі. Прыярытэты Наварыча-сучасьніка (прашу — аніякіх паралеляў!) канцэнтруюцца вакол ідэяў «нерасхістваньня чоўна», супрацоўніцтва з рэальнай сілаю, адмоўнага стаўленьня да нефармальнае палітычнае актыўнасьці і — рэзка адмоўнага стаўленьня да палітыкаў.

Пісьменьніка перапаўняюць непрыхільныя пачуцьці да дзеячаў, чыя ахвярнасьць выклікае ахвяры перш за ўсё сярод іхніх прыхільнікаў, да прапаганды, якая найбольш і найперш падманвае шараговых прапагандыстаў, да высакародных лёзунгаў, што маўчаць пра пакуты, якія выкліча іхняе ўвасабленьне. Ён не хавае горычы, што да палітыкаў-самавукаў, агітатараў-дылетантаў, ваеўнікаў, не знаёмых са зброяю, безь якіх, аднак, не бывае ніводнага рэвалюцыйнага руху. Атрымоўваецца пасьлядоўная кансэрватыцкая пазыцыя, якая ўяўным дабротам рэвалюцыйных праектаў перакана і настойліва супрацьпастаўляе спакой і стабільнасьць існага ладу: Наварыч шырока выкарыстоўвае сымболіку сямейнага жыцьця, спакой якога парушаюць што амурныя, што палітычныя фантазіі маладзёнаў.

## Вось такая філязофія

Гэткі непатрабавальны падыход да ўлады, натуральна ж, вельмі распаўсюджаны. Ён вельмі старажытны. Але ён таксама вельмі павярхоўны. Ягоныя недахопы даўно вычарпальна раскрытыкаваныя. Але старажытнасьць ці недакладнасьць ня робяць ідэалягічную канструкцыю менш прыцягальнаю для людзей пры ўладзе. Ім філязофія «Літоўскага ваўка» павінна спадабацца. І сапраўды, як мы ведаем, спадабалася.

## Добра выходзяць сцэны з выпіўкаю

У рамане сапраўды ёсьць на чым спыніцца воку. Найбольшым дасягненьнем, на мой погляд, ёсьць сцэна пачастунку «пад гарэхам» (разьдзел VIII). У беларускіх сучасных пісьменьнікаў традыцыйна добра выходзяць сцэны з выпіўкаю, але цымус тут у іншым. Сабраныя за адным шчодрым сталом субяседнікі вельмі хутка апынаюцца ў настроі братэрства і ўзаемаразуменьня. Хваля застольнага красамоўства непазьбежна ўзносіць усіх, незалежна ад пасадаў, да ўзроўню вольналюбівых сыпічаў — і ўсё сказанае з поўнай згодаю забываецца ранкам. Забываецца ўсімі, акрамя маладога хлопца, які ўпершыню ў сваім кароткім дарослым жыцьці сутыкнуўся з гэтай рытуалізаванай крывадушнасьцю.

Сцэна вартая, бы той санэт, цэлай паэмы. Не памылюся, калі скажу, што нешта такое колісь пераж ыта самім аўтарам у бурлівы перабудовачны час. Зь іншага боку, гэтая з жыцьця ўзятая сцэна выпісаная паводле старажытнага канону каляніяльных раманаў, і ейная крыштальная дасканаласьць прыхоўвае падман. Сапраўдныя людзі больш разнастайныя, а гэтак выглядалі арабы, індыйцы, эгіпцяне ў вачох супляменьнікаў Кіплінга: людзі Ўсходу ўсе аднолькава прымітыўныя, нетрывалыя ў сваіх думках, эмацыйныя. Створаныя, каб імі кіраваў нехта іншы. Гэтак наўрад ці варта ўяўляць сябе самім «тубыльцам», хіба што іх цікавіць прэмія імя Сэсыла Родса. Для тутэйшага гэта праблема не палітычных перакананьняў, а душэўнае раўнавагі: патрэбная нейкая процівага наканаванасьці каляніяльнага лёсу. У «Літоўскім ваўку» процівагі няма. Адчуваецца зададзенасьць асноўнае думкі: не дарасьлі мы да паўстаньня.

Сп. Наварыч быў бы кепскім пісьменьнікам, калі б пісаў вычарпальна-просталінейна. Ідэі выкладаюцца далікатна і ненастойліва. Толькі паўсюдная прысутнасьць іх літаральна ў кожным разьдзеле пераконвае, што пазыцыя выключна пасьлядоўная. Толькі поўная адсутнасьць хістаньняў ды ідэйных супярэчнасьцяў падказваюць, наколькі падпарадкаваны раман служэньню адной думцы.

І адно бясспрэчны талент апавядальніка дазваляе насуперак гэткай ідэйнай скіраванасьці захаваць займальнасьць аповеду, штораз прыбіваючы адчуваньне пустаты і сухасьці (а дакладней, неакрэсьленага напачатку расчараваньня, выкліканага непрыманьнем Наварычавай ідэйнай надбудовы). Раман нікуды ня кліча беларуса, больш за тое — ставіць крыж на кожным зародку спадзяваньня. Ён прапануе забыцца на велічнае мінулае (бо яго не было), ціха жыць як набяжыць (бо будучыня таксама пазбаўленая велічы) і ня марыць пра нешта большае, бо ў марах адно пустата і спакуса.

*Скарочана. Поўны варыянт артыкулу можна прачытаць у: ARCHE. 2006. №5.*




**Алесь Наварыч. Літоўскі воўк.** — Менск: Мастацкая літаратура, 2005. — (Сэрыя «Беларуская проза XXI стагодзьдзя»).

# Два пракокі ў сваёй Айчыне

Перачытваючы клясыку з **Аляксандрам Фядутам.** «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Караткевіча, «Вершалінскі рай» Карпюка.

Беларусы — этнас, які яшчэ не пасьпеў усьвядоміць сябе самастойнай і самакаштоўнай нацыяй, сваю краіну — сувэрэннай і незалежнай дзяржавай, уласны лёс — Гісторыяй. І, нарэшце, сваю літаратуру — Клясыкай.

Сьпярша, як вядома паводле перакладу Васіля Сёмухі, было Слова. І Слова было ў Бога. І Слова было Бог.

А потым Слова прызямлілася ў Гародні.

Так, прынамсі, сьцьвярджаў эвангеліст Уладзімер — адзін з двух эвангелістаў негабрэйскага паходжаньня. І нават калі нейкія недакладнасьці і ўкраліся ў ягонае Эвангельле, гэта ўжо ня мае практычна аніякай ролі. Хаця б таму, што ва ўсёй Беларусі толькі Гародня і магла б прэтэндаваць на статус уласнай Юдэі — настолькі чужародная яна, настолькі своеасаблівая, настолькі выпадае з агульнага шэрагу беларускіх гарадоў.

І калі Слова і спусьцілася ў Беларусь, то — перакананы — зь цікавасьці: што яны там, гэтыя гарадзенцы, здольныя выдумаць такога, каб яшчэ больш адрозьніцца, давесьці сваю незвычайнасьць?

І — прыдумалі.

Шкаляр стаў для іх Хрыстом. То бок — Словам.

І ў імя гэтага Слова вышэйшай — найвышэйшай, у параўнаньні са словамі іншых людзей, няхай нават валадароў, зямных і нябесных, — ісьціны гарадзенцы паднялі бунт, перабілі многіх людзей — шляхетных і простых, каталікоў і праваслаўных, бо тыя сьцьвярджалі, што Хрыстос у Гародню зусім не зьбіраўся спускацца, а проста шкаляр, каб зарабіць на хлеб, выдаваў сябе за Хрыста, а спадарожнікаў сваіх, такіх жа непатрэбных, — за апосталаў Хрыстовых.

Караткевіч верыў у тое, пра што пісаў. А напісаў ён кнігу пра тое, што народ заўсёды мае рацыю, бо адрозьніць сапраўдных прарокаў сваіх ад ілжэпрарокаў, у якія б расы тыя ні апраналіся. І Юрась Братчык у яго тым і адрозьніваецца ад кардынала Лотара і правялебнага Грыня Балвановіча, што ні расы ня носіць, ні хлусіць ня хоча. Раз ужо назваўся Хрыстом — паводзь сябе сумленна, выкупляй чужыя грахі і нават пагаджайся прыняць сьмерць — дзеля людзей. «Простых», як сказаў бы іншы клясык, «людзей».

А на гэтае ня кожны здатны. Самазванцаў на трон — хоць гаць гаці, а вось каб самазванцам — у турму ці на прэнг... Для гэтага патрэбна мужнасьць.

Прычым незвычайная.

Юрась Братчык у Караткевіча — таленавіты актор і мужны чалавек. А таму заслугоўвае шчасьця.

І ў канцы — шчасьце. Кожны атрымаў тое, чаго быў варты.

Фарысэі-сьвятары — нямірную канчыну ад рук народных мсьціўцаў.

А Юрась, які аб'явіўся гарадзенцам, — сьветлае жыцьцё і ральлю, у якую можна кідаць зерне, каб праз шмат стагодзьдзяў узышло яно ў якім-небудзь санэце ў паэта, дзяцінства якога прайшло ў Гародні.

І эвангеліст Уладзімер, сын Сямёна, які паверыў у магчымасьць такога цуду, напісаў сьветлую кнігу пра змрочныя часіны. Кнігу пра прарока, прынятага і зразуметага ў Айчыне сваёй — народам сваім.



Можа, таму, што ён да канца верыў у свой народ. Верыў у магчымасьць, што той стане відушчым.

І выйшла вялікая кніга — працяг паэмы пра Вялікага Інквізытара іншага беларуса, Фёдара Дастаеўскага (Тургенеў, памятаеце, прыгадваў: «на сцэну выйшаў сьветлавалосы гарбаваты беларусец...»). У Дастаеўскага ж таксама, калі чытач памятае, спускаецца на зямлю Хрыстос, якога ніхто не пазнае — акрамя Вялікага Інквізытара. І пазнаўшы Слова Ісьціны, ён прадае носьбіта гэтага Слова на пакуты — каб Збаўца другі раз ня выратаваўся і ня змог павесьці свой народ да Сьвятла.

Дастаеўскі ня верыў, што другое прышэсьце Хрыста прывядзе хоць да чаго вартага.

Караткевіч — верыў.

Уласна кажучы, вера ў лепшую — у славутую сьветлую будучыню — і

робіць кнігу, як сьцьвярджалі тэарэтыкі літаратуры часоў майго студэнцкага юнацтва, творам сацыялістычнага рэалізму. Тым больш, калі Хрыста ратуюць ад рук інквізытараў тыя самыя «простыя людзі».

І, перачытваючы «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», я чамусьці лаўлю сябе сёньня на думцы пра тое, што Караткевіч да канца верыў у выратаваньне свайго героя ад сьмерці. Фінал у яго атрымаўся вельмі натуральны. Быццам выратаваць новага Хрыста з рук інквізытараў — тое самае, што выйграць партыю ў шахматы ў Сьмерці, якая вязе нас у Вялікае Нідзе на Ладзьдзі Роспачы. Раз плюнуць. Згуляў — выйграў. Усіх, акрамя сябе самога, як Гервасій Выліваха. З той толькі розьніцай, што і цябе вырвуць зь яе сьмяротных абдымкаў — выратаваныя табой. Народ вырве.

Толькі вось — не выходзіць Валадарства Нябеснага на зямлі.



Караткевіч любіць народ. І гісторыя, распаведзеная ім, — сьветлая.

А ёсьць жа і іншая вэрсія амаль той самай гісторыі.

Сыходзіць зь нябёсаў да «простых людзей» новы прарок. Новы Ільля — Альяш Клімовіч. Таксама — мужыцкі прарок. І вядзе ён такіх самых мужыкоў за сабой. І абяцае ім Валадарства Нябеснае. І нават пачынае будаваць яго — проста там, дзе жыве. Непадалёк ад Гародні.

Толькі вось не выходзіць Валадарства Нябеснага на зямлі. Пэўна, таму, што кожны здольны пабудаваць толькі паводле таго ўзору, які існуе ў ягонай галаве, які ён ведае зь дзяцінства. А што ведае «просты чалавек»? Рабства. Няволю. Змрочную зайздрасьць да чужога посьпеху. Няўцямную нянавісьць да тых, хто здолеў вырвацца з багны будзённасьці і стаць «няпростым». І Альяш Клімовіч менавіта такі зямны рай і пабудаваў, з усімі комплексамі ўласнага цяжкага дзяцінства, вымесьціўшы ўсе свае няўдачы, усю сваю цяжкую долю — на іншых, такіх жа «простых», як і ён сам.

А яны яму — верылі.

Пакуль ён ня вырашыў давесьці, што можа тое, што анікому не пад сілу, апроч Бога. Ён прызначыў дату, калі наступіць Канец Сьвету. Так піша іншы беларускі эвангеліст — эвангеліст Аляксей. Аляксей, сын Нікіфара, Карпюк.

Юрась Братчык у Караткевіча таксама цуды робіць, але ўсё больш зразумелыя. То здолее тысячы галодных гарадзенцаў двума хлябамі ды пяцьцю рыбамі накарміць. То Сьляпым зрок верне. То бок, робіць усё тое, што рабілі іншыя мужыцкія цудатворцы, ад Панурга да Тыля Ўленшпігеля ўлучна. Але прызначыць дату, калі ўсе праведнікі выратуюцца, а грэшнікі загінуць — такі ж замах на Боскую прэрагатыву, як прызначэньне даты рэфэрэндуму ў 1996 годзе — мінуючы Вярхоўны Савет. Уявіць сабе гэта можна, але — не канстытуцыйна і не па-боску.

А далей Эвангельле ад Аляксея распавядае і зусім змрочную гісторыю. Калі цуд не адбываецца, людзі, якія верылі ў новага Ільлю, вырашаюць укрыжаваць яго, каб ужо зусім шальмаваць хлуса і самазванца.

Уласна, менавіта такі вырак выносіць кардынал Лотар Юрасю Братчыку і ў Караткевіча.

Братчыка, як чытач памятае, ратуюць.

І Альяша ратуюць. Але не таму, што вераць яму, што ён праведнік і здольны павесьці за сабой. А проста таму, што ўкрыжаваць жывога чалавека — яно ўжо неяк дзікавата нават для жыхароў вёскі на Гарадзеншчыне. Ну, камянямі закідаць, у пер'і выкачаць — гэта яшчэ сюды-туды. А ўкрыжаваць...

Праўда, выратаваньне аказваецца часовым. Прыходзяць немцы. Ні бальшавікоў, ні цыганоў з габрэямі ў вёсцы не аказваецца. Расстраляць няма каго. І нейкая старая зь ліку тых, што верыла Альяшу, як Хрысту, са злосьці тыцкае ў яго пальцам: вось жа, Антыхрыст ён! Расстраляйце яго!

Чаго ж ня выканаць просьбу старой фраў?

І неадбытага прарока расстралялі. Толькі цікаўныя хлапцы вераб'ямі пырснулі ў розныя бакі — падымаючы пыл.

Дзьве гісторыі пра двух прарокаў, што, як у люстэрку, процістаяць адзін аднаму, але маюць надзіва багата падабенстваў. Адзін зь якіх пры гэтым — ляўшун.

У змрочнай прыпавесьці, распаведзенай Аляксеем Карпюком у «Вершалінскім раі», знаходзім такое ўпэўненае веданьне сапраўдных народных нораваў, што здаецца, нібыта сьветлая будучыня беларусам не пагражае зусім. То бок мы яе ніколі не пабачым.

Гэта дзіўна: Карпюк жа палітычна ў гэтую самую сьветлую будучыню верыў куды больш за Караткевіча! Але ягоны талент быў такім, што адлюстроўваў рэальнае веданьне ў значна большай ступені, чым палітычныя пераканананьні.

Уласна кажучы, як вучылі мяне тэарэтыкі літаратуры ў родным унівэрсытэце, гэта і ёсьць — клясычны крытычны рэалізм.

І пры гэтым змрочны і горкі раман Карпюка палае такой шчырай ярасьцю, што чытач разумее галоўнае: ён, Карпюк, як і Караткевіч, любіць свой народ, сваіх беларусаў! Любіць да болю! Яны абодва свае кнігі пісалі для таго, каб «простым людзям» жылося лягчэй і лепш!

І абодва, як выявілася, ня ведалі галоўнага: «простыя людзі» кніг не чытаюць.

Можа быць, таму сьветлае прароцтва Караткевіча і змрочнае прароцтва Карпюка ў роўнай ступені не былі пачутыя.

Бо няма месца прарокам у сваёй Айчыне.

Нават у Гародні.

Бо «простым людзям» заўжды было лягчэй паверыць у хлусьню, чым зьмірыцца зь ісьцінай.

## ГОТГАЛЬД ЭФРАІМ ЛЕСІНГ

Pierakłaŭ Aleś Jažević.



SPAKUŚNICA ZZADU
— Hlań, siabar, hlań, chto tam hulaje?
Panienka — vočy adbiraje.
Jaki cudoŭny stylny ŭbor,
Nu a chada — dyk prosta ŭzor!
Čaruje miednym blaskam vołas,
I miłahučny, mabyć, hołas.
Figurka zhrabnaja jaje
Cnatlivaść samki vydaje.

— Chutčej, siabruk. Zirnuć ja maru,
Ci tak jana pryvabna z tvaru?
Bo kali zzadu mierkavać —
Idzie Venera tam, vidać.
Panienka kłubam paviarnuła.
Ura! Na nas jana zirnuła.
Za kim my biehli? — Za staroj
Va ŭbory panny maładoj.

KAZA I BAJAN
U daŭni čas, jak miž planet
Stvaraŭsia hety biely śviet,
Tady luby źviaryny vid
Moh pierajnačyć svoj prykid.
Ŭ lusterka hlanuła kaza —
I pakaciłasia śłaza.

Pryčyna płaču — Tvorac Boh
Śpiarša prydumaŭ koz biaz roh.
A ŭsie salidnyja źviary:
Łasi, aleni i zubry —
Rahatyja. Čamu ž jana
Biaz roh pavinna być adna?

— Pramiły Boža, pamažy,
Pastaŭ mnie rožki, jak nažy!

Kab blask majich ałmaznych roh
Ad voŭčych zubkaŭ zaściaroh.
I kab lasoŭ vaładary:
Łasi, aleni i zubry —

Ŭziali mianie, jak jość, svaju
U zhurtavanuju siamju.

Nia dumaj pra kazła darma —
Jamu nastaŭlu ja sama.

— Oj, kozačka, — skazaŭ joj Boh, —
Tabie b ja ščyra dapamoh,

Ale ŭ karobcy, dzie tvoj pryz,
Lažyć jašče adzin siurpryz!

Jaki jon, jak jaho nazvać? —
Voś heta nie mahu skazać.

Siurpryz zusim nie dla ciabie!
Artyst by ŭziaŭ jaho sabie.

(«Bajan!» — skumiekała kaza
Pra toj prydatak da pryza.)
Tut Boh padnosić karabok —
Kaza ad radaści skok-skok.

— Voś rohi! Na! — farsi, badaj!
(Siurpryz svoj, raju, nie čapaj!)

Abhortka tresnuła i — voj!
Kaza z rahataj hałavoj.

Bliskočuć rohi, jak ahni —
U ščaści pralatajuć dni.

Rahami ciešycca kaza —
Smačniejšaj stała dzieraza.

I hetak skača da niabios,
Niby joj kryły Boh prynios!

Ščaślivaja? — A choć by j tak!
Prachodziŭ čas, kaza, adnak,

Čaściej hladzieła na kustok,
Dzie byŭ schavany karabok.

Jak samaŭlubleny Narcys,
Pakoju nie davaŭ siurpryz;

Jak čaradziejny amulet,
Kazu pryciahivaŭ sakret;

Čarviak nutro baluča hryz —
Chaciełasia adkryć siurpryz!!!

Kaza hadała časta ŭ śnie —
Bajan u korabie ci nie?..

Źlacieła stužačka i — voj!
Kaza z kaźlinaj baradoj.

Była prydatkam barada! —
Kazy spradviečnaja biada.

Tuha takaja praniała,
Što radaść blizka nie była!

Pakutuje duša ad ran:
— Našto mie-mie-mnie byŭ bajan?!

DER TANZBÄR
Pierakuliŭ miadźviedź zacirku
I ŭciok da svajakoŭ u les.
Jon tančyŭ jim — sa škury lez,
Jak tančyŭ hledačam u cyrku.
I pavučaŭ: «Baćki i dzieci,
Kab vas lubili va ŭsim śviecie,
Rabiecie tak — chto nie prastak!»
— Daloŭ, — zaroŭ stary, —
Z saboj «mastactva» zabiary.
Bo pad dudu skakać na dvuch —
Adbitak rabstva, nizki duch.

BIADNIAK
— Jak dumaješ, biadniak bajicca śmierci?
— A chiba jon žyvie? Nia moža jon pamierci!

DASTAVIERNAŚĆ
Nie skažu, ci daviadziecca
Zaŭtra dzień pražyć.
Tolki ŭsio ž kali pryjdziecca
I butelka padviarniecca —
Budu zaŭtra pić!

SALAMONU
Što homo sapiens siarod tysiač dzieŭ
Pabyć ni z kim nie zachacieŭ —
Zdajecca dziŭnym mnie.
Dy dzivić bolš mianie,
Što homo sapiens siarod tysiač dzieŭ
Dastojnaje nie nahladzieŭ.

SKUPIARDZAJU
— Zajzdrošču? Ja — tabie? Ź jakoj pary?
Dy vyjhraj ty miljon, ničoha nie rabi — pamry!

KAŁYCHANKA VANDROŬNIKA
Cicha nad harami
Loh zmrok,
Pa-nad lasami
Viečarok
Nia choča bolš hulać;
Ptuški maŭčać u lesie.
Chutka užo, urešcie,
I ty budzieš spać.

MUSTER DER EHEN
Chaču apieć vam prykład redki,
Čaho ŭ žyćci, badaj, niama.
Što šlub — ciarnoŭnik, a nia kvietki,
Dałdonić kožny, a darma.

Vam treba viedać, što byvaje
Uzorny šlub biaz dram i chmar.
Jon čyścinioj svajoj siahaje
Za niebaschiły vašych mar.

Miž tym — nia prync jaje abrany,
Była j žančyna nie ź śviatych.
Ź jich kožny mieŭ svaje zahany,
Bo ŭrešcie, chto ž nia maje jich?

Naśmiešnik tut mianie padlović:
— Byli zahany? Mo j hrachi?
— Schilicie hołaŭ nic, panovie:
Jana — ślapaja. Jon — hluchi.

## Юрась Петухоў

***

Вечар. Прыпынак. Зіма.
Мы чакаем аўтобуса.
Я. Сьпеўных вершаў няма.
Ты. Чакаеш аўтобуса.

Плошча. Сталіца. Сьвятло.
Спадзяваньне на лепшае.
Ты. Пачуцьцё не прыйшло.
Мы з табою ня першыя.

## Сяргей Макарэвіч

***

Незнаёмка,
Падары мне ўсьмешку
З сваіх вуснаў
Жывых.
Усьміхніся сваімі вачыма,
Што,
Як каштоўныя камяні,
Надзяляюць мяне
Сваім зьзяньнем
Пры кожным дотыку позірку.
І толькі маўчы —
Я бяз слоў усё разумею.
Увайдзі ў мой храм
Душы
Нямой
Ды застанься там
Назаўжды.

## Зьміцер Панкавец

Спн.Н.

вокны кватэры
выходзяць на Млечны шлях
пайду прайдуся

ПАРОДЫЯ НА ХАЙКУ А.ХАДАНОВІЧА

дзячу японцам
за лепшыя знаходкі —
хайку і танкі

## Юрась Нераток

БЕЗ НАТХНЕНЬНЯ

Ты то корміш, то доіш хімэру,
Побач лярваю муза ляжыць.
Годзе тузаць алоўкам паперу:
Што тваё — ад цябе не зьбяжыць!
Скідвай німб і ня вер у харызму,
Зьлезь са сцэны, прастуй у фае!
Шмат падстаў у твайго пэсымізму,
А ці трэба падстаўкі твае?

Бо пасьля, як усе мы загінем
І згніюць у зямлі карані,
На ўспаміны нашчадкам пакінем
Не паперу — адны камяні.

## Сяржук Жыцень

VIERŠ NA PERFAKARCIE

PAD NIEPRYTOMNAJ CIAŽKAŚ CIU RAZVAHAŬ
DUMKI VYŁAZIAĆ Z HAŁAVY NA PAPIERU.
I, NIA MAJUČY ZŁYCH NAMIERAŬ,
RASPAČYNAJUĆ SVAJO PALAVAŃNIE;
ZASYNAJUČY MIŽ BAČYNAŬ KNIHAŬ,
ZACHOŬVAJUČY Ŭ SABIE VIERU
PAŹBIEHNUĆ RUK VIERŠAMIERAŬ,
ČAKAJUĆ KRASAK NA PACHAVAŃNIE.

**Фэстываль «Бітлз назаўсёды» пад Лагойскам 20 траўня.**
**Жоўтая субмарына плыла пад бел-чырвона-белым сьцягам.**




ПАВАЛ БОНДАР


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Кветкі для паэта

Успамін пра адну сустрэчу з Рыгорам Барадуліным.

Адлятае пава залатая.
— У якую ты ляціш мясьціну?
— Я лячу праз акіян вялікі...
— Жаніху ты занясеш вясьціну?
— Добра, прынясу табе пісьмо я,
Твой жаніх напіша, поўны ласкі:
«Тысяча цалункаў і вянчаньне,
Калі Бог дазволіць, пасьля Паскі».

**Рыгор Барадулін**
**(пераклад з Хаіма Бяліка)**

Ці здаралася вам прачынацца калі-небудзь з адчуваньнем, што сьвет створаны спэцыяльна для вас? Я адчула гэта адразу, як толькі з балькону данеслася вясёлае чырыканьне вераб'ёў, якіх я троху падкормліваю ўзімку і якія дзячаць вясёлай пабудкай улетку. Сёньняшні дзень удачлівы! «Я была шчасьлівай, а дзеля гэтага варта жыць», — скажу я сабе, калі гэты сьвет абваліцца, і пачну будаваць новы. Так і прамовіла гэтай раніцай, у думках правеўшы таўстую рысу пад слупком пасылак з надзей, чаканьняў і вагі сваіх пяцідзесяці гадоў. «Пяцьдзясят гадоў! — скажаце вы. — Зусім старая!» А вось і не старая! Пры чым тут гады! Адна мая знаёмая бабуля, а ёй восемдзесят пяць гадоў, прызналася мне нядаўна: «Ведаеш, я закаханая...»

Сёньня — сустрэча з паэтам і паэзіяй! У наш час такое здараецца ня часта! Я сьпяшаюся на кірмаш, каб купіць новую кофтачку да маёй ружовай спадніцышасьціклінкі. «Лэдзі павінна быць у спадніцы», — казаў адзін знаёмы амэрыканскі дзед, і я з гэтым цалкам згодна. Таму на кірмашы накіроўваюся ў рады, якія радуюць вока банцікамі, фальбонкамі, карункамі і іншымі ўпрыгажэньнямі жанчыны. Вось яна, кофтачка, створаная адмыслова для мяне. Цялеснага колеру мяккая трыкатажная тканіна, размаляваная вішнёвымі пёркамі, рукавы за локцік, прыгожай лініі выкат вакол шыі, і ўсё гэта аздоблена цудоўнымі маленькімі банцікамі з руліка і далікатнай аблямовачкай па нізе. Нават здымаць ня хочацца — так лоўка сядзіць!

Па выхадзе ледзь ўспамінаю пра кветкі — так далёка блукаюць мае думкі. Погляд натыкаецца на пышныя півоневыя букеты, што вынесьлі на продаж бабулькі з прыватнага сэктару. Выбраўшы сем самых вялікіх, пакідаю кірмаш і сьпяшаюся дадому. Час падцiскае — а 12-й ва ўнівэрсытэце сустэча з Рыгорам Барадуліным!

На трамвайным прыпынку да мяне нечакана кідаецца кабета: «Жанчынка, любая, прадайце, калі ласка, адну кветачку, а то патэлефанавалі нечакана — такое гора — пахаваньне ў нас, вось еду тэрмінова, ды купіла пяць кветак, толькі такія букеты і прадавалі, а вы ж ведаеце, колькі патрэбна...» «Аб чым гамонка! Бярыце дарма! Я сёньня згодна ашчасьлівіць цэлы сьвет, а тут такая дробязь!»

Быццам на крылах узьлятаю ў трамвай — і разумею, што я таксама засталася з той колькасьцю кветак, зь якой ходзяць хіба што да помніка, а не да жывога паэта. Простае рашэньне падараваць каму-небудзь яшчэ адну кветку ў трамваі чамусьці не прыходзіць да галавы, і я сыходжу на плошчы, да кветкавых шапікаў, дзе купляю ашаламляльна прыгожую півоню барвовага колеру — іншых не было.

Калі заходжу ў паўнюткую залю, сустрэча ўжо пачалася. Няўжо стаяць прыйдзецца? Аднак у гэты момант да мяне падскоквае сымпатычны мужчына, зь вялікай пашанай вядзе наперад і ўсаджвае на адно з крэслаў, што стаяць, бы прэзыдыюм, крыху збоку ад трыбуны. Жанчына з кветкамі не павінна стаяць у праходзе! Жанчына з кветкамі — гэта ня проста жанчына. Аднойчы на працы мне падарылі ў дзень нараджэньня прыгожы букет — вельмі прафэсійна складзены, з дадатковымі дробненькімі кветачкамі бэзавага колеру, нейкай дзіўнай мяцёлачкай, агорнуты празрыстымі цэляфанавымі карункамі! З гэты творам ікебаны ішла праз горад і адчувала сябе ня змучанай працоўным днём пажылой жанчынай, а дамай, паняй, спадарыняй... Зайшла ў краму — адразу да мяне кінулася прадавачка: калі ласка, што для вас? Увайшла ў напоўнены аўтобус — купка маладых людзей прапусьціла мяне наперад, а мужчына — дзіва дзіўнае ў нашым горадзе! — галянтна прапанаваў мне сваё месца.

Таму я з годнасьцю каралеўскім кіўком дзякую чалавеку, што падсунуў мне крэсла, і аглядваюся. Вакол мяне сядзяць мужчыны вельмі прыстойнага выгляду, аўдыторыя маладая — студэнты. Слухаю стомлены голас паэта, у якім чуваць непрыхаваны боль за нашу сумную рэчаіснасьць, і адчуваю, як сьлёзы пачынаюць казытаць вочы.

Потым з аўдыторыі пачынаюць сыпацца пытаньні, вельмі драматычныя, пра нашыя грамадзянскія праблемы. Я была б ня я, калі б таксама ня ўторкнула сваю дзюбку. «Паважаны Рыгор Іванавіч! Вы як паэт павінны быць абазнаны ў пытаньнях каханьня, таму давайце пагаворым на гэту тэму!» «Добра, — адказвае той, кінуўшы на мяне позірк, — давайце пра каханьне, я якраз і зьбіраўся аб ім паразмаўляць».

Тут размова павярнула ў другі бок, пайшлі цудоўныя пераклады з гішпанскай. Яны перасыпаліся рызыкоўнымі барадулінскімі жартачкамі, што ўгоняць у чырвань каго хоч.

Але ў гэты момант аднекуль зьяўляецца цётка прыблізна маіх гадоў, з высокім стаўбуром узьбітых, асьветленых валасоў на галаве, у ладнай турэцкай сукенцы — не інакш прадстаўніца ад гарадзкога кіраўніцтва. Букет, які яна трымае ў руках, можа, і прыгожы, але ўсё сапсавала спадніца атрутна-салатнага колеру з гафраванай паперы, у якую ён загорнуты — ні Богу сьвечка, ні чорту качарга. Стала перад паэтам і пайшла мянціць: «Дорогой Рыгор Иванович… Вы… В нашем городе… Как мы счастливы…»

«Ах ты... — думаю. — Не магла знайсьці для нашага паэта шчырага беларускага слоўца!» І імкліва да Барадуліна — кветкі ў руцэ, мая шаўковая шась-цікліначка так і ляціць за мной усьлед. Падыходжу да яго і разумею, што няма такіх слоў, якія маглі б распавесьці, што ён такое для нас. «Тысяча цалункаў...» — укладваю ў гэтыя словы ўсю сваю ўдзячнасьць і працягваю кветкі...

О, ён ня толькі жывы — ён вельмі спрытны! Жвава да мяне падбягае, цалуе, цалуе і прыгаворвае: «Вось такое каханьне, вось такое». І шчыра прызнаюся — было вельмі прыемна. Пад ухвальныя воплескі аўдыторыі я з ганарлівым відам міма гаркамаўскай прадстаўніцы — шчоўк, шчоўк абцасікамі — ведай нашых! Падыходжу да свайго месца і што я бачу? Самая прыгожая барвовая півоня валяецца наўпрост пад маім крэслам! Як можна дапусьціць, каб мой паэт застаўся з шасьцю кветкамі? Я хоп півоню ды назад. Тут заля выбухнула такім рогатам — усе ледзь з крэсел не зваліліся. Вырашылі, што мне так спадабалася — адарвацца не магу. Думайце сабе што хочаце, а мы яшчэ раз дужа салодка пацалаваліся!

Ну, вось і ўся гісторыя. А пра тое, што ён напісаў у аўтографе, не скажу. Бо гэта толькі мне. Мне адной.

**Галіна Люмарава, Віцебск**

# У нашым сьцягу ёсьць усё

**14 траўня пазначана ў календары як Дзень Дзяржаўнага Сьцяга і Герба. Аднаго разу давялося мне пабачыць, як гэты дзень адзначаўся на Цэнтральнай плошчы Менску.**

Праз плошчу вайскоўцы ў парадна форме ўрачыста пранесьлі на руках вялікае палотнішча, данесьлі яго да флагштоку і пад гукі гімну адбылося ўзьняцьцё сьцяга. Пры гэтай падзеі людзей на плошчы амаль не было, калі не лічыць 3—4 аўтобусы ПТВэшнікаў з Заводзкага раёну, якіх пільнавалі, каб тыя не разьбегліся, некалькі настаўніц. Падумалася тады, ці пабачу калі, як так урачыста й беражліва беларускія вайскоўцы пранясуць праз плошчу наш нацыянальны гістарычны сьцяг.

Цудоўна помню тыя некалькі гадоў мінулага стагодзьдзя, калі гэтыя сымбалі сапраўды ўпрыгожвалі Дом Ураду. Сьцяг горда трапятаў у паветры і ў мяне выклікаў пачуцьцё радасьці. Нават калі ў гэтым не было патрэбы, я стараўся прайсьці ці праехаць праз Плошчу Незалежнасьці, каб лішні раз пераканацца, што сьцяг на месцы, што ён лунае над горадам, што ён жыве, а разам зь ім жыве і Беларусь!

У нашым сьцягу ёсьць усё — чысьціня, пяшчота, цнатлівасьць і ў той жа час — сьмеласьць, вольнасьць, моц. Гэта сьцяг-змагар, сьцяг-пераможца. А ў высокім блакітным небе ён падобны на птушку зь белымі крыламі, на белы карабель альбо на добрую вестку, што ляціць да нас зь нябёсаў.

І вось гэтая прыгажосьць, нашая гістарычная спадчына пад забаронай ва ўласнай краіне.

Сучасны дзяржаўны чырвона-зялёны сьцяг выглядае цяжкім і груваcткім. Такое ўражаньне, што яго толькі што выцягнулі з вады. Амаль паўсюдна, дзе ён вывешаны, ён на 2—3 абароты абкручаны ветрам вакол дрэўка і галоўны элемэнт сьцяга — беларускі арнамэнт — схаваны ад вока. Я не зьбіраюся тут кпіць з гэтага сьцяга. Скажу нават сумленна, што за савецкім часам ён мне таксама здаваўся самым прыгожым з усіх сьцягоў 15-ці саюзных рэспублік. Проста я так быў выхаваны, у любові да Беларусі. Толькі зь цягам часу я зразумеў, што справа ня ў тым, прыгожы ці не прыгожы сьцяг, а ў тым, якую функцыю выконвае ён у грамадзтве і якое стаўленьне самога грамадзтва да сваіх нацыянальных сымбаляў. Дык вось, сучасны дзяржаўны сьцяг РБ, можна сказаць, бездаглядны. Прыхільнікам гістарычных сымбаляў ён не патрэбны. А тыя, хто здавалася б, павінны любіць яго, таксама не відно нешта, каб захапляліся ім ды насілі на сваіх грудзях значкі зь яго вывявай. Дарэчы, тыя значкі са сьцягам, якія прадаюцца ў крамах, няправільныя: на іх белы арнамэнт на чырвоным фоне (як на сьцягу савецкай Беларусі), у той час як на сьцягу РБ наадварот — чырвоны арнамэнт на белым фоне, то бок чырвоная вышыванка на белай кашулі. І тое, што сам сьцяг вельмі часта вывешваюць дагары нагамі, здаецца, таксама нікога асабліва не турбуе. Ну вісіць нешта, хай сабе вісіць.

Хочацца верыць, што дзень Сьцяга і Герба застанецца ў нашым календары. Толькі шанаваць мы будзем ня штучныя, а сапраўдныя гістарычныя сымбалі, і яны будуць выконваць ня толькі рэпрэзэнтатыўную і распазнавальную функцыю, але і самую галоўную сваю функцыю — аб’ядноўчую.

**Лявон Гуменьнікаў, Менск**

# Шампіньён



## ВІНЦЭСЬ МУДРОЎ

Вось жа, дзіўная рэч: усе грыбы называюцца па-свойску, а гэты, з выгляду нікчэмны, падобны да блядай паганкі, носіць гучную францускую назву champignon. За часамі касмапалітычнай маладосьці я захапляўся замежнай літаратурай, і на вочы мне часьцяком трапляла гэтае нетутэйшае слова. Вось, барон Ляфантэн, рыхтуючыся да дуэлі, есьць ад ранку шампіньёны са сьметанай ды запівае «Кліко»; а вось мастак з Лацінскага кварталу, скончыўшы пісаць чарговае ню, сядзіць на сваім гарышчы ды сёрбае нішчымную шампіньённую поліўку; тым часам нейкія студэнты спрачаюцца пра палітыку ў парыскай кавярні «Сэлэкт», перапэцкаўшы кволыя бароды шампіньённым соўсам… Тою парою шампіньёны ўяўляліся мне экзатычнымі грыбамі, што растуць дзе-небудзь у Савоі ці на схілах Правансальскіх гор. І толькі пазьней даведаўся, што гэтую экзотыку можна вырошчваць у любым цёмным і сырым сутарэньні, а каб сыпануць іх на патэльню, ня трэба і ў лес хадзіць: вунь ён, тутэйшы француз, узьняў галаву ў гарадзкім парку, прабіў збуцьвелае шыгольле мурашніка, абляпіў сухія каровіны ляпехі на ўтравелым падворку. У маіх паўночнабеларускіх, лясных шампіньёны й дагэтуль пры нагодзе прыдушваюць нагой, уважаючы за атруту. Зьведаць смакавыя якасьці шампіньёну ня змусіла нават ваенная і паваенная галадуха. Адна старая кабета, згадваючы часіны акупацыі, апавядала, што немцы перад сваім адыходам зусім ашалелі: «Набяруць у полі паганак, насмажаць ды жаруць, каб на іх халера». Насамрэч акупанты, відавочна, зьбіралі ды жэрлі шампіньёны. А дзесьці пры канцы 60-х давялося і мне, па прыкладзе нямецка-фашыстоўскіх акупантаў, зьлёгку ашалець ды набраць цэлае вядро маладых шампіньёнаў. Было гэта ў Гарадоцкім раёне, дзе я гасьцяваў у стрыечнага дзядзькі. Вёска дзядзькава ляжала ў глыбокай лагчыне і вакол, як кінуць вокам, цягнуліся спусьцістыя, парослыя рэдкім кустоўем адхоны, на якіх пасьвіліся каровы. У першы ж дзень перазнаёміўся з аднагодкамі і наступнага дня, ад самага ранку, пайшоў з двума вясковымі падшыванцамі адбываць радоўку. Бегаць за каровамі нам не давялося, бо іх пасьвіў увішны Тузік — шэры, падобны да заходнесібірскай лайкі, сабачка. Сядзелі ўтрох пад кустом, гулялі ў карты і смажылі на вогнішчы (насунуўшы іх на прутки) маленькія скрылькі сала. А яшчэ падшыванцы вучылі мяне ляскатаць пугай. Прычым ня проста ляскатаць, а падсякаць разбэрсаным канцом кусты дзядоўніку ці зьбіваць купкі грыбоў-паганак, якімі было ўсыпанае поле. У мяне гэта кепска выходзіла і толькі аднойчы, відаць, выпадкова, удалося, хай і без належнага ляску, зьбіць купку паганак. З такой нагоды я нават пайшоў паглядзець — ці ўсіх я іх сьсек, і, нахіліўшыся, убачыў, што капялюшыкі зьбітых грыбоў спадыспаду пяшчотна-ружовыя, а на зломе пасьпелі пажоўкнуць. Пра такія адметнасьці шампіньёнаў я прачытаў свойчас у «Кнізе смачнай і здаровай ежы».

— Кінь, атруцісься! Гэта ж паганкі! — разам крыкнулі вяскоўцы, калі я раструшчыў капялюшак пальцамі.

Грыб прыемна пахнуў і — пакаштаваў я яго не без насьцярогі — быў крыху салодкім на смак.

Аднагодкі глядзелі на мяне са спалохам і дакорам. Пашкадавалі, відаць, што зьвязаліся з гарадзкім… Гарадзкі ж дурны… нажарэцца паганак ды, чаго добрага, памрэ.

Мальцы мне штосьці крычалі ўсьлед, але я ня слухаў: рынуў да дзядзькавай хаты.

Неўзабаве вярнуўся зь вядром і сьцізорыкам у руках. Пакуль зьбіраў шампіньёны, аднагодкі хадзілі сьледам, голасна сьмяяліся, пыталіся, ці запрашу на памінкі, і раз-пораз гарлалі: «А чаму мухамора ня ўзяў? Вунь, пад кустом стаіць!»

Я на такія жарты не зьвяртаў увагі. Поўніў вядро, прычым браў грыбы самыя маладыя ды крамяныя, а набраўшы з каптуром, паведаміў вясковым недарэкам, што ў Парыжы, прадаўшы вядро шампіньёнаў, можна атрымаць вялікія грошы. Недарэкі сустрэлі маё паведамленьне дружным рогатам: «А каровіны ляпехі там не прадаюцца?»

Пабачыўшы вядро з «паганкамі», дзядзька замахаў рукамі.

— Куды ты?! Нясі хутчэй за хату, пакуль куры не патруціліся!

І хаця я тлумачыў, што гэта шампіньёны, якія ядуць у самых шыкоўных парыскіх рэстарацыях, дзядзька з уздыхам пахітаў галавою, пабег на загуменьне, выкапаў глыбокую яму і са словамі «Во, Віцька, набраў паганак…» высыпаў туды парыскі далікатэс.

— Мы паганак не ядзём, імі атруціцца можна. Ды і растуць яны… там, дзе каровы ходзяць, — тлумачыў дзядзька, шаруючы вядро дробным пясочкам. — Зьбіраем баравікі, махавікі, абабкі…

Увесь час, пакуль гасьцяваў на вёсцы, зь мяне пацьвельвалі, прычым і малыя, і дарослыя. «Гэта той, што паганак назьбіраў», — шапталі за сьпінай вясковыя дзеўкі і пырскалі сьмехам. Я на іх не крыўдаваў. Дзеўкі не чыталі францускіх аўтараў і ня ведалі — якія цудоўныя стравы можна згатаваць з «паганак».

Грыбная сытуацыя за трыццаць сем гадоў крута зьмянілася, і сёньня на той жа Гарадоччыне зьбіраюць ня толькі

### Шампіньёны запечаныя

**Шампіньёны (буйныя) 800 г, манная крупа (3 ст. лыжкі), булён (1/8 л), сыр. (150—200 г), цыбуліна. Зеляніна, яйка, сьмятана (200 г), гарчыца (чайная лыжка), белае віно (50 мл), соль, перац.**

Грыбы пачысьціць, ножкі грыбоў дробна пакрышыць, зеляніну і цыбулю здрабніць, крупы абсмажыць без алею, з плаўленага сыру выразаць кружкі па форме грыбных капялюшыкаў. Сыр, які застаўся, дробна пакрышыць, зьмяшаць з крупой, зелянінай, цыбуляй, сырым яйкам і ножкамі грыбоў. Пакласьці капялюшыкі на бляху, напоўніць іх начынкай, прыкрыць кружкамі сыру, зьмяшаць сьмятану з гарчыцай і віном, пасаліць, паперчыць, заліць соўсам шампіньёны, запекчы ў духоўцы (хвілін 15).

баравікі, махавікі ды абабкі, але й валуі, сьвінухі, маладыя порхаўкі і нават жоўтыя рагацікі, якія і да грыбоў не падобныя. Ды што там рагацікі… у ежу пайшлі нават марынаваныя мухаморы. А вось шампіньёны зьбіраюць адзінкі, і гэтыя грыбы па-ранейшаму без усялякай карысьці для людзтва гінуць пад абцасам літога гумовіка.

Праўда, у гарадзкіх крамах гэтыя грыбы ўжо зьявіліся. Аднак і ў расфасаваным выглядзе грыбы выклікаюць насьцярогу. Я быў сьведкам, як адна кабета зьбіралася ўзяць паўкілё далікатэсу, але яе сяброўка, схапіўшы за рукаво, прасіпела: «Што ты бярэш?! Іх жа на конскім гноі вырошчваюць». Пасьля таго кабету перасмыкнула: ёй, відавочна, падалося, што ў поліэтыленавую торбу паклалі не шампіньёнаў, а сьвежых конскіх «яблыкаў».

Зусім ня тое ў цэнтры і на захадзе Беларусі, дзе лясоў, а значыць і грыбоў, меней. Там шампіньёны бралі і елі заўжды. Там іх ніколі ня звалі паганкамі, там яны маюць і сваё імя. Прычым для кожнага з трох відаў, што сустракаюцца ў Беларусі, яно сваё. Лясныя шампіньёны (Agaricus silvaticus) называюцца благушкамі, звычайныя (Agaricus campester) — пячурыцамі, а палявыя (Agaricus arvensis) — пячаркамі, ці печаркáмі.

Крута зьмяніўся за 37 гадоў і сьветагляд аўтара. На зьмену касмапалітычнаму юнацтву прысьпела моўна-пурыстычная сталасьць, і слых цяпер лагодзіць не красамоўны «шампіньён», а празаічная «пячарка».




# Для тых, хто прачнуўся

26 (пт) траўня Галерэя Б. і часопіс «Дзеяслоў» запрашаюць у малую залю Дому літаратара (вул. Фрунзэ, 5), дзе адбудзецца прэзэнтацыя кніг паэзіі:

«Вершnick» Анатоля Івашчанкі й «Вышэй за паўночны вецер» Марыі Барадзіной. Вядучыя: Ігар Бабкоў / Валянцін Акудовіч.

Паэтычны jam-сэйшн: Андрэй Адамовіч, Віка Трэнас, Жанна Капуста, Ігар Бабкоў, Таццяна Нядбай, Уладзя Лянкевіч, Усевалад Сьцебурака, прывід Цемрыка Велета; Барыс Пятровіч, Кася Камоцкая, Уладзімер Някляеў, гурт этнічнае музыкі «ДжамБі-Бум». Пачатак а 18-й. Уваход вольны.

(Выйсьця няма.)




# Паэзія Уладзімера Арлова

**Уладзімер Арлоў. Паром праз Ля-Манш.** — Менск: Логвінаў, 2006.

ШУКАЙЦЕ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ




Дапамажы маленькаму крабу дабрацца да свайго дому–ракавінкі. Але будзь асьцярожны: калі ты выбярэш няправільны шлях, то можаш патрапіць да зубастай акулы, глыбакаводнага васьмінога, заблытацца ў водарасьцях ці апячыся шчупальцамі мэдузы!

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Шчасьлівая лічба кілера

**Шчасьлівая лічба Слэвіна** (Lucky Number Slevin).

ЗША, 2006, каляровы, 109 хв.

**Жанр:** крымінальная драма.

**Адзнака:** 7,5 (з 10).

Небараку Слэвіна прымаюць за зьніклага сябра, які вінен мафіі вялікія грошы. У якасьці аплаты пазыкаў Слэвіну прапануюць забіць сына аднаго з гангстэраў…

Крымінальная драма Пола Макгігана ўдала грае на супярэчнасьцях: кожны герой ня той, кім здаецца. Кіраўнік нэгрыцянскай мафіі (Морган Фрымэн) — ветлівы шахматыст, ягоны канкурэнт (Бэн Кінгсьлі) — гангстэр-рабін, а легкадумная суседка героя — мэдычны экспэрт і аматарка вышукаў.

У гэтай кампаніі Слэвін (Джош Хартнэт) — зусім не трагікамічны небарака, як можна было меркаваць. Недарэчнасьці завершацца жорсткай расплатай — і Брус Ўіліс аказваецца на сваім месцы.

Пол Макгіган вядомы глючным «Кіслотным домам», але ў гэтай карціне рэжысэр псыхадэлічнымі вымудрыкамі ня злоўжывае. Уся ўвага — сюжэту.

Макгігана папракалі, што ён не такі мізантроп, як Тарантына, і не такі гуманіст, як Хічкок. Але забаўляльнае кіно ён робіць супэр.

# Горад жаночага крыку

Сайлент Гіл (Silent Hill).

ЗША—Японія—Францыя, 2006, каляровы, 127 хв.

**Жанр:** фільм жахаў паводле аднайменнай кампутарнай гульні.

**Адзнака:** 6,5 (з 10).

Каб выбавіць прыёмную дачку ад кашмараў, гераіня едзе ў гарадок Сайлент Гіл. У мястэчку, якое калісьці згарэла дашчэнту, дзіця зьнікае…

Замест сьнегу ў горадзе сыплецца попел, набрыняюць крываваю цьвільлю муры, а ў сутарэньнях курчацца самапальныя монстры. З воем сырэнаў прыходзіць цемра — а разам зь ёю легіёны інсэктаў з чалавечымі тварамі і Пірамідагаловы кат зь велізарным нажом.

Для фанаў гульні — падказкі ў зяпах трупаў; для ўсіх астатніх — дэкарацыі й гукавая атмасфэра. Хаця сюжэт то кампутарна-нудны, то ліхаманкава-блытаны, каштоўнасьць фільму — у архаічных вобразах, стоеных у глыбінях калектыўнае псыхікі.

Рэжысэр Крыстаф Ганс («Брацтва ваўка») і сцэнарыст Роджэр Эйвары («Крымінальнае чтыво») радыкальна дэманізуюць жанчыну. Яны паляць, як вядзьмарку, імпэтную паліцэйскую, зьдзекуюцца зь дзяўчынкі і непрытомнеюць ад сцэнаў мацярынства.

Першапачатковы сцэнар не прадугледжваў пэрсанажаў-мужчынаў. Маці, дачка, фанатычка, старая… І хаця Сайлент Гіл — горад нячутнага жаночага крыку, ягоныя страхі — мужчынскія.

У горадзе бог — жанчыны.

І гэтыя жанчыны — дэманы.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**MASTER RECORDS**

Маўчы, як пшаніцу прадаўшы.

Камэдыя, Вялікая Брытанія, 2005, рэж. **Наял Джонсан.**

У ролях: **Роўэн Эткінсан, Мэгі Сьміт, Пэтрык Суэйзі, Крысьцін Скот Томас.**

У парафіяльнага сьвятара сьвет сямейных праблемаў. Сытуацыя зьмяняецца, калі ў доме зьяўляецца новая таямнічая служка…

**Менск, Кісялёва 12, т.: 643-21-08**

## НАШЫ ШАШКІ

# Парады майстра Грушэўскага

Шашачнаму аддзелу ў «НН» — менш за год. Заўвагі прымаем з удзячнасьцю, бо не закасьцянелі. Менскі майстар Мікалай Грушэўскі нагадаў, што яго даўняга сябра Гантварга, экс-чэмпіёна сьвету па стаклеткавых шашках, завуць Анатоль, а ніяк не Аркадзь. Просім дараваць хібу, дапушчаную ў №17.

Цешымся тым, што сп.Грушэўскі станоўча ацаніў зьмест нашаніўскіх матэрыялаў, прысьвечаных «праставатай» гульні. «Рубрыка «Нашы шашкі» вядзецца на добрым узроўні», — напісаў шматвопытны майстар у «Народнай волі». Дзякуй яму за маральную падтрымку, выказаную і ў газэце «Спорт-Курьер».

Паводле мэтра, замест «рускіх шашак» лепш ужываць выраз «шашкі-64» — «якія там яны расейскія». Пытаньне спрэчнае: на 64-клеткавай дошцы магчыма гуляць у шашкі і па ангельскіх правілах (простыя ня б'юць назад; дамка рушыць толькі на адно поле). Назоў «рускія шашкі» замацаваўся і ня сьведчыць пра манаполію Расеі на «малую дошку». Ці ж выдадзеная Скарынам «Біблія руская» зрабіла яго маскавітам або піцерцам?

Парады былога сьледчага капыльскай пракуратуры — друкаваць больш вучэбных пазыцый, абвясьціць конкурс рашэньняў. Па праўдзе, мяркуем, бальшыні чытачоў газэты пасьля вясны-2006 не да конкурсаў. Аднак — што скажа грамадзкасьць? Якой быць рубрыцы «Нашы шашкі»? Вашых думак чакаюць па адрасе nn@pro-media.by.



**Х.Янсан — А.Гантварг. Ход чорных.**

**Адказ:** 1…28-32! 2. 37:28 26:37 3. 42:31 22:42 4. 31:13 8:19 5. 48:37 20-25 6. 24:13 25:43 і беларускі гросмайстар перамог галяндзкага.



27 (сб) траўня
19.00

# Neuro Dubel

**сольны канцэрт гурту Neuro Dubel**

**Палац мастацтваў (вул. Казлова, 3)**

**Даведкі па т.: 671-58-65**

## ІМПРЭЗЫ

**Беларускія прасторы**

У мастацкай галерэі «Унівэрсытэт культуры» да 26 чэрвеня працуе выстава «Беларускія прасторы», прысьвечаная 50-годзьдзю мастака Уладзімера Масьленікава. Сорак жывапісных палотнаў увайшло ў экспазыцыю, і большасьць зь іх — краявіды роднай Беларусі.

## КАНЦЭРТЫ

**HARDCOREманія: чаду!**

**26** (пт), 18.00 у «Рэактары» — «HARDCOREманія: чаду!» з удзелам гуртоў «Куклы», «З.Ь.М.Я.Я.», «Сок», «Рыкашэт», «Унутраны сэнс» і іншых. Квіткі: 9000 (танцпляц), 12 000 (столік+кампакт-дыск у падарунак). Продаж квіткоў — пераход Я.Коласа і перад пачаткам канцэрту. Даведкі па т.: 649-08-88, 766-24-25.

## КЛЮБЫ

**30** (аўт), 20.00 — «Крамбамбуля».
**31** (ср), 20.00 — вечар джазавай музыкі.
**1** (чц), 20.00 — Гербэрт Маралес з праграмай «Песьні пад гітару».
**http://graffiti.avilink.net/afisha.html**

## ТЭАТРЫ

**опэра**

*на сцэне Цэнтральнага дому афіцэраў*
**2** (пт) — «Трубадур».
*на сцэне Белдзяржфілярмоніі*
**5** (пн) — «Музычны парад».

**Купалаўскі тэатар**

**26** (пт) — «Парфён і Аляксандра».
**27** (сб) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**28** (ндз) — «Паўлінка».
**29** (пн) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**31** (ср) — «Сымон-музыка».
**1** (чц), **2** (пт) — «Вечар».
**3** (сб) — «Сымон-музыка».
**4** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
*Малая сцэна*
**26** (пт) — «Саламея».
**4** (ндз) — «Адчыніце кантралёру!».

**тэатар беларускай драматургіі**

**1** (чц) — «Шлях у Царград».

**тэатар юнага гледача**

**1** (чц) — «Неверагодныя прыгоды Мішуткі і ягоных сяброў у краіне казак».
**2** (пт) — «Сястра мая Русалачка».

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ 27–28 ТРАЎНЯ

### Субота, 27 траўня

**АНТ, 14.15**

«Іван Васілевіч мяняе прафэсію».

Расея (СССР), 1973, рэж. Леанід Гайдай.

Эксцэнтрычная камэдыя паводле п'есы Міхаіла Булгакава «Іван Васілевіч». Шэдэўр Леаніда Гайдая. Цытаты й песьні зь фільму сталіся гітамі.

**НТВ, 21.40**

«Сьціральнік».

ЗША, 1996, рэж. Чарлз Расэл.

Баявік.

Шварцэнэгер на сваім месцы. Усё выбухае, страляе і б'ецца. Намінацыя на «Оскар» за мантаж гукавых эфэктаў.

**АНТ, 23.55**

«Уся прэзыдэнцкая хеўра».

ЗША, 1976, рэж. Элан Дж.Пакула.

Дэтэктыўная драма.

Два журналісты расьследуюць перадвыбарчыя махінацыі, што прыводзіць да падзеньня рэйтынгаў прэзыдэнта Ніксана.

Зьнятая паводле «Ўотэргейцкага» скандалу, карціна ўдала стылізаваная пад дакумэнтальнае кіно. Ролі выконваюць зоркі Дастын Хофман і Робэрт Рэдфард.

### Нядзеля, 28 траўня

**«Лад», 17.45**

«Італьянская для пачаткоўцаў».

Данія—Швэцыя, 2000, рэж. Лонэ Шэрфіг.

Мэлядрама, камэдыя.

У маленькім дацкім гарадку самотныя людзі аб'ядноўваюцца, каб вывучаць італьянскую мову. І не бяда, што ў іх нават няма выкладчыка…

Няма штучнага асьвятленьня, дадатковых гукавых выкрунтасаў, а камэра быццам «дэсантаваная» ў жыцьцё. Але гэта сама гуманны фільм «Догмы» — і да таго ж пастаўлены жанчынаю.

**СТВ, 20.25**

«Вакол сьвету за 80 дзён».

ЗША—Вялікабрытанія—Нямеччына, 2004, рэж. Фрэнк Карачы.

Прыгоды паводле аднайменнага раману Жуля Вэрна.

Лёнданскі вынаходнік віктарыянскай эпохі Філеас Фог абвясьціў, што аб'едзе сьвет за 80 дзён. Ён ня ведаў, што ў XX стагодзьдзі прадусэры дададуць яму ў кампанію Джэкі Чана…

**БТ, 21.05**

«Заплаці іншаму».

ЗША, 2000, рэж. Мімі Лэдэр.

Мэлядрама.

Настаўнік дае вучням заданьне зьмяніць сьвет. За дабро, якое зрабілі табе, трэба аддзячыць тром іншым людзям…

Ролі выконваюць: Кевін Спэйсі, Хэлен Хант.

**Андрэй Расінскі**

**...Расея ў падзяку за прыватызацыю «Белтрансгазу» дапусьціла Беларусь да эксплюатацыі сваіх газавых рэзэрваў.**




– Однако, ня думаў што па-беларуску «прэмія» — значыць газэта.

**...улады хацелі неяк згладзіць паразу Смолавай на Эўрабачаньні, дзе горш за яе выступіў толькі прадстаўнік Андоры.**




**...рэалізавалася мара Лукашэнкі аб моцным сяброўстве Беларусі і Кітаю.**



— «Зубр» цяпер пішацца так. Запомніў?

# лІтаратурНы сшытак «НН»

*травень 2006*


«Націск на зычныя». Вальжына Морт і Зьміцер Вішнёў пішуць і чытаюць вершы ў Бэрліне ... 28
Франц Сіўко. «І наша сьвядомасьць цынічна маўчала». З новых запісаў ... 30
«ССК-1». Апавяданьне Паула Касьцюкевіча пра першага беларускага сьвін-скарбонку-касманаўта ... 33
«Апокрыф зьняверанных». Даніла Жукоўскі — пра раман Алеся Наварыча «Літоўскі воўк» ... 34
Караткевіч і Карпюк. Два прарокі ў сваёй Айчыне ... 36
Вершы Готгальда Эфраіма Лесінга па-беларуску ... 38
«Кветкі для паэта». Успамін пра адну сустрэчу з Рыгорам Барадуліным ... 40
Вінцэсь Мудроў. Шампіньён ... 42


**Спадар Хадановіч!** А дзяўчынку заныкалі? **Ліцэісты вельмі турбуюцца,** як жа Вы яе назвалі...

**Запрашаем у падарожжа**

28 траўня (нядзеля): Замосьце — Слуцак —Чыжэвічы — Гразавок — Грозаў — Цімкавічы — Бабоўня — Наднёман.
4 чэрвеня: Вільня — Трокі — Меднікі.
11 чэрвеня: Ружаны — Косава — Пружаны — Лыскава — Шарашова — Лінова — Бяроза.

**292-54-58, 622-57-20, 509-12-16 (Зьміцер)**

**Сям'я Савіцкіх—Раковічаў** дзякуе ўсім за падтрымку і дапамогу. Сябры сапраўды пазнаюцца ў няшчасьці, але хай гэтае няшчасьце мінае Вас, а сябры застаюцца.

## ЖАРТ

Тэлефаваньне на прамую лінію зь міністрам аховы здароўя.

— Скажыце, спадар міністар, а дразды хварэюць на птушыны грып?

— Не. Бо птушак, якія зьяўляюцца над Драздамі, разганяюць спэцыяльнымі верталётамі.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Вільня.** 30 апрэля, у суботу, у залі жал.-дар. кружка была тутака беларуская вечарынка. Ставілі на сцэне дзьве п'есы: «У зімовы вечар» — сцэна зь сялянскага жыцьця Э.Ажэшка і «Сватаньне» — жарцік А.Чэхава, і відаць было, што тэатар на гэтакіх вечарынках пачынае займаць першае месца, бо хор пяяў усяго толькі тры песьні, а п.п. А.Б. і С.Копаць гаварылі беларускія вершы ў часе перарываў ігры на сцэне, дык, хаця ўсё ў іх выйшла добра, але ня ўся публіка чула іх.

**Г.Дзісна. Віленск. губ.** За Дзісной у нас з давён-даўна была старэнькая драўляная царква, будаваная ў пекным беларускім стылю, і заўсёды вока міла спачывала на ей, бо стаяла на высокім, відочным мейсцы. Летась гэту царкву збурылі. І будуюць новую мураваную, але ўжо не ў тутэйшым стылю; а шкада, бо будзе яна выглядаць тут чужаніцай, занесенай з Суздалю ці Масквы.

**Задзісенкавіч**
**«НН». 1911. №18—19**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ВІТАНЬНІ

**Жадаю майму каханаму** Кастусю Жукоўскаму сьветлага сонейка над галавою, чыстага неба, урадлівай зямлі. Каб падтрымлівалі яго карані нашай зямлі. Мы з дачушкай Алесяй жадаем яму здароўя, як у волатаў, якія жылі калісь на нашай магутнай зямлі. Каб жыў доўга і шчасьліва. Мы цябе кахаем, наш любы тата.

### КАЦЯНЯТЫ

**Аддам** пяшчотных і выхаваных беларускамоўных кацянят у добрыя беларускія рукі. Т.: 634-09-00. Данута

### КНІГІ

Грэка-каталіцкая парафія прапануе вашай увазе кампакт-дыск «Фотаэнцыкляпэдыя «Нашы касьцёлы» — вынік працы 76 фотамастакоў. Зьвяртацца ў Чырвоны касьцёл чы на сайт www.hramy.com.

**Беларускія кніжкі** для дзяцей (казкі, вершы, аповесьць) мінулых гадоў выданьня — танна. Т.: 112-06-38 (Менск). Натальля

**Распаўсюд. Абмен.** Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. E-mail: alesknigi@mail.ru; 220030 Менск, а/с 195

### ПРАДАМ

Прадаюцца шчанюкі Басэт-Хаўнд з пашпартамі па $ 300. Засталося толькі два. Сьпяшайцеся. GSM 6-814-824

**Прадам камплект** натаўскай формы. Ёсьць розныя памеры. Летні варыянт. Т.: 152-49-68



**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2721. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 25.05.2006.
Замова № 2817.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а